МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Белорусский национальный
технический университет

Кафедра «История, мировая и отечественная культура»

# СБОРНИК НАУЧНЫХ ТРУДОВ СОТРУДНИКОВ КАФЕДРЫ «ИСТОРИЯ, МИРОВАЯ И ОТЕЧЕСТВЕННАЯ КУЛЬТУРА» БНТУ

Минск
БНТУ
2018

МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
Белорусский национальный технический университет

Кафедра «История, мировая и отечественная культура»

# СБОРНИК НАУЧНЫХ ТРУДОВ СОТРУДНИКОВ КАФЕДРЫ «ИСТОРИЯ, МИРОВАЯ И ОТЕЧЕСТВЕННАЯ КУЛЬТУРА» БНТУ

*Под редакцией В. А. Божанова, С. В. Боголейша*

Минск
БНТУ
2018

УДК 378.62 (476) (091) (082)
ББК 63.3 (46 Бел) я43
С23

Редакционная коллегия:
доктор исторических наук, профессор, заведующий кафедрой «История, мировая и отечественная культура» *В. А. Божанов*;
кандидат исторических наук, доцент кафедры «История, мировая и отечественная культура» *С. В. Боголейша*

Рецензент
кандидат исторических наук, доцент кафедры «Политология, социология и социальное управление» *А. Н. Кукса*

В сборнике рассматриваются проблемы истории Беларуси, мировой и отечественной культуры и Великой Отечественной войны в различных их аспектах и масштабах.

Адресуется научным работникам, преподавателям, студентам, а также тем, кто интересуется указанными сферами знаний.

**ISBN 978-985-583-200-4**

© Белорусский национальный технический университет, 2018

# ЦЭНЗУРА ЯК СРОДАК АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ПАЛІТЫКІ САМАДЗЯРЖАЎЯ

Багдановіч А.І,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Цэнзура ў Расійскай імперыі з’яўлялася важным рычагом правядзення палітыкі самадзяржаўя ў галіне ідэалогіі не толькі на тэрыторыі сучаснай Беларусі, але і ў межах ўсёй краіны. У дадзеным артыкуле мы паставілі мэту прасачаць асноўныя этапы развіцця цэнзуры у Расійскай імперыі і паказаць, што яна, сапраўды, з’яўляляся адным з найважнейшых сродкаў ажыццяўлення ідэалагічнай палітыкі самадзяржаўя.

У гістарыяграфіі праблема цэнзуры ў Расіі XVIII–пачатку XX стст. важна спаслацца на даследаванні А.В. Мезьера [10], А.М. Скабічэўскага [17], К. К. Арсеньева [1], А. Катовіча [8], М.К. Лемке [9], Н.А. Энгельгардта [24] і інш. Шмат увагі гэтай праблеме ўдзялялі шматлікія гістарычныя часопісы таго часу “Рускі архіў” [15] і “Руская даўніна” [16]. Цікавыя звесткі ўтрымліваюць матэрыялы і ўспаміны пра цэнзуру саміх цэнзараў П.А. Валуева [4], А.В. Нікіценкі [11], Е.М. Феакцістава [20] і інш. У савецкі час з’явіліся працы па гісторыі цэнзуры Расійскай імперыі Б.П. Балуева [2], П.А. Зайончкоўскага [7], В.Г. Чарнухі [23]. У постсавецкі перыяд дзейнасць царскай цэнзуры даследавалася А.А. Загонавым [6], П.С. Рейфманам [14], А.В. Блюмам [3], Г.В. Жырковым [5]. Да гэтай праблемы звярталіся і замежныя даследчыкі: найбольш пленна ў гэтым напрамку працавала М. Тэкс Чолдзін [18]

Да 1917 г. ў расійскай цэнзуры склаліся пэўныя традыцыі, былі выпрацаваны разныя яе віды і формы, накіраваныя на ахову асноў дзяржавы і яе інстытутаў, абмежаванне свабоды слова і доступу да featуразнага роду інфармацыі, пераслед іншадумства і г.д. Узнікненне і станаўленне гэтых традыцый прыпадае на праўлення Кацярыны II. Менавіта ў гэты час з’явілася прафесія цэнзара. Цэнзура існавала і да Кацярыны II, але абавязкі па яе ажыццяўленні неслі розныя дзяржаўныя органы [14, с. 25].

Важным наватарствам імператрыцы, стала спроба выдаваць друкаваны орган, які б фаміраваў і накіроўваў грамадскую думку ў патрэбным напрамку. Такім выданнем стаў часопіс «Всякая всячина», які павінен быў фарміраваць станоўчую ацэнку дзейнасці

ўрадавых органаў і не акцэнтаваць ўвагу чытачоў на наяўных праблемах [5, с. 22]. Занепакоеная Французскай рэвалюцыяй і асцерагаючыся яе згубнага ўплыву на імперыю, Кацярына II прыняла рашэнне аб стварэнні інстытута цэнзуры і, адпаведна, увядзення прафесіі цэнзара. Указ быў падпісаны 16 верасня 1796 г. [5, с. 29]. Ен фактычна забараняў друкаваць любыя матэрыялы без папярэдняга адабрэння і дазволу духоўных і свецкіх цэнзараў [21].

Указ імператрыцы меў разбуральныя наступствы для сталічнага друку – былі зачынены многія найбуйнейшыя друкарні Масквы і Пецярбурга, акрамя таго, да канца першага дзесяцігоддзя XIX ст. выдавецкая дзейнасць у правінцыях практычна спынілася [21].

Палітыку Кацярыны II у адносінах да друку працягваў Павел I. Ён удзяляў цэнзуры асаблівую ўвагу – за 4 гады было выдадзена 15 указаў, якія датычыліся цэнзуры. Вось адзін з іх: 11 лютага 1798 г. быў выдадзены імянны ўказ Сенату аб стварэнні цэнзуры пры Радзівілаўскай мытні для Валынскай, Падольскай і Менскай губерняў. Крыху пазней Павел I прыняў рашэнне, каб наогул усе кнігі, дата выдання якіх прыпадае на час Французскай рэспублікі, адразу забараняліся да ўвозу ў Расійскую імперыю.

22 чэрвеня 1799 г. "для прадухілення ўвозу недазволеных кніг" быў заснаваны цэнзурны камітэт у Вільні. Ён складаўся з доктара багаслоўя Аўгусціна Тамашэвіча, адстаўнога палкоўніка Карла Герсдорфа, навукоўца Іосіфа Косаноўскага і Карла Ціля, які разглядаў габрэйскія кнігі. Такім чынам, у камітэце сумяшчаліся царкоўная, свецкая і навуковая цэнзуры. Разам з тым, адразу вызначылася адна з асаблівасцяў Віленскага камітэта – спецыялізацыя па габрэйскай літаратуры. У сферу дзеяння гэтага камітэта ўваходзілі і беларускія губерні [6, с. 31]. У 1800 г. выдаецца распараджэнне пра забарону бесцэнзурнага ўвозу на тэрыторыю імперыі любых кніг, у тым ліку і па музыцы. Тым самым усе папярэднія распараджэнні станавіліся безсэнсоўнымі. Гэты ўказ быў выкліканы тым, што ў Расію, нягледзячы на ўсе строгія забароны, працягвалі паступаць замежныя кнігі, абыходзячы цэнзурныя перашкоды [6, с. 31].

Пасля ўступлення на прэстол Аляксандра I пачаліся карэнныя змены ва ўнутранай і знешняй палітыцы. Адным з першых яго указаў было распараджэнне пра "распечатанне вольных друкарань" і пра адмену забароны на ўвоз замежных кніг. Гэта істотна палегчыла,

ў параўнанні з папярэднім перыядам, становішча друку, у тым ліку і ў Беларусі. Аднак, ужо 14 чэрвеня 1801 г. выйшаў указ, у якім прадпісвалася, каб гаспадары ўсіх друкарань, як казённых, так і прыватных, "ніякіх кніг, якія падлягаюць разгляду цэнзур, без ухвалы адной з іх не друкавалі, пад пагрозай строгага па законах спагнання" [6, с. 32].

У эпоху Аляксандра I ў Беларусі развіцце цэнзуры ў многім звязана з заснаваннем Віленскага універсітэта. У акце аб яго заснаванні ад 4 (16) красавіка 1803 г. адзначалася, што навуковая ўстанова павінна мець цэнзуру для разгляду навуковых прац, што будуць друкавацца ва ўніверсітэцкай друкарні, а таксама для публікацый, што будуць дасылацца з-за мяжы і кніг прынятых да друку ва ўсіх друкарнях Віленскай вучэбнай акругі. Гэта палажэнне знайшло затым адлюстраванне ў Статуце Віленскага ўніверсітэта, як і ў статутах іншых універсітэтаў імперыі. Такім чынам, агульная (свецкая) цэнзура была засяроджана ў ведамстве народнай асветы. Гэта становішча захоўвалася да 1863 г. калі цэнзура была перададзена ў Міністэрства унутраных спраў. Беларускія выданні больш за 60 гадоў праходзілі цэнзуру ва ўніверсітэцкіх цэнтрах Вільні і Санкт-Пецярбурга.

9 ліпеня 1804 г. Аляксандр I зацвердзіў першы цэнзурны статут Расійскай імперыі, які канчаткова абвясціў і аформіў цэнзуру ў якасці дзяржаўнага органа кантролю над друкам. Самым ліберальным у гэтым статуце быў § 21 які абвяшчаў, што цэнзура пры забароне кніг кіруецца "разважлівым паслабленнем", а ў выпадку калі якая-небудзь частка тэксту мае дваякі сэнс, то лепш "тлумачыць гэта спрыяльным для аўтара чынам". Гэта давала аўтарам магчымасць выказваць свае думкі, нават, калі яны не супадалі з афіцыйным пунктам гледжання. Акрамя таго § 22 абвяшчаў, што дапускаецца і нават вітаецца "сціплае і разважлівае даследаванне ўсякай ісціны". Гэтыя два параграфа былі прычынай таго захаплення, з якім першы цэнзурны статут быў прыняты некаторымі сучаснікамі. Многія нават гаварылі пра існаванне свабоды друку ў першыя гады кіравання Аляксандра I. Тым не менш палітычныя падзеі, адносіны Расіі з іншымі дзяржавамі, канстытуцыйнае ўладкаванне і, вядома, прыгоннае права складалі кола тэм, якія забаранялася асвятляць, абмяркоўваць і аналізаваць. Але адразу пасля прыняцця цэнзурнага статуту 1804 г. назіралася

ажыўленне выдавецкай дзейнасці, у т.л і на тэрыторыі Беларусі. Аднаўляюць сваю дзейнасць друкарні ў Вільні і Гародні, якія былі ўладкованыя яшчэ пры польскіх каралях, актыўна працуюць каталіцкія друкарні. Але ў хуткім часе ліберальны дух статуту 1804 г. быў зведзены амаль што на нуль, дзякуючы новым удакладняючым прадпісанням, цыркулярам і распараджэнням урада [6; с. 39].

Пачатак праўлення Мікалая I азнаменаваўся ўзмацненнем цэнзурнага ціску. У 1826 г. пасаду Галоўнага цэнзара цэнзурнага камітэта заняў А.І. Красоўскі, які адрозніваўся рэдкай некампетэнтнасцю ў спалучэнні са службовым ірвеннем. Шматгадовае знаходжанне каля ўлады А.І. Красоўскага прывяло да велізарных завалаў у працы цэнзараў, якія не маглі расчысціць нават і пасля смерці гэтага іх кіраўніка ў 1857 г. Аляксандр Іванавіч за гады службы літаральна стаў фальклорным героем – «увасабленнем цэнзурнага ідыятызму» [5, с. 80]. Тым не менш граф С.С. Увараў, які займаў пасаду Прэзідэнта Акадэміі навук, казаў пра яго наступнае: «Красоўскі ў мяне, як ланцужны сабака, за якім я сплю спакойна» [5, с. 81].

У пачатку 1830-х гадоў граф Увараў заступіў на пасаду Міністра народнай асветы. З яго падачы асноўнымі напрамкамі цэнзурнай палітыкі сталі журналістыка і перыядычны друк, аднак і пра раманістыку граф не забываў. Пад пільнай увагай цэнзараў зноў апынулася французская літаратура, надзвычай папулярная сярод расійскай інтэлігенцыі. Пры яго актыўным удзеле быў забаронены шэраг вядучых часопісаў тых гадоў, у тым ліку “Маскоўскі тэлеграф” і “Тэлескоп” [5, с. 73]. Новы цэнзурны статут, прыняты у 1826 г., увайшоў ў гісторыю пад трапнай назвай “чыгунны статут”. Кіруючыся яго патрабаваннямі нават “Ойча наш”, па словах С.М. Глінкі, можна было вытлумачыць якабінскім прыслоўем. Аднак цэнзурны статут 1826 г., які выклікаў ўсеагульную незадаволенасць, праіснаваў усяго 2 гады. 22 красавіка 1928 г. Мікалай I зацвердзіў новы цэнзурны статут, меншы па колькасці параграфаў (158, замест 230 у папярэднім) і значна “мякчэйшы”, чым папярэдні [6, с. 46].

Рэвалюцыя на Захадзе і асабліва паўстанне 1830 – 1831 гг. аказалі моцны ўплыў на цэнзурную палітыку, сканцантравауўшую ўсе сілы і сродкі на “супакаенні мяцежнага духу” Польшчы і беларускіх губерняў, каб цэнзурнымі мерамі спыніць распаўсюджанне

антыўрадавых ідэй. Гэта, ў першую чаргу, датычылася Беларусі, якая ў поўнай меры адчула пераход у цэнзурнай палітыцы “ад спроб згладжвання палітычных супярэчнасцяў, якія ўзніклі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, да адкрытых дзеянняў і мер, накіраваных да паслаблення польскага ўплыву”. Па патрабаванні III аддзялення, цэнзарам неаднаразова нагадвалася аб абавязку даводзіць да ведама “вышэйшага начальства”, калі на цэнзураванне будзе прадстаўлена сачыненне “парушальніка абавязку вернападданага”. Асобая ўвага цэнзуры ў гэты час, была звернута на перыядычны друк, бо прэса аператыўна перадавала разнастайную інфармацыю і распаўсюджвалася сярод шырокага кола асоб. Так, двойчы ў 1831 г. і тройчы ў наступныя гады цэнзуры прадпісвалася разглядаць перыёдыку з асаблівай увагай, выконваючы “крайнюю абачлівасць” пры строгай адказнасці цэнзара і рэдактара “за ўсякі дрэнны кірунак артыкулаў” [6; с. 50].

У 1836 г. паследавала вядомая забарона часопіса “Тэлескоп” Н.І. Надзеждзіна за публікацыю “філасафічнага ліста” П.Я. Чаадаева, пры гэтым урад у навучанне іншым выдаўцам жорстка пакараў вінаватых: рэдактар часопіса Н.І. Надеждзін быў высланы ва Усць-Усольск пад нагляд паліцыі, цэнзар А.В. Болдыраў адхілены ад службы, а аўтар нашумеўшага ліста абвешчаны вар’ятам [6; с. 51]. Галоўнае кіраванне цэнзуры нават палічыла патрэбным сваімі прадпісаннямі патрабаваць “прыняць да ведама” ў тым ліку і цэнзарам у Вільні і выдаўцам у беларускіх губернях, каб не дапусціць паўтора такой “друкаванай правіны”.

У ліпені 1840 г. Сенат прыняў указ аб тым, каб не выкарыстоўваць назвы “беларускія і літоўскія губерні” і замест іх называць гэтыя губерні па асобнасці (Віцебская, Магілёўская, Віленская, Мінская і Гродзенская), то ва ўсе цэнзурныя органы была разаслана пастанова, каб “зусім не ўжываліся агульныя назвы гэтых губерняў”. У сувязі з гэтым, напрыклад, назва афіцыйнай газеты “Літоўскі веснік” у 1841 г. было зменена на “Віленскі веснік” [6, с. 52].

Так званая “Вясна народаў” 1848 г. – узмацненне рэвалюцыйных рухаў у Заходняй Еўропе, не закранула Расійскую імперыю, але вызначылася пачаткам “эпохі цэнзурнага тэрору”. Камітэт, створаны 2 красавіка 1848 г. для ажыццяўлення асоба пільнага кантролю над творамі, якія выдаваліся на тэрыторыі Расійскай імперыі і дапамогі Міністэрству ўнутраных спраў па пытаннях пакарання «нядбайных»

аўтараў, узмацніў жорсткасць цэнзуры ў краіне. Мэтай кадравай палітыкі цэнзурнага апарата стала замяшчэнне цэнзараў-літаратараў цэнзарамі-службоўцамі. Але яшчэ праз два гады ў палітыцы ўрада зноў сталі назірацца паслабленні цэнзуры. Урад быў зацікаўлена ва ўмацаванні цэнзурнага апарата і падвышэнні яго аўтарытэту, а таксама у спыненні бясконцых спрэчак паміж аўтарамі і рэцэнзентамі. Таму 19 ліпеня 1850 г. былі зацверджаны рэкамендацыі Дзяржаўнай рады пра перавагі пры прызначэнні цэнзараў; дакумент уключаў тры асноўных палажэнні. Першае абвяшчала, што цэнзарамі маглі быць прызначаны «толькі службоўцы, з высокім узроўнем адукацыі. Паводле другога, цэнзары павінны быць «пры тым досыць азнаёмлены з гістарычным развіццём і сучасным рухам айчыннай ці замежнай славеснасці». У трэцім значылася, што цэнзары «падчас заняцця гэтай пасады не павінны разам з ёю несці ніякіх іншых абавязкаў». Істотна павышалася аплаты працы цэнзараў. Гэтыя меры прывялі да таго, што якасць цэнзуры значна ўзрасла. Так, шэрагі цэнзараў папоўнілі Ф.І. Цютчаў, А.Н. Майкоў, Я.П. Палонскі і некаторыя іншыя вядомыя літаратары свайго часу [5, с. 86-87]. З прыходам Цютчава на пост старшыні Камітэта замежнай цэнзуры апошні зведаў кардынальныя змены, уступіўшы ў фазу новага развіцця. Аб'яднанне вакол Фёдара Іванавіча паэтаў-цэнзараў, ператварыла канцылярскую ўстанова ў літаратурны салон [18, с. 73].

Змена палітычнага курсу ўрада ў сувязі са смерцю Мікалая І і ўзыходжаннем на прэстол Аляксандра ІІ праявілася і ў вобласці цэнзуры. Грамадская думка стала актыўна выступаць за перагляд цэнзурнага заканадаўства і, першым чынам, адмены шматлікіх дадаткаў да цэнзурнага статуту 1828 г., бо гэта ўжо не задавальняла ні ўрад, ні грамадства [6, с. 52].

Новы цар у вобласці цэнзуры паспрабаваў весці больш гнуткую палітыку. Напрыклад, Рада міністраў, нарэшце, прызнала, што згадванні ў друку пра беспарадкі і злоўжываннях могуць быць карыснымі, бо даюць магчымасць ураду атрымліваць звесткі апроч афіцыйных крыніц. Пачалося паступовае пашырэнне галоснасці, якую адстойвалі многія нават у асяроддзі ўрадавых службоўцаў. Было значна спрошчана з'яўленне новых перыядычных выданняў. За перыяд з 1845 па 1854 гг. з'явілася 6 новых газет і 19 часопісаў, а ў 1855 – 1864 гг. 66 газет і 158 часопісаў. Прычым, у гэту

статыстыку не ўключаліся выданні ўрадавых устаноў і навуковых таварыстваў [6, с. 56].

Ад папярэдняй цэнзуры ў сталічных гарадах былі вызвалены выданні аб'ёмам больш дваццаці друкаваных лістоў, а таксама ўрадавыя і навуковыя выданні на ўсёй тэрыторыі імперыі. Адказнасць ускладалася на выдаўцоў [12, с. 11]. Адной са спроб прыстасаваць цэнзурны апарат да ўскладненай дзейнасці было прамое ўцягванне ў сферу кантролю за друкам МУС. Увесь 1862 г. за літаратурай сачылі два міністэрствы: Міністэрства народнай асветы і Міністэрства унутраных спраy. Кампетэнцыя іх была размежавана наступным чынам: МНС ведала папярэдняй цэнзурай, а МУС – карнай, пры якой караліся цэнзурныя органы і друк за пропуск "сумніўных" матэрыялаў [6;,с. 57]. У студзені 1863 г. было вырашана выключыць цэнзуру з вядзення МНС, перападпарадкаваўшы яе МУС, дзе была створана рада міністра па справах кнігадрукавання. Пераход кантролю над друкам цалкам у рукі паліцэйскага ведамства сведчыць пра тое, што ўрад пачынае аддаваць перавагу карнай цэнзуры.

6 красавіка 1865 г. былі выдадзены «Часавыя правілы аб цэнзуры і друку». Паводле гэтых правіл Галоўнае Кіраванне па справах друку было падпарадкавана міністру ўнутраных спраў. Акрамя таго правілы вызвалялі ад папярэдняй цэнзуры ў абедзвюх сталіцах: 1) усе выходзіўшыя дагэтуль у свет перыядычныя выданні, выдаўцы якіх самі заявяць на тое жаданне; 2) усе арыгінальныя сачыненні аб'ёмам не меней 10-ці друкаваных лістоў і ўсе пераклады, аб'ёмам не меней 20-ці друкаваных лістоў. Па усей тэрыторыі імперыі ад папярэдняй цэнзуры вызваляліся: 1) усе ўрадавыя выданні; 2) усе выданні акадэмій, універсітэтаў і навуковых таварыстваў і ўстаноў; 3) усе выданні на старажытных класічных мовах і пераклады з гэтых моў; 4) чарцяжы, планы і карты [5, с. 146.]

Выданні, вызваленыя ад папярэдняй цэнзуры, усё ж падлягалі цэнзурнаму кантролю. Газеты трэба было здаваць у цэнзуру ў гранках да друку асноўнага тыражу, часопісы – за 2 дня, а кнігі – за 3 дня да пачатку продажу (у 1872 годзе тэрмін быў павялічаны адпаведна на 4 і 7 дзён). За гэты час цэнзары павінны былі прагледзець выданне і або дазволіць яго распаўсюджанне, або забараніць яго, затрымаць тыраж і прыступіць да судовага пераследу вінаватых. Найбольш цяжкія парушэнні (абразлівыя водзывы аб

законах і ўрадавых распараджэннях, заклікі, накіраваныя на ўзбуджэнне варожасці паміж рознымі пластамі насельніцтва ці саслоўямі) караліся турэмным зняволеннем тэрмінам да 16 месяцаў, арыштам на тэрмін да 4 месяцаў, ці штрафам у памеры да 500 рублёў. За аспрэчванне асноў уласнасці ці сямейнага саюза належыў арышт на тэрмін да 6 тыдняў ці штраф у памеры да 300 рублёў. За абвяшчэнне звестак, якія шкодзяць добраму імю, гонару і годнасці асоб ці ўстаноў, пакаранне складала да 16 месяцаў турэмнага зняволення ці да 500 рублёў штрафу. Злаславе і лаянка караліся турэмным зняволеннем да 6 месяцаў, арыштам да 3 тыдняў ці штрафам да 300 рублёў. Пры выяўленні пералічаных парушэнняў закона суд мог не толькі пакараць вінаватых, але і прыпыніць выданне на любы тэрмін ці зусім забараніць яго. Рэдактары і выдаўцы ў выпадку вынясення абвінаваўчага прысуду дыскваліфікаваліся на 5 гадоў. Абмеркаванне законаў, якое не ўтрымоўвае заклікаў да непадпарадкавання ім ці абразлівых выразаў, не лічылася злачынствам.

У цэлым адмена папярэдняй цэнзуры зрабіла кантроль над прэсай больш цвёрдым. Раней выдаўцы маглі зусім бяспечна, не падвяргаючыся рызыцы якіх-небудзь пакаранняў, узгадніць спрэчныя тэксты ў момант абмеркавання іх з цэнзарам. Зараз жа выдаўцы не мелі афіцыйнай магчымасці папярэдне кансультавацца з цэнзурай, за дапушчаныя памылкі іх чакаў у лепшым выпадку буйны штраф.

Практыка ж у адносінах кнігавыдаўцоў апынулася не такой цвёрдай – паступова выдавецтвы наладзілі неафіцыйныя сувязі з цэнзурай і ўзгаднялі рукапісы, а не гатовыя тыражы, выпраўляючы паказаныя цэнзарамі месца, што абараняла ад фінансавых страт і, у сутнасці, уяўляла сабою нефармальнае вяртанне да папярэдняй цэнзуры. У наступныя 40 гадоў цэнзурныя правілы станавіліся ўсё больш і больш жорсткімі. З 1868 гады Міністр унутраных спраў атрымаў права забараняць рознічны продаж перыядычных выданняў. Для шматлікіх газет такое пакаранне было раўназначна іх закрыццю. З 1872 г. Камітэт міністраў атрымаў права знішчаць тыражы кніг без узбуджэння судовага пераследу. Сакрэтны разгляд у Камітэце міністраў быў больш прымальным для выдаўцоў, чым адкрытае і фармальнае судаводства, так што з увядзеннем дадзенай меры судовае пераследванне выдаўцоў і аўтараў кніг практычна

спынілася, змяніўшыся знішчэннем тыражоў. З 1873 г. упраўленне па справах друку пачало рассылаць рэдактарам перыядычных выданняў спісы тэмаў і падзей, абвяшчэнне і абмеркаванне якіх урад мяркуе непажаданым. Парушэнне гэтых рэкамендацый вяло да прымянення санкцыі да парушальніка. З 1882 г. забараняць выданні мог не толькі Сенат, але і нарада міністраў унутраных спраў, юстыцыі, народнай асветы і обер-пракурора Сінода. З 1897 г. стала немагчымым перадаваць дазволенае выданне ад аднаго выдаўца да іншага без узгаднення з уладамі [19].

Нягледзячы на усе абмежаванні да пачатку XX стагоддзя ў Расіі назіралася лавінападобнае павелічэнне колькасці перыядычных выданняў. Гэты ж час адзначыўся станаўленнем правінцыйнага друку, доля якога на рынку перыёдыкі імкліва расла. Да пачатку рэвалюцыі ў краіне выходзіла больш трох тысяч часопісаў і газет, каля тысячы з якіх мелі палітычную скіраванасць [21]. Рэвалюцыя 1905 года спарадзіла блытаніну ў сферы цэнзуры. Спробы «замоўчвання» рэвалюцыйных падзей праваліліся, кантроль над прэсай быў часова згублены [5, с. 186].

Каб збіць рэвалюцыйную хвалю урад, 17 кастрычніка 1905 г. апублікаваўшы “Маніфест”, паводле якога ўсім падданым імперыі «дараваліся непарушныя свабоды на пачатках сапраўднай недатыкальнасці асобы, свабоды сумлення, слова, збораў, саюзаў». Пасля абвяшчэня “Маніфеста” кіраўнікі найболей аўтарытэтных часопісаў і газет заклікалі калегаў зусім адмесці ўсе патрабаванні цэнзуры і друкавацца без аглядкі на яе. Стала з’яўляцца мноства газет і часопісаў, прывабленых «свабодай слова». Аднак ўжо з канца лістапада 1905 г. Міністэрства ўнутраных спраў пачало рэпрэсіі супраць журналістаў, а затым шматлікія арышты і судовыя працэсы над выдаўцамі, што вымусіла антыўрадавую прэсу згарнуць сваю дзейнасць[21].

У наступным 1906 г. цэнзурнае заканадаўства паспрабавалі прыстасаваць да змяніўшыхся умоў. 18 сакавіка 1906 г. выходзіць Імянны ўказ «Дадатак да часавых правіл для перыядычных выданняў», 26 красавіка – «Часовыя правілы дя неперыядычнага друку». «Часовыя правілы» былі набліжаны да еўрапейскіх законаў – забарона любых выданняў было магчыма выключна ў судовым парадку [3; с. 68]. Новыя правілы адмянялі папярэднюю цэнзуру, але камітэты па друку праглядалі выданні, якія выходзілі.

Накладанне санкцый было магчыма ў выпадку, калі выданні парушалі крымінальны закон.

Пры ўвядзенні ў асобных губернях становішча надзвычайнай аховы ці ваеннага становішча генерал-губернатары і губернатары атрымлівалі права прыпыняць выпуск перыядычных выданняў. У 1905 – 1907 гадах становішча надзвычайнай аховы ўводзілася ў 27, а ваеннае становішча – у 40 губернях і абласцях. Яшчэ адным метадам ціску на прэсу была адміністрацыйная, гэта значыць зробленая па распараджэнні губернатараў без усякага фармальнага разгляду, высылка непажаданых ураду рэдактараў і журналістаў. Вялікі грамадскі рэзананс атрымала высылка ў Мінусінск папулярнага літаратара А.В. Амфітэатрава (1902 г.) за апублікаванне фельетона «Спадары Падманавы», які прадставіў царскую сям'ю ў карыкатурным выглядзе [5, с. 183].

За дзесяць дзён да пачатку Першай Сусветнай вайны выйшла «Часавае палажэнне пра ваенную цэнзуру», якое уводзіла надзвычайныя абмежаванні на свабоду друку. У выніку за першы год вайны на прэсу было накладзена 372 штрафы на суму 140 тысяч рублёў, канфіскавана 216 нумароў газет, арыштаваны 63 рэдактары, забаронена 20 газет. Асобаму кантролю падвяргаліся франтавыя журналісты – быў уведзены інстытут акрэдытацыі. Перыяд Першай сусветнай вайны характэрны ўзмацненнем эканамічнага ціску ўрада на выдаўцоў, вялікая колькасць журналістаў падкуплялася, Міністэрства ўнутраных спраў актыўна субсідзіравала і фінансавала часопісы, ствараючы "лаяльныя да ўлады выданні" [5, с. 195].

Нягледзячы на ўсе гэтыя абмежаванні канец XIX – пач. XX ст. – стаў часам «росквіту рускай журналістыкі». Незадаволенасць рэпрэсіямі МУС, дыскусіі пра «свабоду слова», што распачаліся ў прэсе ўскалыхнулі выдаўцоў і журналістаў, якія сталі ў апазіцыю ўрадавым структурам і зрабілі нямалы унёсак у стварэнне рэвалюцыйнай сітуацыі ў краіне [21]. Прафесар Мар'яна Тэкс Чолдзін, якая прысвяціла буйнае даследаванне дзейнасці імперскай цэнзуры ў дачыненні замежных кніг, адзначае, што замежная літаратура з'яўлялася самым папулярным чытаннем у асяроддзі адукаванага насельніцтва Расійскай імперыі. Прызнаючы небяспеку «разбуральнага заходняга ўплыву», урад спрабаваў ахаваць ад яго грамадзян сваёй краіны [18, с. 49]. Спачатку ён імкнуўся да недапушчэння крытычных думак у адносінах да інстытута

самадзяржаўя. Дадзены цэнзурны кірунак у стаўленні да замежнай літаратуры ўпершыню ярка выявіўся на фоне шматлікіх еўрапейскіх рэвалюцый сярэдзіны XIX стагоддзя, калі Расія «з двойчы ўзросшым стараннем стала ўзводзіць плот вакол імперыі», асцерагаючыся, што ліберальныя ідэі знойдуць адбітак у сэрцах людзей – найвялікая ўвага пры гэтым надавалася айчыннай перыёдыцы, здольнай гэтыя ідэі данесці да радавога чытача простай і зразумелай мовай. Але рускі імперскі рэжым правалiў сваю місію. Як высвятлілася, плот, збудаваны вакол імперыі, не змог абараніць краіну ад сапраўды небяспечных ідэй і прывеў Расійскую імперыю да гібелі.

**Выкарыстаныя крыніцы і літаратура**


1. Арсеньев, К.К. Законодательство о печати/ К.К. Арсеньев. – СПб.: Типография Ф. Вайсберга и П. Гершунина, 1903 . – 263 с.
2. Балуев, Б.П. Политическая реакция 80-х годов XIX века и русская журналистика / Б.П. Балуев. – М., Изд-во Моск. ун-та, 1971. – 315 с.
3. Блюм, А.В. От неолита до Главлита / А.В. Блюм. – СПб.: Искусство России, 2009. – 272 с.
4. Валуев, П.А. Дневник / П.А. Валуев. – М.: Издательство Академии наук СССР, 1961. – 587с.
5. Жирков, Г.В. История цензуры в России XIX – XX века / Г.В. Жирков. – М.: Аспект-Пресс, 2001. – 368 с.
6. Загонов, А.А. Цензурная политика самодержавия в Беларуси в первой половине XIX в.: диссертация на соискание ученой степени кандидата исторических наук; 07. 00. 02 – отечественная история. / А.А. Загонов. – Брест,1997 год. – 127 с.
7. Зайончковский, П.А. Российское самодержавие в конце XIX столетия / П. А. Зайончковский. – М., Изд-во Мысль, 1970. – 444 с.
8. Котович, А. Духовная цензура в России (1799 – 1855 гг.) / А. Котович. – СПб.: Типография "Родник", 1909. – 270 с.
9. Лемке. М.К. Эпоха цензурных реформ / М.К. Лемке. – СПб, Изд-во Типолитография "Герольд", 1904. – 421 с.
10. Мезьер, А.В. Русская словесность с XI по XIX ст. включительно. В 2-х ч. / А.В. Мезьер. – СПб.: Типография А. Пороховщикова. – 1899.

11. Никитенко, А.В. Записки и дневник. В 3 томах / А.В. Никитенко. – М.: Художественная литература, 1955. Т. 1 – 590 с.; Т. 2 – 653 с.; Т. 3 – 583 с.

12. Патрушева, Н.Г. Цензурная реформа 1865 г. в России: автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук, 07.00.02 – история СССР. – Ленинград, 1990. – 20 с.

13. Патрушева, Н.Г., Гринченко Н.А. История цензурных учреждений в России в XIX – начале XX века / Н.Г. Патрушева, Н.А. Гринченко. // Электронный ресурс https://ru. pseudology.org.

14. Рейфман, П.С. Цензура в дореволюционной, советской и постсоветской России. Курс лекций. В 2-х томах / Под ред. Г.Г. Суперфина. – М.: «Пробел – 2000», – 2015. – 232 с.

15. «Русский архив» Все номера журнала на сайте Руниверс. http://www.runivers.ru

16. Русская старина: Ежемесячное историческое издание 1870 – 1918 гг: в 175 т. Репринтное издание. – СПб.: Альфарет, 2007 – 2009.

17. Скабичевский, А.М. Очерки по истории русской цензуры / А.М. Скабичевский. – СПб.: Типография Т-ва «Общественная польза», 1892. – 328 с.

18. Тэкс Чолдин, Марианна. Империя за забором. История цензуры в царской России / пер. с англ. М. Галушкиной. – М.: Рудомино, 2002. – 309 с.

19. Устав о цензуре и печати, с позднейшими дополнениями, законодательными мотивами, разъяснениями Прав. Сената и административными распоряжениями / Сост. В.П. Ширков. – СПб.: Изд-во Н.К. Мартынова, 1900. – 302 с.

20. Феоктистов, Е.М. За кулисами политики и литературы. 1848 – 1896. / Е.М. Феоктистов. – Л.: Прибой, 1929. – 243 с.

21. Цензура в Российской империи // https://ru.wikipedia.org/wiki

22. Цензура. Большая советская энциклопедия. -slovari.yandex.ru.

23. Чернуха, В.Г. Внутренняя политика царизма с середины 50-х до начала 80-х гг. XIX в. / В.Г. Чернуха. – Л.: Знание, 1978. – 76 с.

24. Энгельгардт, Н.А. Очерк истории русской цензуры в связи с развитием печати (1703 – 1903) / Н.А.Энгельгардт. – СПб.: Изд-во А.С. Суворина, 1904. – 388 с.

# РАСІЙСКА-ЛІТОЎСКІ МІРНЫ ДАГАВОР 12 ЛІПЕНЯ 1920 Г. І АДНОСІНЫ ДА ЯГО БЕЛАРУСКІХ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ І АРГАНІЗАЦЫЙ

Багалейша С.В.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Гісторыя Беларусі навейшага часу фарміравалася не толькі і не столькі пад уплывам унутраных працэсаў і фактараў, колькі пад уздеяннем знешнепалітычных сіл краін - Расіі, Польшчы, Украіны, Літвы, Латвіі, Германіі, Францыі, Англіі і ЗША. У пераломныя моманты нашай айчыннай гісторыі іх уплыў на лёс Беларусі і фарміраванне нацыянальнай дзяржаўнасці быў значны, а ў шэрагу выпадкаў і вызначальны. Беларускія этнічныя тэрыторыі не аднойчы падвяргаліся захопам і падзелам з боку суседзяў. Чарговы падзел беларускіх зямель адбыўся ў выніку падпісання мірнага дагавора паміж Савецкай Расіяй і Літвой. Гэты дагавор – з’ява цікавая і складаная, і на сённяшні дзень патрабуе дэталёвага даследавання.

У перыяд 1919–1920 гг. маладой літоўскай дзяржаве было вельмі важна атрымаць міжнароднае прызнанне. На гэта паўплывала і складанае міжнароднае становішча: ішла польска-савецкая вайна. 22 красавіка польскія войскі поўнасцю авалодалі Вільняй і захапілі шэраг літоўскіх гарадоў. Праблему нашых паўночных тэрыторый Польшча імкнулася вырашыць дыпламатычным шляхам. Рашэннем Вярхоўнага Савета Антанты ад 18 чэрвеня, а потым ад 27 ліпеня былі праведзены дэмаркацыйныя лініі, якія раздзялілі ўдзельнікаў канфлікту – польскі і літоўскі бакі. У адпаведнасці з гэтым рашэннем за акупацыйнымі польскімі ўладамі быў пакінуты Віленскі край. З мэтай прыпыніць размовы аб акупацыі Віленшчыны польскія ўлады прапанавалі правесці на яе тэрыторыі плебісцыт. Гэта, вядома, не задавальняла ўрад Літвы, таму што ён добра прадбачыў яго вынікі і катэгарычна выступіў супраць яго.

У такіх умовах, нягледзячы на прыязныя адносіны з урадам Беларускай Народнай Рэспублікі і заключаны з Вышэйшай Беларускай Радай дагавор аб супрацоўніцтве ад 27 лістапада 1918 г., літоўскія ўлады скіравалі свой позірк на Савецкую Расію і пайшлі на падпісанне мірнага дагавора. Справа была ў тым, што са студзеня 1920 г. знешняе становішча Літвы было такім, што яна павінна

была пасляшацца з мірнымі перагаворамі з РСФСР. Над Літвой навісла пагроза акупацыі польскімі войскамі. Падпісанне міру з Савецкай Расіяй давала Літве надзею на паляпшэнне свайго палітычнага і эканамічнага становішча. Кабінет Э. Гальванаўскаса ніяк не мог вырашыць фінансавыя і гаспадарчыя цяжкасці, некалькі разоў беспаспяхова імкнуўся атрымаць грашовую пазыку ў кіраўніцтва ЗША, Англіі і Францыі. Усе гэта абвастрыла ўнутрыпалітычныя супярэчнасці: 22–23 лютага 1920 г. адбылося буйное паўстанне ў літоўскай арміі, што падштурхнула правячыя колы заключыць мір з Савецкай Расіяй. Заключэнню міра спрыяла таксама паспяховае заканчэнне савецка-эстонскіх перагавораў – 2 лютага 1920 г. паміж Эстоніяй і Савецкай Расіяй быў падпісаны мірны дагавор.

У сваю чаргу, савецкі бок разлічваў на мірны дагавор з Літвой, зыходзячы з двух асноўных матываў. Па-першае, Масква разглядала дагавор праз прызму ленінскай тэорыі міравой сацыялістычнай рэвалюцыі і геапалітычных абставін. У якасці аб’екту экспарту сацыялістычнай рэвалюцыі была вызначына Прыбалтыка, і ў тым ліку Літва. Па-другое, Расія павінна была пасляшацца з заключэннем міру, так як на літоўскія тэрыторыі прэтэндавала Польшча. У сваіх знешнепалітычных планах Ю. Пілсудскі зыходзіў з ідэі аб’яднання тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Акрамя таго, ішла савецка-польская вайна, якая была вельмі складанай для Савецкай Расіі. Для Літвы мірны дагавор таксама быў патрэбны, бо з’явілася магчымасць выйсці з ізаляцыі, у якой краіна апынулася восенню 1919г., пасля таго, як не атрымалася стварыць Балтыйскі саюз.

Мірныя перагаворы паміж Літвой і Савецкай Расіяй працягваліся каля двух месяцаў і былі не вельмі лёгкімі. Па словах літоўскага дзеяча Э. Гальванаўскаса, “воз переговоров не раз застревал”; аднак “невидимая рука вновь выводила его на гладкий путь” [9, с. 87]. Для кампраміснага вырашэння пытання абодва бакі не раз вымушаны былі ісці на значныя ўступкі.

Яшчэ падчас актыўных дзеянняў на фронце польска-савецкай вайны 11 верасня 1919 г. урад РСФСР звярнуўся да ўрада Літвы з прапановай заключыць мір на аснове прызнання незалежнасці літоўскай дзяржавы [9, с. 85]. 31 сакавіка 1920 г. урад Літвы выказаў гатоўнасць заключыць мір з Савецкай Расіяй пры ўмове не толькі прызнання незалежнасці Літвы, але і прызнання яе

дзяржаўнасці ў граніцах Віленшчыны (са сталіцай Вільна) і Гродзеншчыны, дзе літоўскае насельніцтва складала меншасць. Тэрытарыяльная праблема падчас перагавораў займала цэнтральнае месца.

2 красавіка 1920 г. урад РФСФР пагадзіўся на выкарыстанне этнаграфічнага прынцыпу для вызначэння межаў Літоўскай дзяржавы, аб чым праінфарміраваў літоўскі бок у афіцыйнай дыпламатычнай ноце. У гэтым жа дакуменце ўрад РСФСР прапанаваў пачаць мірную канферэнцыю ў Маскве 15 красавіка 1920 г. 4 красавіка 1920 г. міністр замежных спраў Літвы накіраваў народнаму камісару па замежных справах РСФСР Г.В. Чычэрыну дыпламатычную ноту адносна гатоўнасці Савецкай Расіі прызнаць за Літвой Вільню і Гродна. У дакуменце таксама літоўскі бок патрабаваў, каб Савецкая Расія прызнала незалежнасць Літвы яшчэ да падпісання мірнага дагавора, і толькі на такіх умовах літоўцы пагаджаліся распачаць перамовы. Дыпламатычная перапіска адносна будучых перагавораў паміж урадамі дзвюх краін ішла на працягу ўсяго красавіка [4, с. 43].

У красавіку 1920 г. сярод літоўскіх палітыкаў распачалася дыскусія. Члены літоўскага ўрада гатовы былі падтрымаць праект, прапанаваны віцэ-міністрам замежных спраў Петрасам Клімасам, у якім гаварылася пра патрабаванні далучыць да Літвы Сувалкаўскую, Ковенскую і Віленскую губерні і Панямонне Гродзенскай губерні. На слонімскіх землях планавалася правесці плебісцыт, а да таго ўвесці там часовае кіраванне [10, с. 50]. Некаторыя паслы новаабранага літоўскага сейма былі менш прагныя, напрыклад, сацыял-дэмакраты. А незалежнік Сцяпанас Кайрыс выказаў сумненне наконт вырашэння пытання аб слонімскай зямлі, будучы перакананым, што гэта этнічная частка Беларусі. Тэрытарыяльная праграма літоўскай дэлегацыі, з іх пункту гледжання, як бы грунтавалася на этнічным прынцыпе і нібы ўлічвала патрэбы беларускага і яўрэйскага насельніцтва [9, с. 197]. Між тым на тэрыторыі, якую жадалі атрымаць літоўцы, згодна з Усерасійскім перапісам насельніцтва 1897 г., літоўцы складалі толькі ад 1,4 да 8 працэнтаў. На самой справе урад Літвы выкарыстоўваў Беларусь як палітычны інструмент для рэалізацыі сваіх тэрытарыяльных праектаў [11, с. 8]. Амбіцыёзныя патрабаванні літоўскай дэлегацыі на перагаворах у пачатку былі

рашуча адхілены савецкім бокам. Савецкая дэлегацыя на перамовах кіравалася ўстаноўкай: як мага менш даваць Літве юрыдычных абавязацельстваў і як мага больш зрабіць яе залежнай ад Расіі. Затым сітуацыя значна змянілася.

Урэшце сярод літоўскіх палітыкаў перамог урадавы пункт гледжання. У падрыхтаваным праекце трактату, які быў накіраваны ў Маскву, гаварылася, што літоўскай прызнаецца тэрыторыя трох губерняў: Сувалкаўскай, Ковенскай і Віленскай. Акрамя таго, пад уладай Літвы павінна застацца слонімская зямля, якая вызначалася як частка Гродзенскай губерні, але без Брэсцкага і Кобрынскага паветаў, аднак з Навагрудскім паветам Мінскай губерні. Гэтым мясцовасцям Літва гатова была даць права на самавызначэнне.

У склад літоўскай дэлегацыі на мірныя перагаворы з Расіяй быў уключаны Дамінік Сямашка. 2 мая 1920 г. ён адправіў В. Ластоўскаму ліст, у якім дакладваў аб праекце літоўскага ўрада наконт становішча беларускіх этнаграфічных зямель у складзе Літвы. Па-першае, гаварылася ў ім, Літва прымае Гродзеншчыну пад свой часовы пратэктарат. Па-другое, на яе тэрыторыі будзе створана спецыяльная беларуская дзяржаўная арганізацыя са сваім сеймам, выканаўчым апаратам і іншымі структурамі. Па-трэцяе, жыхары гэтага краю праз пэўны час вырашаць, ці яны застануцца ў складзе Літвы, ці далучацца да беларускай дзяржавы [10, с. 50–51]. В. Ластоўскі пагадзіўся на гэтыя ўмовы, але патрабаваў гарантый ад літоўскага бока, якіх ён так і не дачакаўся.

7 мая 1920 г. у Маскве пачаліся мірныя перагаворы. У самым пачатку іх літоўская дэлегацыя выставіла максімальныя патрабаванні – далучыць да Літвы Ковенскую, Віленскую, Сувалкаўскую і Гродзенскую губерні, а таксама Навагрудскі ўезд Мінскай губерні. Яна выкарыстоўвала яшчэ і такі аргумент, як права беларусаў на самавызначэнне, але ў перагаворах ён быў вельмі слабым. 9 мая член літоўскай дэлегацыі Д. Сямашка выступіў з заявай аб тым, што на падставе беларуска-літоўскіх пагадненняў ён будзе абараняць беларускія тэрытарыяльныя інтарэсы “ад імперыялістычных памкненняў Польшчы і Савецкай Расіі” [16, с. 206]. Таксама ён звярнуў увагу на тое, што расійскі бок нядобразычліва адносіўся да беларусаў, так як на перамовах расійскія прадстаўнікі ні разу не сказалі пра Беларусь, нават пазбеглі выкарыстоўваць гэтую назву [14, л. 8]. Заява выклікала пратэст з боку кіраўніка савецкай дэлегацыі на перагаворах

А.А. Іофэ, які паставіў пад сумненне правамоцтва Д. Сямашкі выступаць ад імя беларусаў. Трэба засяродзіць увагу на тым, што падчас перагавораў Д. Сямашка займаў вельмі супярэчлівую пазіцыю. З аднаго боку, ён выступаў за поўнае самавызначэнне Беларусі, непадзельнасць яе тэрыторыі, на якую, па яго заяве, пасягалі Польшча і Расія. З другога боку, Д. Сямашка быў руплівым прыхільнікам далучэння да Літвы Гродзеншчыны і іншых беларускіх тэрыторый, падтрымліваючы ідэю "Вялікай Літвы". Пры абгрунтаванні гэтай пазіцыі ён спасылаўся на волю беларускага насельніцтва, выяўленую нацыянальным кангрэсам Гродзенскага краю (1–3 снежня 1918 г.). Такі крок, па яго меркаванні, адкрываў перспектыву ўз'яднання беларуска-літоўскай дзяржавы [14, л. 9]. У сваю чаргу, у маі 1920 г. В. Ластоўскі запатрабаваў ад Д. Сямашкі гарантый таго, што беларусы атрымаюць аўтаномію ў складзе Літоўскай дзяржавы і на спрэчных тэрыторыях будзе праведзены плебісцыт адносна іх будучай прыналежнасці. Не атрымаўшы такіх гарантый, беларусы выступілі супраць уключэння беларускіх тэрыторый у склад Літвы [17, с. 274]. А Цэнтральная беларуская рада Віленшчыны і Гродзеншчыны 6 мая накіравала пратэст на імя наркама замежных спраў РСФСР Г. Чычэрына супраць удзелу Д. Сямашкі ў савецка-літоўскіх перамовах у якасці прадстаўніка беларускага народа, аднак пратэст не быў заўважаны. Апрача таго, як літоўцы рыхтаваліся выехаць ў Маскву, В. Ластоўскі самастойна прапанаваў Савецкай Расіі прызнаць БНР і распачаць мірныя перагаворы і выслаць на гэтыя перагаворы сваю дэлегацыю [1, с. 724].

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, літоўскія дэлегаты і надалей вышуквалі новыя аргументы, каб апраўдаць свае прэтэнзіі на землі Гродзеншчыны. П. Клімас даказваў, што яны спрадвечна належалі Літве. Савецкі бок не хацеў прымаць літоўскія "гістарычныя" аргументы, даказваючы, што для яго галоўнае – права народа на самавызначэнне. У адказ на літоўскія сцвярджэнні савецкая дэлегацыя 15 мая прадставіла этнаграфічную карту, на якой было паказана рассяленне літоўцаў толькі на тэрыторыі Сувалкаўскай, Ковенскай і заходняй частцы Віленскай губерняў (нават без Вільні). Паводле савецкага праекта граніца павінна была праходзіць ад возера Дрысвяты да Пастаў, адтуль да Ашмянкі і далей праз Дзевянішкі і Дубічы да чыгункі Гродна – Вільня [16, с. 206]. 26 мая кіраўнік літоўскай дэлегацыі П. Клімас пісаў міністру замежных

спраў аб хісткасці літоўскіх прэтэнзій на тэрыторыі Гродзенскай губерні. “Рускія прынцыпова не могуць задаволіць нашы патрабаванні, так як у Лідскім, Ашмянскім і асабліва Гродзенскім паветах, без сумнення, пражывае большасць беларусаў і рускіх… У нас сапраўды няма ніякіх этнаграфічных доказаў, акрамя некалькіх непераканаўчых успамінаў аб тым, што ў некаторых месцах жыхары выкарыстоўваюць літоўскую мову… Не змаглі пераканаць савецкі ўрад і нашыя эканамічныя довады, якія таксама несур’ёзныя…” – сцвярджалася ў запісцы [4, с. 58]. Аднак літоўцы працягвалі настойваць на выкананні сваіх патрабаванняў і нават адмовіліся стварыць змешаную камісію для разгляду пытання аб граніцах (адпаведная прапанова была зроблена расійскай дэлегацыяй яшчэ 21 красавіка 1920 г.) [6]. За ходам перагавораў уважліва сачылі беларускія нацыянальныя дзеячы, якіх хваляваў лёс беларускіх этнічных тэрыторый.

Аднак ва ўмовах падрыхтоўкі да актыўных баявых дзеянняў супраць Польшчы савецкі бок вырашыў саступіць. 8 мая 1920 г. літоўцам было прапанавана неадкладна заключыць ваенны саюз з Савецкай Расіяй. У ліпені 1920 г. кіраўніцтва РСФСР вырашыла паскорыць ход перагавораў з Літвой, даўшы згоду на максімальнае задавальненне тэрытарыяльных патрабаванняў літоўцаў [12, с. 127]. Літоўцы пагадзіліся, бо асцерагаліся, што ў выпадку магчымага наступлення савецкіх войск у Вільні будзе зноў створаны савецкі ўрад. Паскорыла факт заключэння мірнага дагавора і заява ад 4 ліпеня 1920 г. міністра замежных спраў Польшчы Я. Сапегі, у якой было заяўлена пра гатоўнасць польскага ўрада дэ-факта прызнаць незалежнасць Літвы і ўсталяваць з ёй добрасуседскія адносіны. 11 ліпеня 1920 г. у Вільні пры пасрэдніцтве Англіі адбыліся перагаворы паміж прадстаўнікамі Літвы і Польшчы аб магчымасці сумеснай барацьбы супраць Савецкай Расіі.

У выніку дагавор быў падпісаны 12 ліпеня 1920 г. і складаўся з 19 артыкулаў. Савецкі ўрад безагаворачна прызнаў самастойнасць і незалежнасць літоўскай дзяржавы, а Вільню і суседнія з ёй тэрыторыі (з Лідай і Гродна) – неад’емнай часткай Літвы. Паводле дагавора дзяржаўная граніца паміж Расіяй і Літвой праходзіла ад Дзвіны па лініі на захад ад Друі на ўсход ад Браслава – Казьяны – Паставы – азёры Мядзел і Мястра; на захад ад Вілейкі па заходніх ускраінах Маладзечна і Валожына, па рэках Валожынка, Іслач,

Бярэзіна да ўпадзення яе ў Нёман ля мястэчка Дзеляцічы; далей па Немане і за 30 км на поўдзень ад Гродна на поўдзень ад Аўгустова [13, л. 26–27]. Абодва бакі абавязваліся не дапускаць выкарыстання сваіх тэрыторый для ваенных прыгатаванняў, накіраваных супраць адзін аднаго. Некалькі артыкулаў дагавора датычыліся эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва паміж Літвой і Расіяй. Пры заключэнні мірнага дагавора РСФСР выказала гатоўнасць паважаць нейтралітэт Літвы, калі ён будзе прызнаны іншымі дзяржавамі.

Прымаючы пад увагу цяжкае становішча Літвы ў сувязі з яе стратамі падчас Першай сусветнай вайны, савецкі ўрад даў згоду на пазыку ёй 3 мільёнаў рублёў [13, л. 32]. Абодва бакі абавязваліся прытрымлівацца прынцыпу найбольшага спрыяння ва ўзаемных адносінах [8, с. 343]. Дагавор таксама прадугледжваў вяртанне Літве культурных каштоўнасцей, што былі вывезены падчас Першай сусветнай вайны і знаходзіліся на тэрыторыі РСФСР. Дагавор падпісалі А. Іофе, Ю. Мархлеўскі, Л. Абаленскі з рускага боку і Н. Нарушэвіч, П. Клімас, С. Розенбаўм, І. Вайкалайціс, В. Рачкаўскас з літоўскага [13, л. 25]. Да мірнага дагавора дадавалася асобая дэкларацыя, паводле якой Літва пагаджалася не разглядаць праход савецкіх войск па тэрыторыі, якая адыходзіла да яе, як варожы акт пры ўмове іх вываду ў далейшым [7]. Кіраўніцтва РСФСР нават прапанавала літоўцам самім вызваліць Вільню ад палякаў, але тыя адмовіліся. Толькі 14 ліпеня пасля жорсткіх баёў часці Чырвонай Арміі ўвайшлі ў горад. 6 жніўня прадстаўнікі галоўнага камандавання Чырвонай Арміі заключылі пагадненне з ваенным камандаваннем Літвы аб перадачы Вільні пад літоўскі кантроль. У дакуменце былі вызначаны дакладныя тэрміны і парадак вываду савецкіх войск з Віленшчыны. На аснове палажэнняў дагавора ўрад РСФСР 27 жніўня 1920 г. перадаў Літве Вільню, і ў сувязі з гэтым была падпісана спецыяльная канвенцыя аб вывадзе савецкіх войск з літоўскай тэрыторыі [5, с. 188]. 28 жніўня Літва афіцыйна заявіла аб намеры захаваць нейтралітэт у польска-савецкім канфлікце.

Літва стала другой пасля Эстоніі некамуністычнай дзяржавай, якая ўстанавіла з Савецкай Расіяй поўнасцю юрыдычна аформленыя дыпламатычныя адносіны. Савецка-літоўскі мірны дагавор 12 ліпеня 1920 г. значна палепшыў міжнароднае становішча Літвы,

бо юрыдычна замацаваў факт яе аддзялення ад Расіі і стварыў юрыдычную аснову для яе прэтэнзій на Вільню і частку беларускіх зямель.

Факт заключэння дагавору ўзрушыў беларускіх дзеячаў, бо ён непасрэдна датычыўся беларускіх зямель. Урад БНР запатрабаваў ад Літвы гарантый прадастаўлення беларусам аўтаноміі ў яе складзе і правядзення плебісцыту адносна прыналежнасці беларускіх тэрыторый, але адказу не атрымаў. Ужо 16 мая была даслана нота пратэсту старшыні Парыжскай мірнай канферэнцыі ў сувязі з далучэннем да Літвы этнічна беларускіх Віленскай і Гродзенскай губерній. У ёй урад БНР пратэставаў супраць далучэння тых зямель да Літвы. “Беларускі народ не прызнае законным адрыванне ад БНР Віленшчыны і Гродзеншчыны і ўсякія дамовы паміж Літвой і Савецкай Расіяй па гэтым пытанні не лічыць для сябе абавязковымі”, – гаварылася ў ноце [5, с. 173–174]. 17 ліпеня 1920 г. В.І. Захарка ўручыў Г.В. Чычэрыну ноту пратэсту супраць перадачы беларускіх тэрыторый Літве. Нота пратэсту кіраўніцтва БНР ураду РСФСР была накіравана таксама 29 ліпеня. Аднак адказ ад расійскага боку прышоў [15, л. 14].

22 ліпеня 1920 г. урад БНР на чале з В. Ластоўскім апублікаваў зварот да ўрадаў РСФСР, Літвы, Парыжскай мірнай канферэнцыі, усіх дзяржаў і народаў свету, у якім заявіў, што не прызнае мірны дагавор, на аснове якога да Літвы далучаюцца этнічныя беларускія землі, і будзе змагацца супраць яго [15, л. 62]. Урад БНР выказаў самы рашучы пратэст супраць падпісанага савецка-літоўскага дагавора, так як яго ўмовы груба парушалі суверэнныя, нацыянальныя, культурныя і эканамічныя правы беларускага народа. Віленшчына і Гродзеншчына, – сцвярджалася ў звароце, – гэта этнічныя беларускія землі, якія Савецкая Расія без згоды беларускага народа перадала Літве. Складальнікі дакумента патрабавалі пераглядзець умовы дагавора з улікам жадання беларускага народа стварыць суверэнную і незалежную беларускую дзяржаву ў этнаграфічных межах і прапаноўвалі вырашаць супярэчнасці паміж Беларуссю і Літвой шляхам арганізацыі плебісцыту ў спрэчных раёнах. Негатыўна ўспрыняла дагавор і Беларуская рада Гродзеншчыны і Віленшчыны. Яна была супраць практыкі разгляду пытанняў, што закранalі лёс Беларусі без удзелу яе прадстаўнікоў.

7 верасня у сувязі з заключэннем міру паміж Літвой і Савецкай Расіяй В. Ластоўскі падпісаў ноту, у якой беларускі ўрад звярнуўся

з пратэстам да заходнееўрапейскіх краін. У ноце, перададзенай па радыё, было падкрэслена, што гэты мірны дагавор парушае суверэнныя правы беларускага народа, а пытанне аб межах паміж Літвой і Беларуссю павінна вырашацца шляхам плебісцыту на спрэчных тэрыторыях [5, с. 195].

Дагавор негатыўна ацэньваўся і ў беларускім перыядычным друку. "Гэта змова паміж Літоўскім урадам і бальшавікамі, у ходзе якой да Літвы былі далучаны большая частка Гродзенскай і Віленскай губерній, ганебна і адмоўна паўплывае на развіццё беларускай дзяржаўнасці", – канстатавалася аўтарам артыкула ў газеце "Беларускае слова" [3]. У газеце "Беларусь", якая выдавалася ў Мінску, у нумары за 16 чэрвеня 1920 г. было катэгарычна заяўлена: "Беларускі народ ніколі не згадзіцца і не дазволіць, каб дзевяць дзясятых тарыбаўскай дзяржавы складалася з беларускіх зямель, каб Вільня – наш культурны цэнтр, ваколіцы якога заселены толькі беларусамі, зрабілася сталіцай чужой дзяржавы. Беларускаму народу застаецца толькі рабіць сваю справу: будаваць Беларуска-Літоўскую рэспубліку са сталіцай у Вільні. Няхай існуюць пакуль што адначасна дзве Літвы. Гэта нас не павінна пужаць. Мы ўпэўнены, што здаровыя і дзяржаўна разважаючыя элементы літоўскага народа будуць з намі. Бо яны зразумеюць, да чаго давядзе палітыка тарыбаўцаў".

Аднак увосень 1920 г. пазіцыя беларускіх нацыянальных дзеячаў і арганізацый да заключанага дагавора пачала мяняцца. 7 верасня 1920 г. на сходзе прадстаўнікоў Беларускай рады Віленшчыны і Гродзеншчыны, Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні і іншых беларускіх арганізацый было прынята рашэнне аб падтрымцы мірнага дагавора, але пры некалькіх умовах:

1) далучаныя да Літвы беларускія землі павінны былі атрымаць аўтаномію; 2) патрабавалася стварэнне Часовай краёвай рады з прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцей на спрэчнай тэрыторыі; 3) прызначэнне на пасаду міністра беларускіх спраў асобы, якая б карысталася даверам і падтрымкай сярод беларускага грамадства [8, с. 870–871].

11 лістапада, пры заключэнні дагавора паміж урадам БНР і літоўскім урадам, у сакрэтным пагадненні зазначалася, што ўрад БНР будзе падтрымліваць урад Літвы ў барацьбе за вызваленне Віленшчыны ў межах дагавора 12 ліпеня 1920 г. [5, с. 215].

Расійска-літоўскі трактат не спраўдзіў надзей, якія на яго ўскладаў літоўскі бок, і ўвогуле не адыграў рэальнай ролі ў сувязі са зменай агульнай ваенна-палітычнай сітуацыі і перамогай польскіх войск пад Варшавай. Згодна з мірным дагаворам паміж Расіяй і Літвой, савецкі ўрад перадаў Літве этнічна беларускія землі. Масква юрыдычна прызнавала іх за Літвой без ведама і згоды беларускага народа. У тэксце дагавора нават не згадвалася пра беларускую тэрыторыю. Для Літвы гэта быў добры падарунак. Дагавор стварыў юрыдычную аснову для яе прэтэнзій на Вільню і частку беларускіх зямель. Савецкі бок хвалявалі толькі яго ўласныя інтарэсы. Факт заключэння дагавора ўзрушыў беларускіх нацыянальных дзеячаў, бо ён непасрэдна датычыўся беларускіх зямель. Урад БНР апынуўся ў складанай сітуацыі. Зразумела, ён не мог прызнаць дагавор, у якім зусім адвольным чынам былі акрэслены межы, якія не ўлічвалі ні этнічныя, ні геаграфічныя паказчыкі, ні волі народа. Аднак у той канкрэтнай палітычнай сітуацыі беларускія нацыянальныя дзеячы вымушаны былі прызнаць савецка-літоўскі дагавор, але пры некаторых умовах, на якія згадзіўся літоўскі бок.

Такім чынам, Савецка-літоўскі дагавор па сваім значэнні для Беларусі знаходзіцца ў адным шэрагу з такімі актамі, як Брэсцкі (1918) і Рыжскі (1921) мірныя дагаворы, што былі заключаны без удзелу беларускіх прадстаўнікоў і адыгралі негатыўную ролю ў беларускай гісторыі. Савецка-літоўскі мірны дагавор стварыў юрыдычную аснову для прэтэнзій Літвы на Вільню і частку беларускіх зямель. Карыстаючыся палажэннямі гэтага дагавору, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР у кастрычніку 1939 г увогуле прыняў рашэнне аб перадачы Літве Вільні і Віленскай вобласці.

**Выкарыстаныя крыніцы і літаратура**

Среди других наиболее значимых законодательных актов, принятых Верховным Советом в 1994 г., следует отметить Постановление «Об амнистии субъектов хозяйствования Республики Беларусь, хранящих свои средства на счетах за пределами Республики Беларусь», Закон «О предупреждении инвалидности и реабилитации инвалидов», Постановление «О мерах по обеспечению своевременного исполнения Закона Республики Беларусь “О языках в Республике Беларусь”», «О Национальном архивном фонде и архивах в Республике Беларусь», Законы «О связи», «О политических партиях», «Об общественных объединениях» и др. Был ратифицирован ряд Соглашений о торгово-экономических отношениях с другими странами, устанавливались дипломатические отношения.

Большое значение имело постановление Верховного Совета «О Программе неотложных мер по выходу экономики Республики Беларусь из кризиса», принятая по предложению Президента в конце сентября 1994 г. Таким образом, Верховный Совет Республики Беларусь XII созыва внес достойный вклад в становление новой белорусской государственности, налаживание новых социально-экономических отношений в стране. По существу, он стоял у истоков формирования и конституционно-законодательного закрепления современной суверенной Беларуси.

Победе А.Г. Лукашенко на президентских выборах в значительной степени способствовала его работа в 1993–1994 гг. во главе Временной комиссии Верховного Совета XII созыва. Парламентское расследование – особая форма деятельности парламента. К ней

прибегают как к чрезвычайной мере парламентского вмешательства в события, вызвавшие острый резонанс в обществе и затрагивающие интересы государства, расследованием которого общество чрезвычайно недовольно. Утверждается специальная парламентская комиссия из представителей различных депутатских групп, которые не имеют отношения к данным событиям и могут дать объективное заключение. Устанавливаются сроки расследования и полномочия комиссии. Комиссия работает под контролем парламента, в рамках предоставленных полномочий и регулярно отчитывается на заседаниях парламента.

Верховный Совет XII созыва, избранный в 1990 г., работал, как мы отмечали, в необычных, политически острых условиях. Распадался Советский Союз, и необходимо было правильно сориентироваться в быстро меняющихся условиях. В стране галопировала инфляция, безудержно росли цены, с прилавков исчезали продукты и товары первой необходимости. Налицо был кризис власти, которая не справлялась с этими негативными процессами. В то же время в Беларуси получили развитие рыночные отношения: возникали коммерческие организации, в городской пейзаж вписывались многочисленные коммерческие киоски («комки»). Воспитанная на негативном отношении к частной собственности, как результате грабежа простых людей, к торговле как к спекуляции, значительная часть населения считала, что коррупция (ее часто называли «мафией») проникла во все государственные органы власти и, в результате, чиновники вкупе с ловкими дельцами беззастенчиво обогащаются за счет катастрофического обеднения масс. Серьезным поводом для парламентского расследования послужило и возникновение коммерческих структур при государственных предприятиях в качестве посредников между ними и потребителями их продукции. Посреднические фирмы сами определяли цены на реализуемую продукцию и, естественно, значительно обогащались. Повсеместно зрело убеждение, что власть в стране стала мафиозной, коррумпированной.

Верховному Совету, который в то время стал высшей властью в стране, надо было отвечать людям, вмешаться в события. В ноябре 1992 г. на X сессии Верховного Совета XII созыва прошли первые парламентские слушания по вопросу развития в стране организованной преступности и коррупции. С докладами выступили и.о. Ге-

нерального прокурора Республики Беларусь В.К. Кондратьев и Председатель КГБ генерал Э.И. Ширковский. Примеры, приведенные докладчиками, создали у депутатов потребность всесторонне и глубоко оценить опасную тенденцию. С этой целью 4 июня 1993 г. после обсуждения Верховный Совет принял постановление «О создании Временной комиссии Верховного Совета Республики Беларусь для изучения деятельности коммерческих структур, действующих при республиканских и местных органах власти и управления» [14, л. 5]. В состав Временной комиссии вошли депутаты С.А. Антончик, Е.М. Глушкевич, П.И. Дробышевский, В.Ф. Кучинский, Г.М. Лавицкий, М.А. Маринич, Ф.Ф. Минько, В.И. Сорокин. Возглавил Временную комиссию депутат А.Г. Лукашенко.

Комиссии предоставлялись широкие полномочия. Депутаты были весьма «размашисты», так как видели в комиссии воплощение своей политической воли, своего властного верховенства в стране и были уверены, что смогут полностью контролировать ее деятельность. Постановление предусматривало, что члены Временной комиссии при исполнении своих служебных обязанностей будут иметь право входа и беспрепятственного доступа во все государственные и общественные органы, предприятия, учреждения и организации, а также коммерческие структуры, знакомиться в полном объеме со всей документацией, которая требуется при проведении проверок, получать от служебных лиц и других работников необходимые сведения и письменные объяснения по вопросам их деятельности.

Правительству, Прокуратуре, Национальному банку, министерствам и ведомствам республики, местным Советам, их исполнительным комитетам предписывалось всемерно содействовать работе Временной комиссии, обеспечивать предоставление ей достоверной информации, оказывать необходимую помощь в выполнении возложенных на комиссию функций [там же, лл. 5, 6, 146]. Временной комиссии предписывалось проинформировать о результатах своей работы Верховный Совет на очередной сессии. Однако срок деятельности Комиссии определен не был.

14 декабря 1993 г. Александр Лукашенко впервые вышел на трибуну Верховного Совета с докладом о проделанной Временной комиссией работе [15, лл. 21, 23-46]. Часовой доклад Лукашенко, а

затем бурное трехдневное его обсуждение привлекли огромное внимание со стороны населения страны.

Он сразу заявил о творящемся в стране беспределе, который вызывает тревогу «за судьбу государства и его граждан», о сложившейся системе, «в которой все продается и покупается, где правят бал корысть, чистоган, жажда наживы и рвачества», где появились «мафиозные кланы и коррумпированные группировки». Комиссия выявила, что частный бизнес в Беларуси начал создаваться в недрах государственного сектора экономики, что привело к слиянию двух «принципиально разных форм». В результате, подчеркнул оратор, в стране «начался опустошительный разгул узаконенной спекуляции». Еще в 1992 г. милиция выявила в республике более 40 руководителей, которые совмещали государственные должности с коммерческой деятельностью. В ходе развернувшейся дискуссии некоторые депутаты попытались разобраться в объективных причинах нарастания коррупции в государственных эшелонах власти и управления. Они говорили о том, что деятельность коммерческих структур при государственных структурах была разрешена самим же Парламентом. Поэтому, по их мнению, «вина Верховного Совета в развитии процессов коррупции заключается, прежде всего, в создании уродливых, противоречивых законов, которые легко обойти, медлительностью в создании цельной правовой базы», «мы своими решениями создали условия для коррупции», «самое главное условие для коррупции дает сегодня кредитная политика нашего государства». Представители оппозиции причиной коррупции в Беларуси назвали «отказ от проведения самостоятельной, ответственной государственной политики, создание уродливой экономической системы»; «отказ Верховного Совета и Правительства от проведения последовательной политики по реформированию экономики не позволяет упорядочить отношения собственности» [16, лл. 29, 35, 53, 54, 55]. 26 января 1994 г., на повестку дня сессии Верховного Совета был поставлен вопрос «Об освобождении от должностей Председателя Верховного Совета Республики Беларусь С.С. Шушкевича и Председателя Совета Министров Республики Беларусь В.Ф. Кебича» [17, л. 2]. По итогам тайного голосования за отзыв С.С. Шушкевича с поста Председателя Верховного Совета Республики Беларусь высказалось 209 депутатов из 250 принявших в голосовании, то есть 83,6%, против – 36, то есть 14%. За освобождение

В.Ф. Кебича с поста Председателя Совета Министров Республики Беларусь высказался 101 депутат из 281 проголосовавшего, то есть 36%, против 175, то есть 62,3% [18, л. 52]. Таким образом, С.С. Шушкевич покинул место спикера Парламента, а В.Ф. Кебичу удалось сохранить свое место.

В постановлении Верховного Совета от 26 января 1994 г. по докладу Временной комиссии [47] были также определены меры, направленные на устранение негативных явлений в обществе, в том числе даны поручения Совету Министров, Прокуратуре, правоохранительным органам, местным Советам народных депутатов. Временной комиссии было поручено «внести на текущую сессию Верховного Совета предложения об освобождении от занимаемых должностей лиц, избираемых или назначаемых Верховным Советом, дискредитирующих органы государственной власти и управления, в связи с фактами, приведенными в докладе Временной комиссии Верховного Совета Республики Беларусь для изучения деятельности коммерческих структур, действующих при республиканских и местных органах власти и управления».

**Использованные источники и литература**

1. Бущик, В.В. Человек и общество в условиях социально-политических преобразований / В.В. Бущик. – Минск: Перспектива, 1999. – 279 с.

2. Василевич, Г.А. Белорусское государство на рубеже веков / Г.А. Василевич. – Минск: Экономика и право, 2008. – 468 с.

3. Курьянович, А.В. Конституция независимой Беларуси: разработка, проекты, принятие / А.В. Курьянович // Иппокрена. – 2008. – № 2. – С. 20-31.

4. Народная газета. – 1994. – 5-7 лют.

5. Народная газета. – 1994. – 22 лют.

6. Национальный архив Республики Беларусь за 1992 г. – Фонд 98. – Оп. 1. – Д. 3293.

7. Национальный архив Республики Беларусь за 1993 г. – Фонд 98. – Оп. 1. – Д. 3210.

8. Национальный архив Республики Беларусь за 1993 г. – Фонд 98. – Оп. 1. – Д. 3269.

9. Национальный архив Республики Беларусь за 1993 г. – Фонд 98. – Оп. 1. – Д. 3270.

10. Национальный архив Республики Беларусь за 1993 г. – Фонд 98. – Оп. 1. – Д. 3283.
11. Национальный архив Республики Беларусь за 1993 г. – Фонд 98. – Оп. 1. – Д. 3293.
12. Советская Белоруссия. – 1990. – 29 июл.
13. Советская Белоруссия. – 1993. – 23 дек.
14. Советская Белоруссия. – 1994. – 4 янв.
15. Советская Белоруссия. – 1994. – 7 дек.
16. Советская Белоруссия. – 1994. – 21 янв.
17. Советская Белоруссия. – 1997. – 19 мар.
18. Хоцей, А. Теория общества: в 3-х т. / А. Хацей. – Казань, 2002. – Т. 3, кн. 2. – 157 с.
19. [Электронный ресурс]. – 2009. – Режим доступа: http://pravo2000.by.ru/baza33/d32559.htm – Дата доступа: 09.07.09.
20. [Электронный ресурс]. – 2009. – Режим доступа: http://lawbelarus.com/repub/sub31/texg1523.htm – Дата доступа: 10.07.09.

## ПРОЛЕТКУЛЬТ И ОКТЯБРЬСКАЯ РЕВОЛЮЦИЯ 1917 Г.

Давидович А. В., кандидат исторических наук, доцент;
Киселёва С.А., старший преподаватель

Поступательное развитие человечества находит свое глубокое выражение в прогрессе культуры. Смена исторических эпох является сменой одного типа культуры другим. Октябрьская революция 1917 г. вызвала активный поиск нового в культуре. Несколько десятилетий после нее стали периодом появления большого количества экспериментов, опытов, временем формирования новых взглядов на культурное развитие в Советской России.

Интересным этапом культурного развития этого революционного времени было создание и работа Пролеткульта, который стал одним из символов эпохи. Пролеткульт – это массовая культурно-просветительская и литературно-художественная организация пролетарской самодеятельности при наркомате просвещения, существовавшая с 1917 по 1932 гг.

Культурно-просветительские организации пролетариата начали появляться сразу после Февральской революции. Первая их конфе-

ренция, положившая начало Всероссийскому Пролеткульту, была созвана А.В.Луначарским[1] в сентябре 1917 г.

После Октябрьской революции Пролеткульт очень быстро вырос в массовую организацию, имевшую свои филиалы в ряде городов. К лету 1919 г. существовало около 100 организаций на местах, в которые входило около 80 тыс. человек, в основном рабочих, издавалось 20 журналов и газет. Организация ставила перед собой ряд задач: создать новую пролетарскую культуру, используя буржуазную культуру прошлого, развивать пролетарскую науку, усилить подлинно товарищеские отношения в пролетарской среде, разработать пролетарскую философию и подчиненить искусство интересам пролетариата.

Пролеткульту благоприятствовало то обстоятельство, что А.В. Луначарский, симпатизировавший ему, стал наркомом просвещения РСФСР. От Наркомпроса Пролеткульт получал значительную финансовую помощь на мероприятия по ликвидации неграмотности, на собирание фольклора, организацию рабочих клубов, литературных студий и рабочих университетов.

Идеологами Пролеткульта были А. А. Богданов[2], А.К. Гастев, В.Ф. Плетнев, П.М. Лебедев (Керженцев) и другие, исходившие в своих взглядах и деятельности из определения «классовой культуры», сформированного Г.В. Плехановым. Главной целью организа-

---

[1] Луначарский Анатолий Васильевич (11.11.1875-26.12.1933 гг.), советский государственный деятель, теоретик искусства и литературы, критик, писатель и драматург. Организатор советской школы, системы высшего и профтехобразования, перестройки научных учреждений, театра и кино. После Октябрьской революции нарком просвещения. В 1929 г. председатель Ученого комитета при ЦИК СССР, академик АН СССР (1930 г.)., с 1933 г. полпред СССР в Испании [1; с. 739].

[2] Богданов Александр Александрович (настоящая фамилия Малиновский) (22.08.1873-7.04.1928) – экономист, философ, политический деятель, ученый естествоиспытатель. Окончил медицинский факультет Харьковского университета (1899 г.). С 1903 г. в партии большевиков. В 1905-1907 гг. сотрудничал в редакциях большевистских печатных органов «Пролетариат», «Вперед» и т.д. После Октябрьской революции, являлся почетным членом Комакадемии. В 1919 г. стал идеологом Пролеткульта со своей концепцией «чистой» пролетарской культуры, создаваемой только самими пролетариями, с отрицанием культуры прошлого. В 1926 г. организовал и возглавил первый в мире Институт переливания крови. Умер в результате эксперимента по переливанию крови, поставленном на самом себе [2, с. 150].

ции декларировалось развитие пролетарской культуры. По мнению А. Богданова, любое произведение искусства отражает интересы и мировоззрение только одного класса и поэтому непригодно для другого. Следовательно, пролетариату требуется создать «свою» собственную культуру с нуля. По Богданову, пролетарская культура – динамичная система элементов сознания, которая управляет социальной практикой, а пролетариат как класс ее реализует.

Гастев А. рассматривал пролетариат как класс, особенности мировосприятия которого диктуются спецификой каждодневного механического, стандартизированного труда. Новое искусство должно раскрыть эти особенности посредством поиска соответствующего языка художественного высказывания. «Мы вплотную подходим к какому-то действительно новому комбинированному искусству, где отступают на задний план чисто человеческие демонстрации, жалкие современные лицедейства и камерная музыка. Мы идем к невиданно объективной демонстрации вещей, механизированных толп и потрясающей открытой грандиозности, не знающей ничего интимного и лирического – писал Гастев в работе «О тенденциях пролетарской культуры» (1919) [3, с. 53]. Лидеры и творческие силы Пролеткульта последовательно выступали за то, чтобы новое искусство служило революции, отражало и воспевало революционную действительность. Они отстаивали принцип идейности и классовости революционного искусства, боролись против модернистского искусства, против декадентов как «организаторов жизненного распада», хотели, чтобы пролетариат изсвоих рядов выдвигал мастеров искусства.

Но во взглядах идеологов организации таких, например, как А. Богданов (руководитель Пролеткульта до 1920 г.), о путях и методах строительства новой художественной культуры, ее идейно-эстетической основе, немало было такого, что вызывало резкие споры даже в то революционное время.

Одной из основ идейно-культурной платформы Пролеткульта был богдановский тезис: «Художник смотрит на мир глазами своего класса». В теории и практике Пролеткульта он служил исходной позицией для выводов о том, что можно создать «чистую» пролетарскую культуру и «особое» пролетарское искусство. Теоретики Пролеткульта считали, что партийность художественного творчества определяется подсознанием художника. А идейное содержание

художественного произведения – не плод творческих исканий художника, а результат фатально действующего механизма классовой духовной наследственности. Отношение Пролеткульта к проблеме культурной преемственности и культурному наследию составляло важное звено в идейно-эстетической позиции членов организации. Известный призыв пролеткультовцев «Во имя нашего завтра сожжем Рафаэля» был больше политической бравадой, чем серьезным намерением. Но отдельные представители движения видели в культуре прошлого лишь «развалины и гнилую труху».

Конечно, идеологи и лидеры Пролеткульта понимали прогрессивное значение завоеваний прошлого. Но их ошибочные теории о «пролетарской культуре» вели к разрыву с реалистической традицией культурных достижений прошлых веков.

Деятели Пролеткульта шли дальше и отрицали необходимость профессионализма в художественном творчестве, как якобы «барской прихоти», что особенно ярко проявилось в театральной платформе этой организации. Теоретической основой этих взглядов была книга П.М. Лебедева (Керженцева)[3] «Творческий театр», вышедшая в 1918 г. В соответствии с ней пролеткультовцы считали, что надо полностью отменить прежнее сценическое искусство, создать новый театр вне всяких связей с традициями профессионального сценического искусства, да еще силами только пролетариев, которым не надо учиться, а нужно лишь творить [3, с. 101].

Идеологи Пролеткульта допускали серьезные ошибки в понимании личности художника в творчестве. Они утверждали, что в художественном творчестве личность художника не имеет особого значения, потому что здесь на первом месте должен стоять, по терминологии А. Богданова, «автор – класс», «автор – коллектив». Исходя из этого, к художнику предъявлялись жесткие нормативные требования полной регламентации его творчества в рамках только «коллективного опыта», отказывая художнику в свободе творчества, проявляя аб-

[3] Керженцев Платон Михайлович (наст. фамилия Лебедев) родился 4(16).08.1881. Советский государственный и партийный деятель, историк. Член партии большевиков с 1904 г. Учился на историко-филологическом факультете Московского университета. Участвовал в революции 1905-1907 гг. С 1912 г. корреспондент газеты «Правда» в эмиграции. В 1919-1920 гг. ответственный руководитель РОСТА и один из идеологов Пролеткульта. С 1918 по 1926 гг. полпред в Швеции и Италии [4, с. 576].

солютную нетерпимость к «инакомыслящим». Такие элементы художественного творчества, как талант, вдохновение, новаторство вызывали протест и иронию пролеткультовцев, поскольку эти качества, по их убеждению, должны быть достоянием лишь коллектива.

Ошибки и заблуждения Пролеткульта происходили не только из-за ошибок его лидеров и незрелости самого пролеткультовского движения, они отражали культурную незрелость рабочего движения. Принципиальной ошибкой так же было убеждение, что все проблемы «революционной» культуры можно решить быстро и радикально «волевыми приемами». В начале 20-х г. в связи с обсуждением всех вышеизложенных вопросов в обществе возникали особенно горячие споры и дискуссии. За выступлениями, тезисами, статьями и книгами кипели политические страсти, вырисовывались программы преобразования человека и действительности. А вместе с тем, большинство теорий, претендовавших тогда на внедрение в живую практику культурного строительства, по сути дела были далеки от жизни, носили отвлеченный, умозрительный характер.

Теоретическая платформа Пролеткульта, конечно, оказывала отрицательное влияние на массовые мероприятия по культурному воспитанию и образованию трудящихся широко проводимые в то революционное время в стране. Тем не менее, вне движения пролеткультов нельзя даже представить себе истории культурного развития в государстве в первые годы советской власти. Однако, во многом стихийное, возникшее в годы революции, отражающее давно назревшую тягу народа к знаниям и искусству, движение пролеткультов, если говорить о его рядовых участниках, чаще всего не имело ничего общего со взглядами своих идеологов. Низовые организации в своей повседневной работе не связывались с умозаключениями теоретиков Пролеткультовского центра. Они носили чисто просветительский характер и называли себя Пролеткультом, чаще всего не имея о нем никакого представления, а просто воодушевляясь яркой идеей пролетарской культуры.

Вместе с тем, не все в практическом опыте пролеткульта надо безоговорочно отбросить. Сейчас, с высоты пройденных десятилетий, необходимо разобраться в том, что же конкретно внесло это движение (рядовые участники которого просто тянулись к культуре и были далеки от теоретических споров) в культурное развитие народа и страны. Прежде всего, бросается в глаза масштаб распро-

странения звеньев цепи Пролеткульта от фабрично-заводской ячейки до районного, городского и губернского пролеткультов во главе с Советом и постоянно действующим Президиумом. Число пролеткультов продолжало неуклонно расти и деятельность этой организации приобретала международный характер.

Во время Второго конгресса III Интернационала, проходившего 7 августа 1920 г. в Петрограде, было организовано Международное временное бюро Пролеткульта, избравшее исполнительный комитет во главе с председателем А.В. Луначарским.

Бюро выпустило манифест «Братьям пролетариям всех стран», в котором говорилось, что главной своей задачей организация считает распространение принципов пролетарской культуры, создание организаций Пролеткульта во всех странах и подготовку Всемирного конгресса Пролеткульта [5, с. 321]. Но дальше манифеста дело не пошло и эта деятельность впоследствии не имела развития.

Городские – в крупных промышленных центрах, и губернские пролеткульты имели самые различные отделы: инструкторско-агитационный, клубный, литературно-издательский, музыкально-вокальный, театральный, научный, финансовый, физического развития и профессионального знания и т.д. В трудных экономических условиях гражданской войны в 1919 г. в Советской России действовало специальное издательство и выходило в свет пятнадцать периодических журналов Пролеткульта. Наиболее значительными из них были: «Пролетарская культура», органы Петроградского и Московского Пролеткульта журналы «Грядущее» и «Горн» и другие. Кроме того, было выпущено большое количество сборников пролетарской поэзии и прозы. Пролеткульт разработал и проводил в жизнь обширную программу строительства самодеятельного пролетарского театра, который мыслился как своеобразный центр эстетического воспитания трудящихся. Заметным явлением в культурной жизни Советской России был Первый Рабочий театр Пролеткульта, где работали С.М. Эйзенштейн, И.А. Смышляев, И.А. Пырьев, М.М. Штраух, Э.П. Гарин, Ю.С. Глизер и другие.

Наибольшая активность Пролеткульта приходится на время Октябрьской революции и два десятилетия после него. Поворотным этапом в жизни Пролеткульта стала резолюция ЦК РКП (б) от 1 декабря 1920 г. «О Пролеткультах». После нее эта творческая, самодеятельная организация была подчинена контролю партийных и

государственных органов. Пролеткульт оказался лишним звеном в формирующейся тоталитарной системе. После 1920 г. движение постепенно пошло на убыль. Начиная с 1925 г. и до своей окончательной ликвидации в 1932 г. деятельность Пролеткульта преимущественно связывалась с кружковой, клубной работой профсоюзов [5, с. 201]. А впоследствии была заменена Союзом художников, писателей, театральных деятелей, которые находились под жестким контролем партийных органов.

**Использованные источники и литература**

1. Луначарский А.В. // Советский энциклопедический словарь. – М.: «Советская Энциклопедия», 1979. – 1600 с.

2. Богданов А.А. // Советский энциклопедический словарь. – М.: «Советская Энциклопедия», 1979. –1600 с.

3. Лейзеров, Н.А. В поисках и борьбе: из истории эстетических воззрений и эстетического воспитания в советской России / Н.Л. Лейзеров. – М.: «Искусство», 1971. – 191 с.

4. Керженцев П.М. // Советский энциклопедический словарь. – М.: «Советская энциклопедия», 1979. –1600 с.

5. Ким, М.П. Великая Октябрьская Социалистическая революция и становление советской культуры/ М.П. Ким. – М.: «Наука», 1985. – 525 с.

## ПРЫВАТНЫЯ ПРАМЫСЛОВЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У 1921-1923-Х ГАДАХ

Доўнар Л.А.,
кандыдат гістарычных навук

У пачатку 1920-х гадоў неабходнасць аднаўлення гаспадаркі краіны пасля ваенна-палітычных катаклізмаў прымусіла савецкую ўладу адмовіцца ад усеагульнай нацыяналізацыі і вярнуцца да таварна-грашовых адносін. Для фарміравання рынку і наладжвання тавараабмену з сялянамі трэба было павялічыць выпуск прамысловай прадукцыі. Дзяржаўныя прадпрыемствы не маглі хутка справіцца з гэтай задачай. Таму справу па задавальненні асноўных спажывецкіх патрэб насельніцтва павінны былі выканаць прыватныя прадпрыемствы. Дзяржава захавала манаполію на буйную фабрычную вытворчасць і знешні гандаль, таму прыватнік

мог працаваць толькі на дробнатаварных прадпрыемствах з абмежаванай колькасцю наёмных рабочых і арыентавацца на патрэбы ўнутранага рынку.

Становішча прыватных прадпрыемстваў вызначалі адпаведныя заканадаўчыя, выканаўчыя і кантралюючыя органы савецкай улады на цэнтральным і мясцовых узроўнях. Пастанова ЦК РКП(б) ад 14 мая 1921 г. дэкларавала пра "велізарнае значэнне саматужнай прамысловасці ў справе вытворчасці тавараў шырокага ўжытку і садзейнічання сельскай гаспадарцы" [1, с. 42]. Савет Працы і Абароны ў сваім наказе ад 30 чэрвеня 1921 г. патрабаваў ад мясцовых установ кіравання інфармацыю пра тэмпы развіцця саматужнай прамысловасці і ўзровень арганізацыі забеспячэння саматужнікаў сыравінай і сродкамі вытворчасці [4, с. 255-256].

На Трэцім усебеларускім з'ездзе саветаў, які адбыўся 14 снежня 1921 г., было вырашана "падтрымліваць і заахвочваць прыватны пачын у галіне прамысловасці, бо гэта прывядзе да павелічэння даходу дзяржавы і росту прадукцыйнасці прадпрыемстваў". Удзельнікі з'езда вырашылі, што "прыватнай вытворчасці трэба даць свабоду існавання і развіцця" [3, с. 74]. Такім чынам, савецкая ўлада зразумела неабходнасць прыватнай вытворчасці для аднаўлення эканомікі краіны.

У 1921 г. становішча цэнзавай прамысловасці было вельмі цяжкім. З 815 нацыяналізаваных прадпрыемстваў 470 бяздзейнічала, а астатнія нярэдка прастойвалі з-за адсутнасці сыравіны, паліва і няздольнасці дзяржаўных кіраўнікоў наладзіць там вытворчы працэс [2; с. 161]. Таму ў 1921-1922 гг. некаторыя нерэнтабельныя або зруйнаваныя прамысловыя прадпрыемствы зноў вярталіся ў прыватную ўласнасць. Напрыклад, пастановай прэзідыума ВСНГ ССРБ ад 12 лютага 1921 г. былі дэнацыяналізаваны гільзавыя фабрыкі М. Іоф'ева, М. Блінштэйна, М. Саламонава, М. Гандэля, Ш. Эцінгофа, Я. Каца, М. Лібуркіна, І. Флігельмана, Ш. Гільмана [20; с. 126]. Калі нацыяналізаванае прадпрыемства не працавала, але было добра абсталявана, яго здавалі ў кароткатэрміновую арэнду на 1-3 гады. Арандатарамі часта з'яўляліся былыя ўладальнікі. Асаблівым попытам карысталіся гарбарныя заводы. Так, у Мінску свае нацыяналізаваныя гарбарні на ўмовах арэнды атрымалі Х. Фрэнліх [18, с. 18], Сапіра Д. [17, с. 3], О. Ліхтэрман [16, с. 5], Л. Падмаза, у Барысаве – І. Саламонаў, Л. Левін і Р. Гальдсбург, у Бабруйску – С. Немец, І. Фельдман,

М. Гендэльман, Я. Фішэр, І. Каўфман, М. Шнітман [14, 20]. Арандатары павінны былі правесці амартызацыю вытворчасці. Так, Р. Губвід атрымаў свой лесапільны завод у Астрашыцкім Гарадку, даўшы Лескамбелу пісьмовае абяцанне, што ён “праз год поўнасцю яго абсталюе” [12, с. 117]. На арандаваных прадпрыемствах заўсёды было даволі шмат наёмных рабочых. Так, О. Брож, які арандаваў сваю нацыяналізаваную лесапільню ў Мінску, меў 8 пастаянных рабочых і наймаў па 50 сезонных работнікаў [9, с. 4-9].

Мясцовае кіраўніцтва станоўча ацаніла вопыт перадачы непрацуючых прадпрыемстваў былым гаспадарам на ўмовах арэнды. Так, старшыня Выканкама Віцебскага губсавета С. Крылоў у сваім дакладзе “Папярэднія вынікі НЭПа ў Віцебскай губерні” прыйшоў да высновы, што “арэнда выгадна для нас”, і ў Віцебск “ідзе дробны прыватны капітал у асобах былых уладальнікаў вытворчых прадпрыемстваў” [5, с. 3].

У 1922 г. у БССР было дэнацыяналізавана 36 прадпрыемстваў і 172 прадпрыемствы былі здадзены ў арэнду прыватным асобам. У Віцебскай губерні было дэнацыяналізавана 8 прадпрыемстваў і 10 здадзены ў прыватную арэнду. На тэрыторыі Магілёўскай губерніі прыватныя асобы атрымалі ў арэнду 7 прадпрыемстваў [6, с. 63]. Відавочна, што на беларускіх тэрыторыях у складзе РСФСР колькасныя паказчыкі прыватызацыі былі значна ніжэй, аднак тут ішла размова пра больш прыбытковыя прадпрыемствы, чым тыя, што былі ў БССР, бо на кожным з іх працавала ў сярэднім па 24 наёмныя рабочыя [5, с. 2]. Для таго, каб хутка задаволіць спажывецкія патрэбы насельніцтва, знізіць беспрацоўе і, наогул, актывізаваць гаспадарчае жыццё краіны, прыватная вытворчасць была легалізавана.

Юрыдычная працэдура заснавання новага прыватнага прадпрыемства была значна спрошчана. Раней дазваляць ці не дазваляць прыватнай асобе адкрыць вытворчае прадпрыемства вырашалі на пасяджэнні мясцовага Саўнаргаса. Гэта “дазвольная сістэма” была адменена пастановай СНК БССР ад 26 мая 1922 г. Цяпер прадпрымальніку дастаткова было проста зарэгістраваць патэнт на вытворчую дзейнасць у бліжэйшым аддзеле міліцыі, прычым там не мелі права адмовіць у гэтым [8, с. 4]. Кожны прамысловец павінен быў афарміць сваё прадпрыемства ці асобны від прадукцыі пад пэўнай назвай. Да верасня 1922 г. гэта можна было зрабіць у бліжэйшым

саматужпраме, а пазней прадпрымальніку неабходна было звярнуцца непасрэдна ў СНГ БССР. Прамысловец плаціў рэгістрацыйны збор і даваў падпіску аб тым, што “марка не запазычана ў замежных фірм”. На працягу 1922 г. было зарэгістравана 34 прамысловыя прадпрыемствы. Напрыклад, папяросная фарбыка Н. Гітліца мела назву “Карл Маркс”, аналагічнае прадпрыемства Р. Маца звалася “Рэнамэ”, мылаварня С. Нахімаўскага называлася “Кот”, прадпрыемства М. Шалапанава па вытворчасці сахарыну ў таблетках насіла імя “Інтэрнацыянал”.

Маркі 56 відаў прадукцыі прыватных прадпрыемстваў таксама мелі вельмі красамоўныя назвы. Так, папяросы фабрыкі Б. Лейтмана, называліся “Рузвельд”, “Бім – Бом”, “Давай – давай” і “Генуя”. Л. Пржэдмейскі вырабляў мыла “Жук” і “Рэвальвер”, М. Хейфец выпускаў цыкорый пад назвай “Конь пад коўкай” і ячменную каву “Слон”, Б. Уфлянд рабіў яблычны воцат “Экспарт” [13, с. 3–150].

Пасля ліквідацыі Белсаматужпрама **у** жніўні 1922 г. наступіў перыяд адноснай свабоды прадпрымальніцтва [15, с. 5]. Саматужнікі і ўладальнікі дробнапрамысловых прадпрыемстваў атрымалі права свабодна распараджацца прадукцыяй уласнай вытворчасці [7, с. 8]. Аслабленне адміністрацыйнага кантролю дзяржавы за прадпрымальніцкай дзейнасцю садзейнічала павелічэнню колькасці жадаючых стварыць вытворчае прадпрыемства. Напрыклад, у Віцебскай губерніі на працягу 1921 г. штомесяц рэгістраваліся 180 прыватных вытворцаў [5, с. 3].

Згодна з дадзенымі прамысловага перапісу ад 22 снежня 1922 г. у БССР афіцыйна працавала 4846 прыватных прадпрыемстваў, што ў 1,8 разоў больш, чым было ў 1921 г. Сярод прыватных вытворцаў 82,5% лічыліся дробнымі прамыслоўцамі, а 17,4 % адносіліся да саматужнікаў [19, с. 371]. Самым вялікім прамысловым прадпрыемствам была цвікарня Е. Капшэцкага ў Хутарской воласці Ігуменскага павета. Там меўся лакамабіль і працавала 50 наёмных рабочых [158, с. 115]. Сустракаліся прадпрымальнікі, якія валодалі некалькімі прадпрыемствамі. Так, у Б. Геллераз Пухавіч было тры кузні [11, с. 113].

На першае месца па распаўсюджанасці выйшла гарбарная вытворчасць. Цяпер мелася 1286 прыватных прадпрыемстваў гэтай спецыялізацыі, што ў чатыры разы больш, чым у 1921 г. Колькасць аўчыннікаў павялічылася ў два, колькасць гарбарных заводаў у тры, колькасць нарыхтоўшчыкаў – у чатыры разы ў параўнанні з мінула-

годнім паказчыкам. Дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў стала больш на 59,5%, галоўным чынам дзякуючы сталярам. Дарэчы, у анкетах яны рэдка пісалі «сталяр», а называліся ўладальнікамі мэблевых майстэрняў, прадпрыемстваў па вытворчасці венскіх стулаў ці ангельскіх ложкаў. Амаль у два разы павялічылася колькасць кравецкіх майстэрняў, прычым большасць з іх былі вузкаспецыялізаванымі.

На прыгожых шыльдах, намаляваных прыватнымі мастакамі, звычайна пісалася «пашыў дамскіх сукенак», ці «майстэрня мужчынскіх касцюмаў», «белашвейня», ці «пашывачная верхняй зімовай вопраткі». Акрамя таго, у БССР значна павялічылася колькасць мылаварняў, млыноў і цагляных заводаў. У беларускіх паветах, якія знаходзіліся ў складзе РСФСР, таксама адбывалася інтэнсіўнае развіццё прыватнай вытворчасці. У канцы 1922 г. тут было 6 337 прыватных прадпрыемстваў, прычым 36,7 % з іх знаходзіліся ў Гомельскай губерніі.

Дамінуючай галіной з'яўлялася харчовая прамысловасць. Прыватных млыноў тут было ў 1,6 разоў больш, чым у БССР, прычым чвэрць з іх была абсталявана паравымі, газагенаратарнымі ці нафтавымі механічнымі рухавікамі. Самым вялікім прыватным прадпрыемствам у гэтым рэгіёне была ігольня ў Віцебску, якая належыла Э. Левінсану, дзе мелася 43 наёмныя рабочыя і 4 служачыя [9, с. 1].

Нярэдка адзін прадпрымальнік валодаў некалькімі прадпрыемствамі. Так, В. Алебрасаў з вёскі Лугаўская Гарадоцкага павета меў гарбарны завод, дзе рабіў падэшвы для ботаў, і шорную майстэрню, дзе займаўся вытворчасцю конскай вупражы [11, с. 79]. У Віцебскім павеце вялікае распаўсюджанне атрымаў ганчарны промысел, бо тут амаль не выкарыстоўваўся драўляны посуд.

Цікавай асаблівасцю харчовай прамысловасці Гомельшчыны можна назваць наяўнасць там мёдаварняў – прадпрыемстваў па выпрацоўцы медавухі – алкагольнага напою з мёду, хмелю, цукру і вады. Такія прадпрыемствы абсталёўваліся варачнымі катламі, брадзільнымі чанамі і фільтрамі. Палівам служылі сасновыя дровы. На мёдаварнях звычайна працавалі 2-3 наёмныя рабочыя. За месяц на адным прадпрыемстве атрымоўвалася ў сярэднім 392 вядры, або 2 960 літраў медавухі, якую прадавалі за 1372 руб. Самымі знакамітымі былі медаварні братоў Крацер, якія знаходзіліся ў Гомелі на вуліцы Камсамольскай [15].

На беларускіх тэрыторыях, якія знаходзіліся ў складзе РСФСР апрацоўкай металаў, шавецкім і гарбарнымі промысламі было занята ў

два разы больш прадпрымальнікаў, чым у БССР. Прыватных прамысловых прадпрыемстваў, на кожным з якіх працавала ад 6 да 30 наёмных рабочых, у гэтым рэгіёне было ў 3,2 разы больш, чым у БССР.

Такім чынам, ажыўленне прыватнай вытворчасці адбылося ўжо ў першыя гады НЭПа. У 1921-1922 гг. у БССР найбольш інтэнсіўна развівалася гарбарная вытворчасць, а ў беларускіх паветах на тэрыторыі РСФСР галоўнае месца належыла прадпрыемствам па вытворчасці прадуктаў харчавання. У БССР 94 % вытворчых прадпрыемстваў знаходзіліся ў прыватнай уласнасці, 5% належалі дзяржаве і 0,8% – кааператыўным установам. У беларускіх паветах на тэрыторыі РСФСР прыватнаўласніцкімі з’яўляліся 93,5%, дзяржаўнымі – 6,3%, кааператыўнымі – 1,7% вытворчых прадпрыемстваў. Відавочна, што прамысловасць у першыя гады НЭПа пераважна знаходзілася ў прыватнай уласнасці.

На тэрыторыі Беларусі прыватныя прадпрыемствы разнастайнай спецыялізацыі былі распаўсюджаны раўнамерна. Тут не было так званых «саматужных гнёзд» – рэгіёнаў па вытворчасці пэўнага віду прадукцыі, як гэта было ў Ніжагародскай, Маскоўскай, Тульскай, Уладзімірскай і Пензенскай губернях Расіі.

За 1922-1923 гг. валавая прадукцыя прыватнай вытворчасці ў агульным прамысловым абароце павялічылася з 84,6% да 85,7%, у той час як валавая прадукцыя дзяржаўнай прамысловасці панізілася з 14% да 6,2% ад агульнага абароту прамысловасці БССР. Вырабы саматужнікаў былі ў 3-4 разы танней, чым аналагічная прадукцыя дзяржаўных прадпрыемстваў. Так, пашыў нагавіц у дзяржаўным атэлье каштаваў 1 руб. 53 к., а ў прыватнага шаўца толькі 35 к..

У 1923 гг. канчаткова склаўся так званы прыватны сектар эканомікі, куды ўваходзілі скупшчыкі сельскагаспадарчай сыравіны, уладальнікі вытворчых прадпрыемстваў і гандляры, што забяспечвалі збыт прадукцыі. Прыватны сектар эканомікі не перасякаўся з дзяржаўным, што дазваляла ўсім прадпрымальнікам пазбягаць кантролю савецкай улады за сваёй дзейнасцю. У гэты перыяд каля 95% прамысловых устаноў БССР належалі прыватным асобам.

Асноўнымі пакупнікамі прадукцыі прыватных прадпрыемстваў з’яўляліся сяляне, таму ў 1923 г. у сялянскім бюджэце адбылося рэзкае павелічэнне расходаў на прамысловыя тавары. У сярэднім селянін траціў 67 % сваіх грошай на пакупку адзення, абутку, мануфактуры і земляробчага інвентару. Відавочна, што аднаўленне

тавараабмену паміж горадам і вёскай у БССР адбылося дзякуючы развіццю прыватнай вытворчасці.

**Выкарыстаныя крыніцы і літаратура**

1. Архипов, В.А. Борьба партии большевиков против капиталистических элементов в промышленности и торговле / В. Архипов, Л.Ф. Морозов. – М: Изд – во ВПШ и АОН, 1978. – 203 с.

2. Архипов, В.А. Этапы и методы регулирования частного торгово- промышленного предпринимательства / В.А. Архипов // Экономическая политика советского государства в переходный период: сб. науч. ст. / АН СССР, ин – т истории СССР; под ред. П. Ким. – М, 1986. – С. 121–130.

3. Восстановление Народного хозяйства БССР 1921-1925 гг.: сб. документов и материалов. / Главное архивное управление при Совете Министров БССР; Ин – т истории АН БССР; Ин – т экономики АН БССР; Центральный государственный архив Октябрьской революции и социалистического строительства БССР; сост.: Э.Л. Козловская [и др.]. – Минск: “Беларусь”, 1981. – 270 с.

4. Декреты советской власти 1920 г.: сб. документов и материалов./ Ин–т Российской истории РАН; Рос. Центр изучения и хранения документов новейшей истории; сост. Ю.А. Ахапкин [и др.]. – М., Археогаф. Центр, 1998 – 392 с.

5. Крылов, С. Предварительные итоги НЭПа по Витебской губернии / С. Крылов. – Витебск: 1– я гос. тип, 1921. – 38 с.

6. Маразевіч, В. Л. Магілёўшчына ў першыя гады НЭПа / В. Маразевіч // Магілёўская даўніна. – 1991. – № 1. – С. 60 – 64.

7. Медведев, В.Ф. Экономическая роль мелких предприятий в формировании промышленного комплекса / В. Медведев, В. Высоцкий. – Минск: Ин – т истории АН БССР, 1971. – 296 с.

8. НАРБ фонд 15. – Оп. 1. – Д. 28 . Протоколы заседаний СНК БССР 27 декабря 1924 г.

9. НАРБ фонд 30. – Оп. 4. – Д. 121. Подробное обследование кустарного и промышленного производ. в г. Витебске в 1921-1924 гг.

10. НАРБ фонд 30. – Оп. 1. – Д. 1296. Статистические сведения о количестве промышленных заведений в Дрессенском уезде по данным Всероссийской пром. переписи 1922 г.

11. НАРБ фонд 30. – Оп. 1. – Д. 1708а. Список промышленных предприятий БССР за 1922 г.

12. НАРБ фонд 63. – Оп. 1. – Д. 273. Переписка с Белкожем и групповым правлениями СНХ БССР о состоянии кожевенной промышленности, о сдаче в аренду кожевенных заводов (июль – сентябрь 1921 г.).
13. НАРБ фонд 63. – Оп. 1. – Д. 371. Переписка с НКВД БССР об утвержденииитоварных знаков кустарных предприятий (февраль–декабрь 1922 г.).
14. НАРБ фонд 63. – Оп. 1. – Д. 744. Переписка с Центробелсоюзом и уездэкономотделами о сдаче в аренду кожзаводов (29 сентября 1921 г. – 21 марта 1922 г.).
15. НАРБ фонд 63. – Оп. 1. – Д. 834. Сведения о производственной, финансовой и торговой деятельности предприятий кожевенной, деревообрабатывающей и пищевой промышленности БССР за 1922 г.
16. НАРБ фонд 63. – Оп. 1. – Д. 885. Дело о сдаче в аренду кожзавода Лихтермана (1922 г.).
17. НАРБ фонд 63. – Оп. 1. – Д. 887. Дело о сдаче в аренду кожзавода Сапиро (1922 г.).
18. НАРБ фонд 63. – Оп. 1. – Д. 912. Протоколы заседаний бюро президиума и арендной комиссии ВСНХ БССР (9 января 1923 – 25 июня 1924 г.).
19. НАРБ фонд 93. – Оп. 1. – Д. 475. Сведения Наркомфина БССР о промысловом налоге за 2 полугодие 1922 г.
20. Протоколы заседания ВСНХ 1920-1921 гг. М.: Ин–т Российской истории РАН, 2001. – 216 с.

## ФОРМЫ І МЕХАНІЗМЫ ГРАМАДСКАЙ РЭГУЛЯЦЫІ МАЁМАСНЫХ АДНОСІНАЎ У ТРАДЫЦЫЙНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

Карбалевіч Н.М.,
выкладчык

Для беларускай традыцыйнай культуры характэрнымі былі своеасаблівае стаўленне сялянаў да прыватнай і грамадскай уласнасці, а таксама цэлы спектр спецыфічных грамадскіх узаемаадносінаў вакол маёмасці. Рэгуляцыя грамадскіх узаемаадносінаў беларускіх сялянаў вакол маёмасных і эканамічных

пытанняў грунтавалася найперш на агульным разуменні маёмаснай і эканамічнай узаемасувязі ўсіх сялянаў грамады. Спецыфічнае стаўленне да прыватнай уласнасці адзначаецца ў разнастайных формах, якія ў пэўнай ступені адлюстроўваюць рудыментарнае ўспрыманне ўсёй маёмасці грамады як агульнай. У грамадскім стаўленні да прыватнай маёмасці вялікую ролю адыгрываў сітуацыйны кантэкст дзеяння. Найбольш яскрава гэтае адчуванне грамадскага маёмаснага адзінства і ўзаемазалежнасці адлюстроўваецца ў фальклоры – “абы даў Бог людзям, то й мы здабудзем” [21, s. 352]; “зарадзи, Божа, и на крадящего и на прасящаго и на усякаго добраго чаловека” [8, с. 30]. Нават гульнёвы элемент, які фіксуецца ў наступным павер’і, стымуляваў побытавы ўзаемаабмен маёмасцю і адлюстроўвае ідэю агульнай маёмаснай сістэмы: “Вельмі добрэ, калі хто йдучы ў дарогу возьме з сабою з хаты хлеб і соль да ў людзях атдась хлеб другім, а замяст яго і прынясе дамоў чужы хлеб. Той і сам усім скарыстае, і людзі будуць ім давольны” [16, с. 112 – 113].Стаўленне да прыватнай уласнасці ў сялянскім асяродку ілюструе і жартаўлівае – “што з воза впало, то пропало” [2, с. 627], нібыта права ўласнасці настолькі хісткае, што разбураецца, як толькі рэч выпускаецца з рук гаспадара, і кожны цяпер мае на яе права. Трэба таксама адзначыць, што факт і стан валодання пэўнай рэччу ў сялянскай абшчыне беларусаў накладаў на чалавека сацыяльную нагрузку, права валодання несла разам з сабой грамадскі абавязак захоўваць своеасаблівы маёмасны баланс у грамадскім асяродку.

Аналагічны падыход да ўласнасці і абавязку, які вынікаў з факта валодання, можна прасачыць і ў звычаёвым імператыве дармова накарміць падарожнага [17, с. 115]. З гэтых жа меркаванняў, калі цяжарная жанчына ў чужым садзе ці агародзе пачынала есці чужую садавіну ці гародніну, гаспадары не толькі яе не выганялі, але і рабілі выгляд, што не заўважаюць шкоды, каб не напужаць яе і не пашкодзіць дзіцяці [13, с. 8]. Але ў той жа час, каб такое стаўленне да маёмасці і спецыфічны дазвол сітуацыйна браць чужое не моцна шкодзіў гаспадарцы, існаваў культурны механізм адаптацыі да варыятыўнага стаўлення да прыватнай маёмасці. Ён праяўляўся ў функцыяванні ў сялянскім асяродку шэрагу павер’яў, якія імкнуліся перадухіліць вольнае стаўленне да чужой маёмасці, прагназуючы за гэта страшныя наступствы. Напрыклад, існавала павер’е, што калі

цяжарная жанчына любіла карыстацца чужымі рэчамі без дазволу ці крала іх, за выключэннем прадуктаў харчавання, калі яна не з’ядала іх да астачы, яе дзіця абавязкова зробіцца злодзеям [13, с. 5]. Страх нашкодзіць свайму дзіцяці, відавочна, павінен быў ахоўваць ад шкодных дзеянняў цяжарнай жанчыны маёмасць суседніх гаспадарак. Яшчэ адно павер’е, закліканае засцерагчы ад чужыхнабегаў гародніну, да аднамомантавага выядання якой існавала паблажлівае стаўленне ў грамадзе, сцвярджала, што на месцы можна есці гароху, колькі захочаш, але нельга браць з сабой, бо ён загавораны і ты прастаіш на месцы, дзе ён расце, пакуль не прыйдуць гаспадары [13, с. 109].

На падставе стаўлення да ўласнасці і на разуменні грамадскай маёмаснай узаемазалежнасці грунтавалася і сялянскае стаўленне да крадзяжу маёмасці. Выяданне чужой садавіны і гародніны ў месцах, дзе яны растуць, часцей за ўсё трактавалася як крадзеж толькі вонкавымі назіральнікамі. Самі сяляне ў сваёй сістэме зносінаў часцей за ўсё не разглядалі гэты факт як крадзеж. І.А. Сербаў адзначаў, што беспакаранае выкарыстанне чужой садавіны і гародніны з’яўлялася элементам звычаёвага права, але ён таксама заўважаў, што з-за гэтага факту палешукі агародаў і садоў амаль не трымалі [15, с. 39]. Але ў той жа час крыніцы сведчаць, што ў некаторых мясцовасцях выкраданне нават дробнай садавіны і гародніны з’яўлялася недазволеным. Так, М.М. Улашчык пісаў, што “ў вёсцы не кралі, нават дзеці не лазілі па чужых садах і гародах, бо бацькі каралі за гэта вельмі сурова” [17, с. 115]. Паводле матэрыялаў П. Баброўскага, сялянскага хлопчыка, злоўленага ў чужым агародзе, на чужой яблыні, суседзі выкідвалі за весніцы [2, с. 822–823]. Такім чынам, адзначаюцца лакальныя адрозненні традыцыі ў стаўленні да крадзяжу ці выяданню дробнай садавіны і гародніны.

У пытаннях уласна крадзяжу маёмасці сведчанні крыніцаў падзяляюцца на дзве катэгорыі: частка з іх фіксуе факты і распаўсюджанасць крадзяжоў маёмасці паміж сялянамі, іншыя крыніцы падкрэсліваюць, што крадзяжоў практычна не было. Супрацлеглыя адказы на гэтае пытанне могуць утрымлівацца нават у адной крыніцы. Так, І.А. Сербаў ў апісанні сваіх вандровак па Палессі, у дачыненні да адной вёскі прыводзіў свой наступны дыялог з мясцовым старастам: “Почему так у вас все на запоре?” –

“Да кажный ю нас тягне один ю другого усе, що зарвя”, а ў дачыненні да іншай адзначаў, што крадзяжу там практычна не было [15, с. 36, 39].

Але калі крадзяжы здараліся, дык найчасцей іх прычынай была беднасць. М.М. Косіч адзначала, што паміж сялянамі знойдзецца некалькі малазямельных, якія заўсёды гатовыя залезці ў свіран да больш заможнага суседа, ноччу падкапаўшы пад сцяну свірна без падлогі, і скрасці прадукты [9, с. 78–79]. Пры гэтым крадзеж з-за беднасці з’яўляўся зразумелым для сялянаў ці нават апраўдваўся – “ни зарикайся красть: Бох беднысь дасть” [6, с. 15]. Можна лічыць, што дазвол на дробныя крадзяжы прадуктаў харчавання для бедных таксама з’яўляўся своеасаблівай сацыяльнай гарантыяй ці сацыяльнай дапамогай. М. Янчук у дачыненні да пытання крадзяжоў адзначаў, што беларускі селянін “вядома ж, не пойдзе ў хату красці грошы, не ўзламае амбар, не звядзе каня, хіба за рэдкімі выключэннямі; але, напрыклад, чужое дрэва, калі яно не загароджана, трава чужая, асабліва ў лесе, не лічацца недатыкальнымі, і ў гэтым дачыненні нярэдка парушаюцца правы ўласнасці; у асаблівасці памешчыкі часта скардзяцца на крадзеж сялянамі строевага лесу і дроваў з лесу, таксама на патраву лугоў” [20, с. 22–23]. Гэта якраз маляўніча ілюструе спецыфічнае стаўленне да прыватнай уласнасці ў сялянскім асяродку, на якое паўплывалі традыцыі калектыўнага ладу жыцця, адмысловыя формы землекарыстання і супольнага валодання пэўнай маёмасцю ў зачыненым асяродку грамады. Тым не менш павага да права ўласнасці, ашчаднае стаўленне да чужой маёмасці адлюстроўваецца ў фальклоры – “не тки носа ў чужое проса” [19, с. 479], “хто чужога ні шануе, свайго мець не будзе” [21, s. 70], [4, с. 91].

Значным фактарам, які даваў права на маёмасць і замацоўваў яго ў традыцыйнай беларускай культуры, быў фактар працы. Права на зямлю і маёмасць сялянскай гаспадаркі паводле традыцыі мелі не толькі тыя, хто нарадзіўся ў сям’і, але і людзі, якія доўга і добра працавалі ў гаспадарцы – прымакі, здольнікі і інш. [7, с. 132]. Такім чынам, добрая праца селяніна давала яму легітымнае права на зямлю і маёмасць паводле грамадскай традыцыі.

У традыцыйнай беларускай культуры існавалі разнастайныя віды і механізмы рэгуляцыі грамадскіх адносінаў сялянаў, якія ўзнікалі вакол маёмасці. Адметным аспектам традыцыйнай сацыяльнай

культуры беларусаў была грамадская рэгуляцыя пазыковых зносінаў. Пазычэнне маёмасці ў якасці грамадскага дзеяння мела шэраг агульнапрынятых правілаў і заканамернасцяў, асаблівасцяў паводзінаў усіх удзельнікаў. Узаемнае пазычэнне рэчаў было натуральным элементам жыцця сялянскай супольнасці. Сяляне найчасцей пазычалі агонь, калі раптам ён згас у сваім агменю [10, с. 95]; насенне, калі не было грошай яго купіць [11, с. 34–35]; печаны хлеб [13, с. 97], гародніну [13, с. 126] і інш. Але, як адзначаў М.Я. Нікіфароўскі, з усіх прадуктаў сельскай гаспадаркі ніколі не пазычаліся мёд і малако, а даваліся дарам ці прадаваліся, і сама прапанова аб такой пазыцы лічылася крыўднай; а калі малако патрэбнае было для дзіцяці, таго прыносілі ў хату, дзе малако было, і там кармілі [13, с. 152]. Пазычаліся прылады працы і прадметы ўжытку, асабліва рэдкія, якія шляхам пазычэння служылі ўсёй вёсцы, напрыклад, дрывяная і сталярная піла [12, с. 350], жняярка – “такая пазыка лічылася сяброўскаю паслугай, і ўладальнікі жняярак не патрабавалі ні платы, ні адпрацоўкі” [17, с. 56]. Магло здарацца, што пазычаная рэч, калі яна цікавіла ўсіх сялянаў, а яе гаспадар не моцна гэтаму супраціўляўся, пераходзіла ў катэгорыю супольнай грамадскай маёмасці. М.М. Улашчык апісваў падобную сітуацыю так: “Па Віцкаўшчыне хадзіла кніга “Соннік”. Відаць, у яе быў гаспадар, але, па сутнасці, гэтая кніга належала ўсёй вёсцы і бясконца вандравала з хаты ў хату” [17, с. 110]. Існавалі цікавыя асаблівасці пазычэння. Адну з іх акрэсліваў М.Я. Нікіфароўскі: “З усіх прадметаў сельскага ўжытку адна лыжка не купляецца ў суседзяў і не “идет на позыки”: калі яна ўнесена ў чужую хату – лыжка робіцца ўласнасцю гэтага дома” [13, с. 90–91]. Сярод сялянаў існавала таксама перакананне, што калі пазычаеш працоўную хатнюю жывёлу ці пэўныя прадметы хатняга начыння, за іх захаванасцю трэба сачыць, а значыць “пазычаць” і сваю працу ці ўдзел у падзеі – “скатину и пусудину никада у люди ни ‘тдавай биз сябе” [6, с. 114].

Значным элементам маёмаснай рэгуляцыі грамадскіх адносінаў з’яўляліся звычаі, якія замацоўвалі прынцыпы пазычэння і нормы паводзінаў падчас яго. Сістэма грамадскіх узаемаадносінаў, якая будавалася вакол пазычэння, грунтавалася на прынцыпе роўназначнасці – “што людём пазычиш, то и сам палучиш” [6, с. 14]. У той жа час сістэма пазыковых зносінаў была разлічаная

на перспектыву і доўгатэрміновы станоўчы эфект вакол гэтага тыпу ўзаемаадносінаў – “давши жита, праси хлеба” [10, с. 76].

Галоўным прынцыпам рэгуляцыі пазыковых зносінаў беларускіх сялянаў была ідэя абавязковага вяртання пазычанага – “калі вінін, дык аддаць павінін” [4, с. 42]. Гэты прынцып быў абавязковым па-за залежнасцю ад абставінаў. У матэрыялах П.В. Шэйна апісваецца, як селянін перад смерцю пакінуў сваім тром сынам запавет, каб яны аддалі суседзям пазычаныя ім грошы [18, с. 548 – 549]. У той жа час падчас пазычэння каштоўнай рэчы сяляне засцерагаліся нагадваць таму, каму пазычалі, што рэч трэба абавязкова вярнуць, бо, паводле павер’я, калі нагадаць, чорт зробіць усё, каб рэч не была вернутая гаспадару, а наступствам гэта будзе сварка паміж сялянамі [5, с. 110]. Можна меркаваць, што гэты звычай меў і свайго роду прагматычнае прызначэнне – відавочна, што момант пазычэння з’яўлялўся дастаткова далікатнай і напружанай грамадскай сітуацыяй, а забарона нагадваць пра вяртанне пазыкі, што і так было зразумела, была скіраваная на тое, каб не ствараць падставу для дадатковага псіхалагічнага напружання.

Яшчэ адзін звычай вяртання пазычанага праілюстраваны ў працы М.Я. Нікіфароўскага: “Калі бліны пякліся на пазычанай патэльні, дык апошні блін з дадаткам двух-трох іншых адносіцца на патэльні ж да гаспадароў, пры чым патэльня трымаецца не рукамі, а чапялой” [13, с. 99]. Як бачна, калі пазычалася хатняе начынне для прыгатавання ежы, добрым тонам лічылася вяртаць яго з чаткай ежы ў выглядзе частавання, што было дробным падарункам у якасці ўдзячнасці для падтрымання станоўчых узаемаадносінаў і перспектывы далейшага пазычэння.

Праз фальклор у народнай свядомасці сялянаў замацоўваліся ўяўленні пра пазыковыя зносіны, якія былі скіраваныя на зніжэнне ступені сацыяльнай напругі і псіхалагічнага дыскамфорту вакол іх. Напрыклад, народная мудрасць вучыла спакойна і ўзважана ставіцца да адмовы ў пазыцы – “дали – спасиба; ни дали – другоя” [6, с. 25]; а таксама самому не шкадаваць, пазычаючы нешта іншым, бо “калі хто дае што ці прадае другому, а сам шкадуе, та тая рэч не пойдзе ў карысць, а так змарнатравіцца” [16, с. 147].

Народная мудрасць сцвярджала, што “даўно тыя паўміралі, што дарма давалі” [21, s. 75]. Але пазыкі паміж сялянамі маглі адбывацца на розных умовах – нехта пазычаў з умовай проста

вярнуць пазычанае, іншы – з умовай адпрацаваць за пазычанае, а хтосьці даваў патрэбнае на зусім дарэмна [11, с. 34–35]. Як адзначаў Ч.Г. Пяткевіч, для селяніна лягчэй было пазычаць у роўнага сабе па заможнасці суседа, а звяртацца за пазыкай да больш заможнага "багатыра" было нашмат цяжэй [14, с. 641]. Гэтым тлумачылася жаданне сялянаў па магчымасці не пазычаць у "багатыроў": "ни кланиюсь багачу – свайго хлеба намалачу" [6, с. 4].

Сялянская сістэма ўяўленняў грунтавалася на заахвочванні сялянаў пазычаць адзін аднаму неабходныя прадметы, грошы і г.д. – "хто дае, той сам мае" [21, s. 72]. Пазіцыя чалавека, які пазычае, была больш прывабнай для сялянаў, бо заканамерна асацыявалася з заможнасцю – "дай Божа даваць, а ні прасіць" [21, s. 73], "лепі даваць, як прасіць" [4, с. 49]. Існаваў таксама цэлы шэраг павер'яў, якія матывавалі сялянаў удзельнічаць у пазыковых зносінах – даваць пазыкі. Напрыклад, згодна з народнымі павер'ямі, калі нехта просіць пазычыць печаны хлеб, дык абавязкова трэба даць, нават калі гэта апошні і сабе не хапае, у такім выпадку, лічылася, у цябе заўсёды будзе шмат хлеба [16, с. 111], [13, с. 97].

Супольнае пражыванне ў сялянскім асяродку вымагала шчыльнага гаспадарчага, маёмаснага пазыковага ўзаемаабмену, але кожная пазыка так ці інакш абцяжарвала сялянскую гаспадарку. Каб зменшыць гэты цяжар, існаваў цэлы спектр маёмасных пазыковых забаронаў, якія, на першы погляд, мелі выключна сакральны, уяўны, забабонны характар, але калі разгледзець іх сістэмна – вылучаецца іх цалкам прагматычны сэнс, а менавіта – аблегчыць пазыковы цяжар кожнай асобнай сялянскай гаспадаркі, бо выпадкаў і сітуацый, калі можна нешта пазычаць, заставалася не так шмат з улікам усіх забаронаў. Напрыклад, на Вялікдзень нельга было пазычаць камусьці агонь, бо лічылася, што разам з ім з хаты сыйдзе і дабрабыт [10, с. 107]. Катэгарычна нічога нельга было пазычаць у маладзік нават блізкім сваякам, асабліва "вады і цяпла", а калі пазыка была зробленая, лічылася, што хата, з якой пазычылі, на цэлы месяц пераходзіла ў таемную залежнасць ад хаты, у якую пазычылі, – іх дзеці будуць крыўдзіць дзяцей таго, хто пазычыў, хатняя жывёла і птушкі будуць псаваць яго агароды, у той хаце будуць лепш выконваць гаспадарчую працу і г.д., менавіта таму прыстойныя суседзі імкнуліся ў гэты час нічога не пазычаць, а калі без гэтага зусім нельга было абысціся, абавязкова давалі якую-

небудзь пазыку наўзамен [13, с. 218], [12, с. 333]. Лічылася, што калі рыбалоў пазычыць свае прылады, дык ужо не здолее здабыць імі багаты ўлоў [3, с. 35]. Пчаляр не павінен быў нічога пазычаць ці пазычацца ў дзень, калі злавіў рой, бо той зляціць зноў [13, с. 203]. Селянін не павінен быў нічога пазычаць ў першы дзень засеву хлеба ці іншых раслінаў, асабліва самі гэтыя прадукты, бо інакш добры ўраджай пяройдзе да таго, каму пазычылі прадукт ці прадмет [10, с. 92], [13, с. 126]. Катэгарычна нельга было нікому пазычаць агонь з хаты, калі ў гаспадарцы адбывалася талака [1, с. 254]. Пасля нараджэння дзіцяці першыя тры дні нічога нельга было пазычаць з хаты, асабліва агонь, бо дзіця, калі вырасце, будзе цурацца сваёй хаты ці нават зробіцца валацугай [16, с. 176]. Таксама лічылася, што нельга нічога пазычаць у той дзень, калі ацялілася карова, ажарабілася кабыла ці нейкая іншая хатняя жывёла [16, с. 77].

Пазычэнне агню вызывала ў сялян хваравітае стаўленне. У святы агонь не пазычалі, але і ў звычайныя дні звычайна агонь пазычалі з абавязковай умовай вярнуць пазычанае гарачае вуголле адразу пасля развядзення агню ў сваёй хаце, а каб гэта было зроблена, гаспадар, які пазычаў, браў у заклад нейкую верхнюю вопратку ў таго, каму пазычаўся агонь, і калі вуглі не вернутыя ў той жа дзень, вопратка заставалася ў таго, хто агонь даваў [1, с. 254]. Нікіфароўскі М.Я. апісваў пазычэнне агню “Так “у позыку” ідзе ці сам гаспадар, ці гаспадыня, ці хто-небудзь з узроставых, тлумачыць прычыны страты агню, выслухоўвае папрокі і дае зарок у той жа дзень вярнуць “цяпло”, – што з дакладнасцю і выконвае: асабіста і ў тым жа гаршчку, у які прыймаў агонь, адносіць ён “позыку” і ўручае таму, хто выдаваў яе” [12, с. 333].

У гэтым шэрагу трэба адзначыць хоць і меншыя па колькасці, але існуючыя павер’і, якія пазыкі заахвочвалі. Паводле традыцыі, калі пазычаць штосьці прыходзіла цяжарная жанчына, дык абавязкова трэба было ёй гэта даць, бо інакш сам пазбавішся гэтага прадукта ці прадмета, або нешта іншае каштоўнае з’ядуць мышы, [13, с. 5]. Можна меркаваць, што такім чынам праяўлялася ў тым ліку і грамадскае апекаванне максімальна неабароненымі катэгорыямі сялянаў, напрыклад цяжарнымі жанчынамі. Так, лічылася, што і цяжарным жанчынам карысна імкнуцца ўзяць нешта ў пазыку, бо можна патрапіць на чалавека з лёгкай рукой, што будзе добрым і для перыяду цяжарнасці, і для часу нараджэння дзіцяці [13, с. 5].

Такім чынам, формы і механізмы рэгуляцыі грамадскіх узаемаадносінаў вакол маёмасных пытанняў грунтаваліся на своеасаблівым стаўленні беларускіх сялянаў да прыватнай маёмасці і да разнастайных аперацый з ёй. У сялянскім асяродку адзначаецца варыятыўнае стаўленне да паняцця прыватнай уласнасці ў залежнасці ад сітуацыі, выяўляюцца механізмы функцыянавання грамадскай нагрузкі, якую цягнула за сабой факт і стан валодання рэччу. Да права валодання рэччу дадаваўся абавязак падзяліцца ёю з іншымі пры вострай неабходнасці, гэта і з'яўлялася своеасаблівай легітымізацыяй права прыватнай уласнасці. Можна падкрэсліць розную інтэнсіўнасць функцыянавання права на прыватную ўласнасць у залежнасці ад сітуацыі і ад яе грамадскага кантэксту. Трэба адзначыць і варыятыўнасць сацыяльных нормаў, звязаных з маёмаснымі пытаннямі: грамадская думка не лічыла заганным карыстанне чужой маёмасцю, калі гэтага вымагала надзвычайная сітуацыя ці голад. Фіксуецца выразны дуалізм у сялянскім стаўленні да грамадскага кантэксту маёмасных пытанняў. З аднаго боку, адзначаецца цэлы спектр сітуацый грамадскай дабрачыннасці, а, з другога – жорсткая рэгламентаванасць пазыкаў і прынцыпаў іх вяртання. Пазыка, як структурны элемент грамадскіх узаемаадносінаў, з'яўлялася хваравітым і далікатным аспектам грамадскіх стасункаў, чым тлумачыцца і наяўнасць вялікай колькасці павер'яў, якія дробязна рэгламентавалі прынцыпы пазыковых зносінаў і акрэслівалі пазыковыя забароны. Грамадскія ўзаемаадносіны беларускіх сялянаў у маёмасных пытаннях з'яўляліся цікавай і каларытнай часткай традыцыйнай грамадскай культуры.

**Выкарыстаныя крыніцы і літаратура**

1. Анимелле, Н. Быт белорусских крестьян / Н. Анимелле // Этнографический сборник. – 1854. – Вып. II. – С. 111 – 268.

2. Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба: Гродненская губерния / П. Бобровский. – СПб: Типография Департамента Генерального штаба, 1863. – Ч. 1. – XXII, 866 с.

3. Браім, І.М. Рыбалоўства ў Беларусі (гісторыка-этнаграфічны нарыс) / І.М. Браім; рэд. М.Я. Грынблат, АН БССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 136 с.

4. Варлыга, А. Прыказкі Лагойшчыны / А. Варлыга. – Нью-Ёрк, Мюнхен: Выданне фундацыі ім. Пётры Крэчэўскага, 1966. – 112 с.

5. Демидович, П.П. Из области верований и сказаний белорусов. Гл. I. / П.П. Демидович // Этнографическое обозрение. – 1896. – № 1. – С. 91 – 120.

6. Добровольский, В.Н. Смоленский этнографический сборник: в 4 т. / В.Н. Добровольский. – Ч. III: Пословицы. – Санкт-Петербург: Типография С.Н. Худекова, 1894. – III, 137 с.

7. Довнар-Запольский, М.В. Заметки из путешествия по Белоруссии. 1890-1891 / М. Довнар-Запольский // Homo historicus 2009. Гадавік антрапалагічнай гісторыі / пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Вільня: ЕГУ, 2010. – С. 123–205.

8. Косич, М.Н. Литвины-Белорусы Черниговской губернии, их быт и песни / М.Н. Косич // Живая старина. – 1901. – Вып. 3–4. – С. 1–88.

9. Косич, М.Н. О постройках белорусского крестьянина / М.Н. Косич // Живая старина. – 1906. – Вып. 1. – С. 74–93.

10. Крачковский, Юл. Ф. Быт западнорусского селянина / Юл. Ф. Крачковский. – М.: Университетская типография, 1874. – 212 с.

11. Ламака, М. Рысы колектывізму сярод сялян. У дарэволюцыйныя часы / М. Ламака // Наш край. – 1926. – № 10–11. – С. 34—36.

12. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности: Этнографические данные / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская типография, 1895. – [4], VIII, 552, CLIV с.

13. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская Типо-Литография, 1897. – [2], X, 307, 30 с.

14. Пяткевіч, Ч.Г. Рэчыцкае Палессе / Ч.Г. Пяткевіч; уклад.; прадм. У. Васілевіча; пер. з пол. Л. Салавей і У. Васілевіча. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2004. – 672 с.

15. Сербов, И.А. Поездки по Полесью 1911 и 1912 года / И.А. Сербов; издание Северо-Западного отдела Императорского Русского географического общества. – Вильна: Типография Иосифа Завадского, 1914. – [2], 51 с.

16. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі; навук. рэд. А.С. Фядосік; прадм. У.К. Касько; маст. В.Р. Мішчанка. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

17. Улашчык, М.М. Была такая вёска… / М.М. Улашчык // Выбранае. Уклад. А. Каўкі і А. Улашчыка; Навук. рэд. Г. Кісялёў і В. Скалабан; Прадм. І камент. А. Каўкі. – Мінск: “Беларускі кнігазбор”, 2001. – 608 с. [8] с.: іл. – С. 21 – 127.

18. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – Санкт-Петербург: Типография Императорской Академии наук, 1890. – Т. I. Ч. II.: Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – XXXI, 708 с.

19. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П.В. Шейн. – Спб.: Типография Императорской Академии Наук, 1893. – Т. II: Сказки, анекдоты, легенды, предания, воспоминания, пословицы, загадки, приветствия, пожелания, божба, проклятия, ругань, заговоры, духовные стихи и проч. – XX, [1], 715 с.

20. Янчук, Н.А. По Минской губернии: заметки из поездки в 1886 году / Н.А. Янчук. – Москва: Типография А. Левенсон и К, 1889. – 29 с., 130 с., 5 л. нот.

21. Federowski, M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej: materiały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877–1905: w 8 t. / M. Federowski. – Kraków,Warszawa, 1902 – 1981. – T. 4: Przysłowia, żarciki, wyrażenia stałe oraz zagadki ludu, mieszczan i zagrodowców z okolic Grodna, Sokółki, Białegostoku, Bielska, Wołkowyska, Słonima, Nowogródka, Słucka, Lidy, Wilejki, Swięcian i Oszmiany. – Warszawa: Towarzystwo Naukowe Warszawskie, 1935. – XVIII, 490 s.

## ПРАДМЕТНАЕ ПОЛЕ І МЕТАДАЛОГІЯ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ

Кедрык Т.В.,
старэйшы выкладчык

Развіццё гістарычнай навукі ў XX стагоддзі прывяло да з’яўлення цэлага шэрагу новых напрамкаў, адным з якіх стала вусная гісторыя. Паняцце “вусная гісторыя” увайшло ў сусветную гістарыяграфію і навуковую практыку ў другой палове XX ст. Але яшчэ ў 1938 г. прафесар Калумбійскага ўніверсітэта, спецыяліст па

гісторыі Грамадзянскай вайны ў ЗША Алан Нэвінс заклікаў сваіх калег стварыць арганізацыю для сістэматычнага збору і запісу вусных апавяданняў і мемуараў "выбітных амерыканцаў". Вясной 1948 г. па яго ініцыятыве быў створаны Кабінет вуснай гісторыі для запісу мемуараў людзей, якія адыгралі значную ролю ў жыцці Амерыкі. Да 1971 г. супрацоўнікі Кабінета сабралі 2,5 тыс. запісаў гутарак агульным аб'ёмам амаль у 350 тыс. старонак [6, с. 335].

Згодна з перыядызацыяй, прапанаванай амерыканскім даследчыкам Д. Дунавэем, у развіцці вуснай гісторыі на Захадзе можна вылучыць некалькі этапаў. На першым, з 1950-х гг., амерыканскія даследчыкі перш за ўсё збіралі матэрыялы для стварэння біяграфій выбітных грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў. У Францыі члены дэпартаментаў гістарычных камітэтаў па вывучэнні Другой сусветнай вайны запісвалі звесткі пра кіраўнікоў руху Супраціўлення, а ў Мексіцы супрацоўнікі фонаархіваў Нацыянальнага інстытута антрапалогіі збіралі ўспаміны кіраўнікоў Мексіканскай рэвалюцыі.

Другі этап, які пачаўся ў канцы 1960-х гг., характарызуюць спробы стварэння альтэрнатыўнай гісторыі, гэта значыць гісторыі народаў, якія не мелі пісьменнасці.

Пераход ад індывідуальных даследаванняў да калектыўных праектах у сярэдзіне 1970-х гг. сімвалізаваў пачатак трэцяга этапу. У гэты час адбываецца інстытуцыяналізацыя вуснай гісторыі: ствараюцца Міжнародная вуснагістарычная асацыяцыя і нацыянальныя асацыяцыі даследчыкаў, збіраюцца архівы вусных крыніц, шырока праводзяцца канферэнцыі і сімпозіумы, выдаюцца спецыяльныя часопісы. Пытанні вуснай гісторыі пачынаюць разглядацца на міжнародных кангрэсах гісторыкаў, сімвалізуючы збліжэнне пазіцый яе прадстаўнікоў з прыхільнікамі традыцыйнай гістарыяграфіі.

Нарэшце, у 1990-я гг. пачаўся чацвёрты этап, звязаны са з'яўленнем новага пакалення гісторыкаў, далейшым развіццём тэхнічных сродкаў і пашырэннем кола вывучаемых праблем, у тым ліку гісторыі розных палітычных рэжымаў. Найбольш прыярытэтнымі становяцца тэмы, блізкія да антрапалогіі: сюжэты паўсядзённага жыцця чалавека, феномен міграцыі, асаблівасці этнічнай гісторыі народаў, узаемаадносіны палоў і ўзростаў [6, с. 339-340].

Вусная гісторыя прайшла шлях ад метада да самастойнага напрамку гістарычных даследаванняў і стаіць на парозе прызнання ў якасці самастойнай навуковай дысцыпліны. Як і ўсе новыя дысцыпліны і субдысцыпліны, якія сталі актыўна фармавацца ў другой палове XX – пачатку XXI стст., вусная гісторыя мае досыць шмат нявырашаных праблем і пытанняў, якія пакуль што застаюцца без адказаў, пачынаючы ад вызначэння аб’екта і прадмета даследавання і заканчваючы методыкай інтэрпрэтацыі вусных крыніц у гістарычным аповядзе. Найбольш распрацаванымі пытаннямі з’яўляюцца метады даследавання і крыніцы.

Калі казаць пра месца вуснай гісторыі, неабходна пазначыць шэраг падыходаў, у рэчышчы якіх абмяркоўвалася і абмяркоўваецца гэтая дысцыпліна. Першапачаткова, на этапе фармавання вусная гісторыя пераважна разглядалася ў двух іпастасях: вусная гісторыя як крыніца і вусная гісторыя як метад. Зыходзячы з гэтага, месца вуснай гісторыі шукалі альбо ў крыніцазнаўстве, альбо ў тэорыі і метадалогіі гісторыі.

Шырокае распаўсюджанне мае тлумачэнне вуснай гісторыі як крыніцы. У гэтым рэчышчы яе вызначаюць як “практыку навукова арганізаванай вуснай інфармацыі удзельнікаў ці відавочцаў падзей, зафіксаванай спецыялістамі, якія выкарыстоўваюць сучасныя тэхнічныя сродкі” [8, с. 262]. У гэтым сэнсе вусная крыніца выступае часткай “сырога матэрыялу”, які можа быць выкарыстаны пры напісанні гістарычнага даследавання. Але звужэнне паняцця “вусная гісторыя” да крыніцазнаўчай праблематыкі не ахоплівае ўвесь комплекс відаў і формаў навукова-даследчай дзейнасці, што носіць назву “вусная гісторыя”, – прадметнае поле, метады вывучэння гістарычнага мінулага, спосаб гледжання на мінулае, праблематыку і многае іншае.

Да першапачатковых варыянтаў інтэрпрэтацыі вуснай гісторыі адносіцца і асацыяванне яе з метадамі даследавання. У такім выпадку прызначэнне вуснай гісторыі зводзяць да ўдасканалення спосабаў атрымання інфармацыі – розных відаў апытання (гутаркі, інтэрв’ю, анкетавання). Метадычны складнік вуснай гісторыі дамінуе ў практыцы многіх замежных цэнтраў пры ўніверсітэтах, бібліятэках, музеях. Прыкладам з’яўляецца разуменне вуснай гісторыі гукавым архівам Брытанскай бібліятэкі: “У цяперашні час вусная гісторыя атрымала вядомасць як спосаб запісу і захавання

ўнікальных успамінаў людзей, чые ўспаміны маглі быць страчаныя” [Цыт. па: 1, с. 163]. Усё часцей вусную гісторыю пачынаюць разумець значна шырэй, чым крыніцу ці метад даследавання, як самастойны навуковы падыход. У гэтым сэнсе вусная гісторыя выступае як цэлы комплекс дзейнасці, які ўключае распрацоўку навуковай праграмы з пэўнай мэтай, задачай, прадметам даследавання, уключаючы навуковую распрацоўку апытальніка, падбор носьбітаў інфармацыі (з навукова абгрунтаванай выбаркай рэспандэнтаў), дакументаванне атрыманых матэрыялаў, фарміраванне вусных архіваў і, у завяршэнні, фарміраванне культуры інтэрпрэтацыі вусных гістарычных крыніц і прынцыпаў гісторыяпісання на базе або з выкарыстаннем матэрыялаў вуснай гісторыі.

На сучасным этапе адбываецца трансфармацыя вуснай гісторыі як самастойнага напрамку гістарычных даследаванняў у самастойную гістарычную дысцыпліну. Гэтую эвалюцыю адлюстроўваюць многія аўтарскія вызначэння “вуснай гісторыі”, напрыклад, А.І. Філюшкіна: “Сёння пад вуснай гісторыяй разумеецца навуковая дысцыпліна, якая валодае ўласным метадам даследавання – інтэрв’ю, з дапамогай якога ажыццяўляецца фіксаванне суб’ектыўных ведаў асобнага чалавека пра эпоху, у якой ён жыў” [3, с. 2]. Працэс афармлення вуснай гісторыі як самастойнай навуковай дысцыпліны далёкі да завяршэння.

У кантэксце станаўлення вуснай гісторыі як новай дысцыпліны важнейшае значэнне набывае вызначэнне яе прадметнага, храналагічнага, тэматычнага поля даследавання. У шырокім сэнсе прадметам вуснай гісторыі шэраг гісторыкаў прапануюць лічыць “суб’ект гісторыі і суб’ект гістарычных працэсаў – чалавека і чалавецтва ва ўсёй разнастайнасці і шматфактарнасці іх жыцця на часовым адрэзку, які даступны чалавечай памяці, г.зн. нядаўняга мінулага як часткі найноўшай гісторыі”. [10, с. 47] У прадметнае поле ўваходзіць даследаванне ўзаемадзеяння людзей у гістарычных падзеях нядаўняй гісторыі, іх стаўленне да гэтых падзей, іх паводзіны і, уласна, матывацыя і фактары такіх паводзін і, у канчатковым выніку, уяўленні, меркаванні, ацэнкі мінулага. Такі падыход у вызначэнні прадмета вуснай гісторыі вядзе да вельмі шырокага, амаль неабсяжнага поля дзейнасці, што, на думку С.О. Шміта, з’яўляецца паказчыкам “дэмакратызацыі нашых уяўленняў

аб суб'ектах гісторыі: штодзённая гісторыя народа падаецца зараз не менш важнай, чым дзяржаўныя дзеі выбітных асоб; сацыяльна-эканамічная і сацыяльна-культурная гісторыя заслугоўваюць зусім не меншай увагі, чым дзяржаўна-палітычная. Ды і пра падзеі дзяржаўна-палітычнай гісторыі мы пачынаем судзіць, абапіраючыся ўжо не толькі на выказванні і мемуары дзяржаўных дзеячаў і афіцыйную дакументацыю, якія аказваюцца на паверку адкрыта тэндэнцыйнымі... » [9, с. 100].

Адно з сінтэзаваных азначэнняў прадмета вуснай гісторыі дае Д.Н. Хубава. Не адмаўляючы ўсіх падыходаў і лічачы магчымым разглядаць вусную гісторыю і як метад гістарычнага даследавання (інтэрв'ю як дакументаванне элементаў вуснай культуры; працэс фіксавання ведаў, якія перадаюцца ў грамадстве "з вуснаў у вусны"), і як вынік гэтага метаду – створаная гістарычная крыніца вуснага паходжання, яна вызначае вусную гісторыю і як "навуковую дысцыпліну з сумай рэквізіту і паняційнага апарату" [7, с. 5] Аб'ектам жа вывучэння яна лічыць "гістарычны матэрыял, які трансляваны ў вусныя веды і спадчыну" [7, с. 5]. "Вусныя веды" існуюць у выглядзе канкрэтнага жыццёвага вопыту, жыццёвай гісторыі, г. зн. ведаў аб тых рэальных гістарычных падзеях, з'явах, працэсах, удзельнікам якіх чалавек непасрэдна быў. "Вусная спадчына" можа існаваць у выглядзе сямейных паданняў, сельскіх ці гарадскіх легенд і міфаў, альбо ў выглядзе "чутак". Менавіта ў гэтым ключы разглядаюць даследчы прадмет вуснай гісторыі і шэраг замежных гісторыкаў: "Гэта жывая гісторыя, гэта тое, што вакол нас. У кожнага ёсць гісторыя, якую ён бы мог расказаць. Вусная гісторыя – гэта сведчанне з самых першых рук, але гэта таксама і традыцыі і гісторыі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, з вуснаў у вусны" (Калумбійскі універсітэт, Інстытут вуснай гісторыі, ЗША) [Цыт. па: 1, с. 163].

Разам з тым, шматаспектнасць прадмета даследавання вуснай гісторыі і адсутнасць яго дакладных межаў спарадзілі разнастайнасць дэфініцый вуснай гісторыі і яе трактовак. Да яе вызначэння ўжываюцца такія тэрміны як "гісторыя знізу", "штодзённая гісторыя", "камунікатыўная гісторыя", "суб'ектыўная гісторыя", "ментальная гісторыя", "мікрагісторыя", "народная спантанная гісторыя", "слыхавая гісторыя". На фарміраванне разнастайнасці сінонімаў вуснай гісторыі паўплывала спецыфіка

гістарычных працэсаў і з'яў для канкрэтных супольнасцяў, краін, тэрыторый, якія адрозніваюцца сваімі комплексамі сацыяльна-эканамічных і этнапалітычных праблем. Ва ўсе гэтыя паняцці ўкладзеныя розныя сутнасныя рысы, але разам яны адлюстроўваюць глыбінныя метамарфозы самой гістарычнай навукі, якая змяніла пункт погляду ад глабальнага да мікраўзроўню, пашырыла прадметнае поле даследавання, пераарыентавалася з маштабных працэсаў і вялікіх асоб на "шэраговага", "звычайнага" чалавека, яго светаўспрыманне, адчуванні, лёс і месца ў гістарычным працэсе на храналагічна абмежаваным адрэзку нядаўняга мінулага, вымяранага магчымасцямі памяці непасрэдных удзельнікаў і відавочцаў. Такія змены гістарычных даследаванняў змянілі і стыль, і формы працы і прад'явілі новыя патрабаванні і да крыніц, і да саміх даследчыкаў. Вусная гісторыя даволі доўга не прымалася акадэмічнай навукай. Адной з перашкод з'яўлялася псіхалогія акадэмічных гісторыкаў, якія прызвычаіліся да працы ў цішы кабінета, архіва і бібліятэкі.

Але арыентацыя на архіўную дакументальную базу абмяжоўвала магчымасці гісторыі ў вывучэнні найноўшага часу. У XX ст. – часе рэвалюцый, войнаў, кардынальных змен – грамадскасць, спрабуючы разабрацца ў тым, што адбываецца, выступіла заказчыкам аналізу сучасных гістарычных працэсаў. Гістарычныя супольнасці сталі шукаць новыя спосабы і шляхі вывучэння сучаснасці і нядаўняга мінулага. Гэта прымусіла гісторыкаў выйсці са сваіх кабінетаў і звярнуцца да грамадства, якое вакол іх. Вынікам гэтага стала ўвядзенне ў даследчае поле новых праблем і новых тэм, на аснове якіх сфармавалася прадметнае поле вуснай гісторыі – штодзённае жыццё чалавека, яго светаўспрыманне, адчуванне, лёс і месца ў гістарычным працэсе. Увага да асобы ў гістарычнай навуцы існавала і да вуснай гісторыі, але была звернута пераважна да вядомых гістарычны дзеячаў. На этапе станаўлення самастойнасці вуснай гісторыі як навуковай дысцыпліны і яе масавага распаўсюджвання даследчыкі звярнуліся да адчуванняў шэраговага чалавека. Прайшоўшы шлях ад факусіроўкі ўвагі на вядомых гістарычных дзеячах да цікавасці да шэраговага, звычайнага чалавека, вусная гісторыя ў некаторых краінах у апошні час зноў уключыла ў сферу сваёй цікавасці выбітных людзей. Вусная гісторыя вызначылася ў сваёй увазе да суб'екта гістарычных

працэсаў – чалавека і на ніжніх, і на верхніх паверхах грамадскай лесвіцы, а прадметам даследавання сталі яго адчуванні, думкі, ацэнкі, эмоцыі, устаноўкі, жыццёвы вопыт, іх уплыў на гістарычны працэс і ўплыў гістарычных падзей на самога чалавека, яго лёс. У такім кантэксце гісторыя разглядаецца як узаемаабумоўлены працэс, як уплыў гістарычных падзей і працэсаў на чалавека і ўплыў самога чалавека з яго меркаваннямі, ацэнкамі, устаноўкамі, светапоглядам на форму, ход падзей і працэсаў.

Такі падыход да вывучэння гісторыі адлюстроўвае погляд на гісторыю "знутры", цікавасць да суб'ектыўнага боку гісторыі з ухілам у бок найбольш масавага ўдзельніка гісторыі – чалавека "натоўпу", прадстаўніка "народных мас", яго жыццёвы вопыт у гісторыі, бо менавіта ён не пакідае нашчадкам свайго меркавання аб тым, што адбываецца, але менавіта ён адчувае на сабе ўсе наступствы падзей і гістарычных змен. "Погляд знутры" адлюстроўвае адчуванне чалавека ў той эпосе, у якой ён жыве і ўдзельнічае ў гістарычных падзеях і "знутры" распавядае, што і як адбывалася.

Менавіта гэты ракурс (ад аб'ектыўнасці гісторыі да яе суб'ектыўнасці) і выклікаў змены ў метадах, крыніцах і самой дзейнасці гісторыка-даследчыка. Стаўленне да суб'екта гісторыі (чалавека) як аб'екта вуснай гісторыі запатрабавала звароту за інфармацыяй да самога суб'екта. Гэта ўнесла змены ў пазіцыю гісторыка, актывізацыю яго самастойнасці, што выяўлялася ў развіцці метадаў даследавання – апытанні ў розных яго формах (гутарка, інтэрв'ю і г.д.). А адказнае і сур'ёзнае стаўленне гісторыкаў да крыніцы запатрабавала і навуковай прапрацоўкі надзейных спосабаў фіксацыі і ўмоў захоўвання. Толькі забеспячэнне ўмоў надзейнасці дакументавання на ўсіх этапах працэсу стварэння новых крыніц стварыла і ўмовы для вывучэння суб'ектыўнага боку гісторыі – "гісторыі знутры", а не "звонку", з боку. Менавіта такая ўзаемазалежнасць "аб'екта-прадмета-метаду-крыніцы" дазваляе казаць аб фарміраванні вуснай гісторыі як самастойнай гістарычнай дысцыпліны. Менавіта ў вуснай гісторыі ў першую чаргу і рэалізуецца прынцып новага метадалагічнага падыходу – "чалавек у гісторыі, гісторыя ў чалавеку".

Падыход гісторыка-летапісца (акадэмічнага гісторыка) да суб'ектыўнасці камунікатыўных крыніцы філосаф М. Ражанскі

параўноўвае з юрыдычнай практыкай пры допыце сведак, калі па аналогіі са следчым гісторык, працуючы з інфармацыяй, “праводзіць крытычны аналіз крыніц і, адхіліўшы суб’ектыўнасць апавяданняў (асабістую пазіцыю, погляд, стаўленне, меркаванне, ацэнку, успрыняцце і г.д.), спрабуе устанавіць, як было на самой справе”. Традыцыйная метадалогія з патрабаваннем гістарычнай аб’ектыўнасці з’яўлялася і формай існавання гісторыі і мэтай гістарычных даследаванняў: “да гэтага абавязвала заўсёды і прафесія гісторыка, служачага гістарычнай праўдзе” [5, с. 141]. Вусны ж гісторык “суб’ектыўную розніцу аповядаў” робіць прадметам даследавання, спрабуючы не ліквідаваць яе, а наадварот, стымуляваць з дапамогай пытанняў. І такая пазіцыя прафесійна апраўданая, калі разумець, што суб’ектыўны свет – не толькі вынік, але і ўдзельнік гісторыі” [5, с. 141]. Імкненне вуснай гісторыі да ісціны і пошуку праўды “маленькага чалавека” спарадзіла сітуацыю, у якой патрабаванне аб’ектыўнасці, уліку інтарэсаў выбітных і шараговых удзельнікаў гісторыі вядзе да ўзмацнення суб’ектыўнасці ў гістарычных даследаваннях. У адрозненні ад афіцыйнай гістарыяграфіі у форме летапісання для вуснагістарычных даследаванняў суб’ектыўнасць з’яўляецца не перашкодай, а глебай для далейшага руху і пошуку навуковай думкі. Вусная гісторыя распачала спробы стварэння новых адносін паміж гісторыяй і сацыяльнай памяццю, носьбітамі якой з’яўляюцца ўсе шэраговыя ўдзельнікі гісторыі. Акрамя таго вусная гісторыя імкнецца пераадолець “гістарыясофію, якая дамінуе 2 тысячы гадоў у еўрапейскай культуры”, у якой памяць з’яўляецца асновай гісторыі, але, як паказваюць апошнія вуснагістарычныя даследаванні, “уяўляе сабой разрыў гісторыі з памяццю і нават гвалт над ёй” [5, с. 142]

Незадаволенасць традыцыйнай метадалогіяй, якая спарадзіла сучасны крызіс гістарычнай навукі і актыўныя пошукі шляхоў выхаду з яго, замацавалі пазіцыі вуснай гісторыі як навацыйнай дысцыпліны ў сучаснай гістарычнай навуцы. Для вуснай гісторыі з яе імкненнем спасцігнуць прадмет “знутры” бачыцца важным зняць “прынцыповы дуалізм даследчыка і аб’екта даследавання шляхам пранікнення ў прадмет” у адрозненне ад практыкі традыцыйнай метадалогіі, калі даследчык імкнецца адхіліцца ад прадмета даследавання, стаць безкампрамісным суддзёй, даследчыкам

агульных заканамернасцяў і тэндэнцый, глабальных гістарычных працэсаў, важных гістарычных вех. Для вуснага гісторыка важная “цесная ўзаемасувязь паміж даследчыкам і аб’ектам яго даследавання” [4, с. 185].

Прадметна-тэматычнаее поле вуснай гісторыі атрымлівае лагічна аформленую інфармацыйную базу – персанальную памяць і вопыт суб’екта гісторыі як носьбіта “калектыўнай памяці”, “памяці чалавецтва”, “памяці свету” або “гістарычнай памяці”. Менавіта індывідуальны чалавек як грамадская істота, якая ажыццяўляе практычную і пазнавальную дзейнасць з’яўляецца цэнтрам сацыяльнай і гістарычнай памяці чалавецтва, якая выкарыстоўваецца для пазнання мінулага. Дзякуючы чалавечай памяці стала магчымая “гісторыя” як форма адносін чалавека са светам, у якім вялікае значэнне набывае “рэтраспектыўная інфармацыя ў фарміраванні карціны свету” сучаснага чалавека, у тым ліку “успаміны” аб значных для дадзенага стану грамадства гістарычных падзеях [2, с. 68]. Селекцыйныя ўласцівасці сацыяльнай памяці прыводзяць да стратаў элементаў, якія складаюць карціну свету, характэрную для таго ці іншага адрэзку чалавечай гісторыі. Для вуснай гісторыі, у прадметнае поле якой як раз і ўваходзяць “элементы, якія складаюць карціны свету”, важна зафіксаваць іх, каб зразумець знутры той ці іншы адрэзак чалавечай гісторыі. Значнасць гэтай працы вызначаецца тым, што працэсы перадачы сацыяльнай спадчыны, якая разумеецца як “сукупнасць ўсёй сацыяльнай інфармацыі, якой валодалі пакаленні, якія сыходзяць з жыцця” і гісторыка-культурнай спадчыны (у тым ліку і вусныя гістарычныя веды і вусная спадчына), на жаль, “значна менш запраграмаваны, чым працэсы перадачы генетычнай інфармацыі” і нязменнасць праграм іх ўзнаўлення адсутнічае. У выніку “у пэўных сацыяльна-эканамічных умовах грамадства рашуча ломіць гэтыя “праграмы”, што прыводзіць да рэвалюцыйных зрухаў, да перабудовы пануючай сістэмы каштоўнасцяў або да карэнных змен у навуковай і грамадскай карціне свету” [2, с. 62]. XX стагоддзе як раз і ўяўляў сабой моманты ломкі асноўных паняццяў “карціны свету” у любога народа, у любой краіне.

У гэтых умовах і была запатрабавана вусная гісторыя як навуковая дысцыпліна з навукова арганізаванай методыкай

інтэрв'юіравання ўдзельнікаў эпохі ломкі "карціны свету" з мэтай запісу і захавання іх персанальнай памяці і досведу. Зыходзячы з гэтага і прадметнае поле вуснай гісторыі вызначаюць "не ключавыя гістарычныя падзеі або вялікія ідэі, але штодзённае жыццё простых людзей, змены ў іх жыцці і змены ў іх саміх разам з часам унутры часовых адрэзкаў", г.зн. цікавасць да суб'ектыўнага боку гісторыі, да "маленькіх людзей" якія з'яўляюцца "безназоўнымі ўдзельнікамі гістарычных падзей, не заўсёды твораць гісторыю, але адчуваюць на сабе сакрушальную сілу яе колаў". [4, с. 184-185].

Такім чынам, на сучасным этапе ўсё выразней вымалёўваюцца контуры вуснай гісторыі, як дысцыпліны, якая вывучае нядаўняе мінулае праз жыццёвы вопыт, устаноўкі, светаадчуванне шэраговага, масавага ўдзельніка гістарычных падзей і выяўляе ўзаемаўплыў чалавека і гісторыі. Прадметнае поле вуснай гісторыі (oral history) абумоўлена навацыямі гістарычных пошукаў апошніх дзесяцігоддзяў, у тым ліку гуманізацыі і антрапалагізацыі дыскурсу гістарычных даследаваннях.

**Выкарыстаныя крыніцы і літаратура**


1. Дрожецкий, Д.А. Понятие "устная история" в международной практике (по материалам ресурса Интернета) / Д.А. Дрожецкий // Устная история (Oral history): теория и практика: Материалы всерос. науч. семинара (Баранул, 25–26 сент. 2006 г.) / Сост. и науч. ред. Т.К. Щеглова. – Барнаул: БГПУ, 2007. – С. 160-165.

2. Илизаров, Б.С. Роль ретроспективной социальной информации в формировании общественного сознания/ Б.С. Илизаров // Вопросы философии. – 1985, № 8. – С. 60-69.

3. Методические указания по проведению исследований по устной истории / Сост.: канд. ист. наук, доцент А.И. Филюшкин. – СПб.: Изд-во СПбГПУ, 2004. – 18 с.

4. Оболенская, С.В. История повседневности в современной историографии ФРГ. Одиссей: Человек в истории. Исследования по социальной истории и истории культуры / С.В. Оболенская. – М.: Наука, 1990. – С. 182–198.

5. Рожанский, М.А. "Устная история" – философия памяти / М.А. Рожанский // Общественные науки. – 1990. - № 6. – С. 141–150

6. Теория и методология истории: учебник для вузов / Отв. ред. В.В. Алексеев, Н.Н. Крадин, А.В. Коротаев, Л.Е. Гринин. – Волгоград: Учитель, 2014. – 504 с.

7. Устная история: программа курса. / Сост. Д.Н. Хубова. – М.: РГГУ, 1995. – 35 с.

8. Шмидт, С.О. Предпосылки «устной истории» в историографической культуре России / С.О. Шмидт // Реализм исторического мышления. Проблемы отечественной истории периода феодализма. Чтения, посвященные памяти А.Л. Станиславского: Тез. докл. и сообщений. – М.: МГИА, 1991. Т. 1. – С. 262-263.

9. Шмидт, С.О. Путь историка. Избранные труды по источниковедению и историографии. / С.О. Шмидт – М.: изд. РГГУ, 1997. – 612 с.

10. Щеглова, Т.К Устная история: учебное пособие. / Т.К. Щеглова. – Барнаул: АлтПГА, 2010. – 364 с.

## СОДЕРЖАНИЕ И ИТОГИ ИНВЕНТАРНОЙ РЕФОРМЫ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В 1840-1850-Х ГГ.

Лепеш О.В.,
кандидат исторических наук, доцент

Важным событием «российского» периода в истории Беларуси, изменившим вектор правительственной политики 1-ой половины XIX в., стало восстание 1830-1831 гг., после подавления, которого существенно меняется характер и содержание законодательства, образования, культуры и конфессиональной жизни белорусских губерний. Если до 30-х гг. XIX в. преобладала продворянская сословная политика, то после событий 1830-1831 гг. акцент был перенесен с привилегированного сословия на крестьянство. Крестьянство стало рассматриваться российским правительством как наиболее лояльный престолу слой местного общества. Поэтому наблюдается настойчивое стремление императора Николая I разрешить крестьянский вопрос и прекратить процесс разорения как государственных, так и помещичьих крестьян.

Местом выработки основных направлений правительственной политики после шляхетского восстания 1830-1831 гг. становится Комитет западных губерний, созданный императором Николаем I для управления территорией Беларуси, Литвы и Правобережной

Украины. Вопросы, которые рассматривали члены Комитета западных губерний, были связаны с введением на территории Беларуси, Литвы и Правобережной Украины российского законодательства, реорганизацией всей системы образования по российскому образцу, повышением статуса и авторитета православной церкви, проведением «разбора» шляхты. Однако в числе первостепенных задач, стоявших перед членами Комитета, стало урегулирование положения как государственных, так и помещичьих крестьян. Комитет западных губерний стремился к регламентации отношений крестьянства с их владельцами путём ограничения власти местных арендаторов и администраторов для государственных крестьян и путём проведения инвентарной реформы для помещичьих.

На наш взгляд, история проведения инвентарной реформы в Беларуси изучена не до конца, не смотря на то, что в разрешении данного вопроса сделали многое как дореволюционные, так советские и современные исследователи [1, 2, 17, 27, 28, 29]. Поэтому обращение к данной теме способствует её уточнению и ведёт к ликвидации пробелов в исторической науке.

После учреждения в Российской империи в 1837 г. Министерства государственных имуществ, занявшегося устройством государственной деревни, основные усилия Комитета западных губерний, были направлены на улучшение быта помещичьих крестьян. В правительственных кругах считалось, что положение крестьян девяти западных губерний, принадлежавших польским помещикам, было намного сложнее, в особенности в белорусских губерниях, чем крестьян центра России. С этой целью власти решились на проведение инвентарной реформы, суть которой сводилась к составлению инвентарей — документов, которые бы регламентировали поземельные, повинностные отношения между помещиками и крепостными крестьянами. Идея о введении обязательных инвентарей возникла сразу же после рассмотрения отчёта витебского губернатора П.П. Львова за 1839 г. о состоянии Витебской губернии [19]. Описывая расстроенное экономическое положение Витебской губернии, П.П. Львов главную причину этого видел в отягощении помещичьих крестьян несоразмерными повинностями в пользу владельцев. Уже в феврале 1840 г. министр государственных имуществ П.Д. Киселёв, ознакомившись с отчётом, подал записку императору, где говорилось, что вернейшее средство к ограждению помещичьих крестьян от разорения было бы

составление положительных инвентарей. Записка П.Д. Киселёва была внесена в Комитет западных губерний. Николай I и члены Комитета очень сочувственно отнеслись к предложению П.Д. Киселёва, но действовать в этом направлении начали постепенно. Первое заседание Комитета, посвящённое реализации инвентарной реформы, состоялось 16 июля 1840 г. На нём решили, что первоначально инвентари необходимо вводить в имениях, где наблюдалось злоупотребление помещичьей властью. Составление инвентарных правил поручили гр. А.Г. Строганову. Но уже тогда император дал понять высшим сановникам, что он решительно настроен на повсеместное введение инвентарей во всех владельческих имениях, а «ежели из сего будет некоторое стеснение прав помещиков, то оно касается прямо блага их крепостных людей и не должно отнюдь останавливать благой цели правительства» [20]. Министр государственных имуществ полагал, что при составлении этих инвентарей за основу необходимо принимать правила люстрации для казённых имений, но в подобных инвентарях допускалось «некоторое возвышение» в пользу помещика. Император повелел, чтобы инвентари для помещичьих имений западных губерний ему были представлены до 1 сентября 1840 г., в чём глубоко сомневался П.Д. Киселёв. Относительно введения обязательных инвентарей в имениях, взятых в опеку, был издан именной указ в августе 1840 г. [18].

Как и предполагал П.Д. Киселёв, исполнить волю императора за столь короткое время было просто невозможно, поскольку инвентари для казённых имений по новой люстрации на основании правил 1839 г. ещё не были утверждены. Поэтому Комитет западных губерний поручил Министерству внутренних дел и Министерству государственных имуществ написать лишь общие правила для составления инвентарей, а для их применения к каждому имению учредить на местах особые комиссии. На это положение 21 февраля 1841 г. последовало заключение Николая I: «Делом сим не медлить, я считаю его особенно важным и ожидаю от сей меры большой пользы» [21].

Нужно отметить, что в 1840 г. инвентарная реформа не нашла полного одобрения у всех местных властей. Прямо за введение инвентарей высказывались только гродненский губернатор Г.Г. Доппельмайер и правитель Белостокской области Гуранопуло. Виленский генерал-губернатор Н.А. Долгоруков, хотя и признавал поло-

жение помещичьих крестьян «Западного края» худшим, чем великорусских, от прямого ответа отказался: «Не зная цели улучшения, невозможно указать и средств» [1, с. 21].

Минский губернатор Н.В. Сушков отношение помещиков к крестьянам считал столь ненормальным, что боялся, что малейшее распоряжение правительства об улучшении положения помещичьих крестьян возбудит волнения против помещиков. Новоназначенный в 1840 г. виленский генерал-губернатор Ф.Я. Миркович хотя и склонялся в пользу введения инвентареи, но слишком нерешительно: «Следовало бы только на первых порах ограничить самоволие помещиков, ... но при сем необходимо заметить, что применение общего инвентаря ко всем имениям едва ли возможно» [1, с. 22].

Совсем иную позицию занимал киевский генерал-губернатор Д.Г. Бибиков. В начале 1844 г. он ходатайствовал перед министром внутренних дел об ускорении введения инвентарей. На записке император написал: «Я нахожу это предложение весьма важным и дельным» [23]. Записка Д.Г. Бибикова стала основой для изданного Комитетом западных губерний 1 апреля 1844 г. положения о введении инвентарей [24], утверждённого императором и принявшего силу закона 15 апреля 1844 г. Отныне рассмотрение и составление инвентарей поручалось губернским инвентарным комитетам под председательством генерал-губернаторов и в составе губернского предводителя дворянства, вице-губернатора, прокурора, чиновника от генерал-губернатора, а также избранных дворянством губернии трех помещиков и одного уездного предводителя. Комитеты для рассмотрения и составления инвентарей помещичьих имений должны были требовать от помещиков инвентари, рассматривать их, исправлять и дополнять, составлять новые в тех имениях, где их не было. В случае удовлетворительной оценки представляемого в комитеты инвентаря его могли ввести в действие не более как на 6 лет. Впоследствии, проанализировав отчёты инвентарных комитетов, планировалось ввести постоянные инвентари.

Основную часть проекта «Положения» занимали «Правила для руководства при составлении инвентарей». Предусматривая разделение крестьян на тяглых, огородников и бобылей, «Правила» вменяли в обязанность помещикам по возможности уменьшать число крестьян, «которые не имеют сельского хозяйства и домашней оседлости», предоставляя им право по своему усмотрению наделять

крестьян землёй. Повинности крестьян делились на главные (барщина, оброк, сгоны) и добавочные (шарварки, подорощизна, сторожовство, данины, пряжа и др.). Размеры главных повинностей зависели от величины земельного участка, его качества и не должны были превышать 1/3 валового дохода с надела. Добавочные же повинности отбывались как плата за придаточные выгоды, предоставляемые для крестьян владельцами [4]. В 1844 г. во всех западных губерниях были открыты инвентарные комитеты. Однако введение обязательных инвентарей происходило на территории западных губерний по-разному. На территории Правобережной Украины (в Киевской, Волынской и Подольской губерниях) при активном участии киевского генерал-губернатора Д.Г. Бибикова был составлен инвентарь по однообразной форме, включившей в себя общие постановления и нормы. Этот проект инвентарной реформы рассматривался на заседании Комитета западных губерний 13 и 20 мая [25], а 26 мая 1847 г. «Правила для управления имениями по утверждённым для оных инвентарям в Киевском генерал-губернаторстве» были утверждены императором.

В Беларуси и Литве вводили инвентари другим путем — путем составления для каждого имения отдельно. В итоге, в Виленской и Ковенской, Гродненской, Минской губерниях инвентари вступили в действие в 1845, 1846, 1847 гг., а в Могилёвской и Витебской губерниях инвентаризация затянулась до 1857 г., когда вопрос уже был снят с повестки дня в связи с подготовкой отмены крепостного права.

Почему же инвентарную реформу постигла такая судьба в Могилёвской и Витебской губерниях? Изучив архивный материал, можно утверждать, что процессу введения обязательных инвентарей препятствовали местные помещики. Дворянство белорусских губерний воспринимало реформу, прежде всего, как мероприятие по сокращению своих доходов. Сразу же после провозглашения начала инвентаризации дворянство Витебской и Могилёвской губерний попросило назначить более продолжительный срок для составления описей своих имений. Оснований этому у него было два: во-первых, это многочисленные издержки на реализацию будущего переустройства, а, во-вторых, им казалось, что этой мерой можно побудить крестьян к неповиновению [5]. Но генерал-губернатор Витебской, Могилёвской и Смоленской губернии П.Н. Дьяков, исполняя «высочайшую» волю императора, отказал просьбе, считая,

что «сего допустить ни в каком случае невозможно» [14]. Тогда, 5 мая 1845 г. дворянство Витебской губернии послало записку императору по делу об инвентарях. В ней выражалось согласие на «дарование крестьянам совершенной свободы» в случае выплаты ссуды от правительства для поддержки быта крестьян по 15 рублей серебром на душу [14]. Дворяне предлагали учредить Комитет для определения обоюдных прав помещичьих крестьян и владельцев. Крестьяне могли заключать с помещиками договоры по своему усмотрению, а владельцы имели право отстранять крестьян от пользования землёй в случае невыполнения условий договора. По сути, это было первое предложение об отмене крепостного права на территории Беларуси, поступившее от высшего сословия. Нужно отметить, что Николая I очень заинтересовал этот проект. После прочтения записки 16 мая 1845 г. он поручил собрать сведения у всех помещиков Витебщины по вопросу будущего освобождения крестьян. Однако, вероятно, передумал, раз 3 октября 1847 г. из Министерства внутренних дел на имя генерал-губернатора П.Н. Дьякова пришло уведомление, согласно которому император настаивал на продолжении инвентарной реформы [13].

Нельзя полностью отрицать, что после открытия Витебского (1 сентября 1844 г.) и Могилёвского (25 августа 1844 г.) инвентарных комитетов, они не работали. Только дела там шли крайне медленно, что, безусловно, вызывало нарекания со стороны местных властей, министерств и самого императора. Так, уже 19 октября 1844 г. министр внутренних дел критиковал работу Витебского и Могилёвского инвентарных комитетов, считая, что они «вообще мало представляют успеха и удовлетворительности» [6]. Комитеты пытались активизировать действия помещиков, требуя подписку от владельцев о предоставлении инвентарей и устанавливая конкретные сроки на их окончательное предоставление властям. Витебский инвентарный комитет на заседании 14 декабря 1844 г. давал два месяца на подачу инвентарей помещикам, имевшим до 200 душ, три месяца — владевшим от 200 до 500 душ, четыре месяца — тем, кто имел 500-1000 душ [7]. Это произвело некоторый эффект. Например, если до середины декабря 1844 г. в Витебский инвентарный комитет поступило лишь 34 инвентаря [7], то к 1 марта 1845 г. — уже 403, из которых рассмотрели лишь 17, утвердили 3, а 13 возвратили владельцам на доработку [8]. Несколько лучше обстояли дела в Могилёв-

ской губернии. Если на 13 декабря 1844 г. в местный инвентарный комитет поступило 120 инвентарей [7], то на 1 марта 1845 г. их числилось 601, из которых было рассмотрено 102 инвентаря, предоставлено на утверждение 77 [9]. К сентябрю 1845 г. в Витебский инвентарный комитет представили 894 составленных инвентаря, а в Могилёвский — 835 [10]. Но практически все они не соответствовали требованиям правительства и были возвращены для исправления. На заседании Комитета западных губерний 28 мая 1846 г. после двухлетней практики составления инвентарей были представлены отчёты генерал-губернаторов по поводу введения и утверждения инвентарных правил во вверенных им губерниях. Так, по донесению киевского генерал-губернатора Д.Г. Бибикова на территории Правобережной Украины числились рассмотренными более 6400 инвентарей, в Виленском генерал-губернаторстве Ф.Я. Мирковича — 4110. Поступившие же в Витебский инвентарный комитет 150 инвентарных описей и в Могилёвский — 50 инвентарей подлежали возвращению и исправлению [26]. К январю 1847 г. инвентарные комитеты Виленской и Ковенской губерний из 5781 ожидаемого инвентаря утвердили 4390. По Минской губернии на февраль 1847 г. было утверждено инвентарным комитетом к исполнению 2257 инвентарных описей имений [3].

На наш взгляд, можно выделить две главные причины толь затяжного процесса инвентаризации. Первая причина заключалась в технической стороне дела. Комитеты для рассмотрения и составления инвентарей помещичьих имений собирали статистические данные, неоднократно пересоставляли и пересматривали огромное число инвентарей. Всё это сказалось на темпах реформы. Более того, помещики Витебской и Могилёвской губерний при определении крестьянских повинностей, которые зависели, как говорилось ранее, от количества и качества земли, не имели вообще никакого понятия о правилах составления инвентарей, поскольку во многих имениях не было проведено ранее ни специального, ни генерального межевания [15].

значительно увеличилось. К 1939 г. в Беларуси действовали уже 8143 оборонных кружков [9]. Проводились также разовые массовые мероприятия: походы, военно-тактические игры и т.д., осуществлялся сбор средств в фонд обороны. Например, с января по май 1932 г. в Беларуси был проведен комплекс мероприятий, объединенных под общим названием «стрелковый поход», в феврале 1934 г. проведена «Ворошиловская оборонная эстафета». Составной частью этих мероприятий были стрелковые соревнования, сдача нормативов ГТО, проведение военизированных переходов. Для комсомольцев своего рода оценкой участия в оборонно-массовой работе стал проведенный в 1934 г и в 1935 г. военно-технический экзамен. Для сдачи был установлен минимум, в который входила сдача норм ГТО, стрелковая, санитарная подготовка, планерный спорт или прыжки с парашютной вышки. В ходе экзамена в течение 1935 г. 216 тысяч членов ЛКСМБ сдали нормы на значок ГТО первой ступени и 420 человек – второй ступени [7, с. 30]. Со второй половины 1939 г. определился особый период в развитии оборонно-массовой работы, связанный с началом 1 сентября 1939 г. Второй мировой войны и советско-финляндской войной 1939-1940 гг. События начального этапа Второй мировой войны показали, что военные действия приблизились непосредственно к границам СССР. Это потребовало усиления внимания руководства страны и всех руководящих структур, как властей, так и общественных организаций к проблемам военно-патриотического воспитания населения. Неудачи Красной Армии во время советско-финляндской войны вскрыли существенные недостатки в боевой подготовке красноармейцев. В итоге были изменены подходы к содержанию оборонно-массовой работы, обучение военным специальностям было приближено к условиям, близким к военной обстановке. Вместо оборонных кружков, количество занимавшихся в которых было чаще всего произвольным, внутри организаций Осоавиахима стали создаваться учебные группы, команды, отряды, аналогичные воинским подразделениям: отделениям, взводам, ротам, получившие название учебно-строевых подразделений.

В 1940 – первой половине 1941 гг. больше внимания стало уделяться специализированным формам обучения. Наряду с увеличением набора слушателей в учебные центры изменилось и содержание обучения. Были пересмотрены программы, упор был сделан на

отработку практических навыков действий в условиях, приближенных к боевой обстановке. Со второй половины 1940-го года аэроклубы республики стали работать по ускоренным программам, планы набора курсантов были увеличены в два раза [10, л. 106].

Как и в предшествующий период, в 1939-1941 гг. продолжалась практика проведения массовых переходов, военно-тактических игр, правда, в меньшей степени. На протяжении 1939 г., например, в Могилевской области было проведено 512 военизированных походов и тактических учений [11, л. 751]. В массовом лыжном кроссе, проведенном в феврале 1941 г., приняли участие около 420 тысяч юношей и девушек Беларуси, в том числе 70% всего состава ЛКСМБ.

Вместе с тем, больший упор стал делаться на более углубленное и систематическое изучение отдельных военных специальностей. Количество обученных пулеметчиков в 1939–1941 гг. увеличилось по сравнению с аналогичным предыдущим периодом в 69 разов, за два года их было подготовлено 6350. За 1939-1940 гг. медицинских сестер было подготовлено почти в два раза больше по сравнению с 5 предыдущими годами [13]. За это время нормы на значки «Ворошиловский стрелок», ГСО, ГТО, ПВХО 1 степени выполнили 720 824 человека, 2-й степени – 32 663 человек [14, с. 40].

Таким образом, можно сделать вывод, что в предвоенные десятилетия в Беларуси, как и в целом в СССР, уделялось немалое внимание оборонно-массовой работе. В этот процесс были включены и общественные организации. Была создана система начального военного обучения населения, которая постоянно развивалась, совершенствовалась и в целом была достаточно эффективной, хотя массового военного всеобуча, как планировалось, достичь не удалось, прежде всего, по причине недоработок, порой формализма, слабой исполнительной дисциплины на местах.

**Использованные источники и литература**

1. Матэрыялы да справаздачы Цэнтральнага Камітэта XIII з’езду КП(б)Б. – Мн.: Выданне ЦК КП(б)Б, 1929. – 137 с.

2. Отчеты о деятельности Центрального Совета Осоавиахима // Национал. архив Респ. Беларусь (НАРБ). – Фонд 263. – Оп. 4. – Д. 8.

3. Циркуляры ЦС Осоавиахима БССР. Материалы о школе снайперов. Отчет о работе 4-й передвижной школы ЦС Осоавиахима СССР в Бобруйске // НАРБ – Фонд 263. – Оп. 4. – Д. 12.

4. Протоколы, отчеты, другие документы добровольных обществ. Отчет о деятельности Осоавиахима БССР за июнь-январь 1927/1928 гг. // Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Фонд 4п – Оп. 1. – Д. 3538.

5. Отчеты о деятельности Центрального Совета Осоавиахима // НАРБ. – Фонд 263. – Оп. 4. – Д. 8.

6. Матэрыялы II Пленума Цэнтральнага Савета Тсаавіяхіма БССР. Менск: Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1932. – 38 с.

7. Аўгустайціс А.В. Пад сцягам Леніна-Сталіна – да новых перамог. Справаздачны даклад ЦК 13 сакавіка 1936 г. – Мн.: Выдавецтва ЦК КП(б)Б. – 33 с.; Сталинская молодежь – 1940. – 3 дек.

8. Осоавиахим – ДОСААФ республики: этапы славного пути. Минск, 2011. – 216 с.

9. Советская Белоруссия – 1939 – 4 декабря.

10. Материалы по военно-оборонной работе // НАРБ. – Фонд 4п. – Оп. 1. – Д. 14353.

11. Протоколы, стенограммы съездов, пленумов, заседаний бюро и секретариата ЦК ЛКСМ Белоруссии // Росс. государств. архив социально-политической истории (РГАСПИ) – Фонд 1. – Оп. 10. – Д. 400.

12. Вынікі правядзення першага ўсесаюзнага камсамольскага кроса // Чырвоная змена, 1941. – 9 сакавіка. – С. 1.

13. Ключынскі С.В. Гатовы стаць на абарону Радзімы / С.В. Ключынскі // Звязда. – 1940. – 25 жніўня. – С. 2.

14. Комсомол Беларуси. – Мн.: «Беларусь», 1968. – 140 с.

## РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І КНІГАДРУКАВАННЯ Ў ПАЧАТКУ ХХ СТ. (1900–1914 ГГ.)

Шчаўлінскі М.Б.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Беларуская літаратура і кнігадрукаванне, як і ўвогулле культура, у пачатку ХХ ст. развівалася ў цеснай сувязі з нацыянальным рухам, працэсамі культурнага наступу больш магутных суседзей: з усходу – Расіі, з захаду – Польшчы. Царызм у той час не дазваляў на Беларусі ніякіх нацыянальных формаў грамадскага развіцця, таксама ім падаўлялася праява культурна-нацыянальнага адраджэння беларусаў. Вось як аб становішчы ў беларускіх

губернях у гэты час гаворыць вядомы гісторык М.В. Доўнар-Запольскі: "Цяжкая, прыгнятаючая рука царскага ўраду не дазваляла тут ствараць навуковыя цэнтры, разганяла інтэлігентных работнікаў, зганяла сюды русіфікатараў, цікавілася краем толькі з паліцэйскага пункту гледжання, таму нават нашыя губернскія цэнтры ў навуковых і грамадскіх адносінах далека адставалі ад губернскіх цэнтраў Украіны ці Вялікарасіі" [1, с. 31].

Найбольш важным накірункам русіфікатарскай палітыкі была забарона беларускай мовы і распаўсюджванне рускай. Напрыклад, у часопісе Камітэта Міністраў, з нагоды выканання Імператарскага указу ў адносінах да заходніх губерняў падкрэслівалася: "Расійскай мове, як дзяржаўнай, павінна быць, па перакананню Камітэта, і далей па-ранейшаму забяспечана пануючае становішча. Неабходнасць гэтага выцякае з факта прыналежнасці края да Расійскай дзяржавы і ўсведамлення, што заходнія губерні, якія здаўна ўваходзілі ў яе склад, маюць у значнай сваей частцы спрадвечна рускае насельніцтва [2, л. 586]. У якасці навуковага абгрунтавання сваёй русіфікатарскай палітыкі царскі ўрад выкарыстоўваў ідэалогію "заходнерусізма", якая адмаўляла існаванне беларускай нацыі і беларускай мовы. Гэта ідэалогія з'яўлялася адным з накірункаў грамадскай думкі ў заходніх губернях на прцягу XIX – XX стст. Згодна з яе канцэпцыяй "Беларусь не з'яўляецца краінай з асобнай нацыянальнай культурай і не мае дзеля гэтага права на самастойнае культурнае і палітычнае развіццё, але што яна з'яўляецца культурнай і дзяржаўнай часткай Расіі і таму павінна разглядвацца як адзін з яе састаўных элементаў" [3, с. 7].

Найбольш буйным арганізацыйным стварэннем гэтай ідэалагічнай плыні з'яўлялася "Западнорусское общество", якое было заснавана 29 студзеня 1911 г. у Пецярбургу. Статут і праграма дадзенага таварыства ставілі сваей мэтай "ўзмацненне расійскай культуры і развіццё духоўных і матэрыяльных сіл расійскай народнасці ў Заходнім краі, вывучэнне сучаснага становішча і мінулага". Заўзятымі прыхільнікамі гэтай ідэалогіі таксама з'ўляліся праманархічныя чорнасоценна-акцябрысцкія партыі ("Союз русского народа", "Всероссийский национальный союз", "Русское окраинное общество", "Совет объединенного дворянства" і інш.).

У такім жа накірунку, толькі з польскай арыентацыяй, супраць беларускага нацыянальнага адраджэння змагалася польская

палітычная эліта. Польскі ўплыў асабліва моцна адчуваўся ў галіне культуры. Фактычна многія пласты польскага грамадства (ідэйныя іхнія натхняльнікі Людвіг Гурскі і Генрых Сянкевіч) актыўна прапагандавалі ідэі пра "гістарычнае права Польшчы на Беларусь", пра "вялікую культурную місію палякаў на Усходзе" і г.д. [4, с. 19].

Такія ідэі таксама прпагандавалі "працоўныя хрысціянскія саюзы" (клерыкальнага напрамку) [5, л. 25], "Польская партыя сацыялістаў"(ППС), якая здолела разгарнуць вельмі актыўную работу сярод польскага насельніцтва Беларусі і Літвы. Лідэры ППС неаднаразова адзначалі ў сваіх прамовах, што Літва і Беларусь павінны ўвайсці ў склад незалежнай дэмакратычнай польскай рэспублікі. Так, С. Мендэльсон, актыўны дзеяч ППС, на старонках "Pszedswita" заўважаў, што "Польшча ў этнічных граніцах – гэта проста абсурднае паняцце" [6, с. 56].

Найбольш рэакцыйныя газеты польскага друку ("Slowo", "Kurjer Warszawzki", "Prawda", "Gazeta Codzenna"), у публікацыях якіх адчувалася асаблівая нянавісць да беларускага народа і яго культуры, выступалі адзіным фронтам супраць беларускай літаратуры і беларускай мовы. Выконваючы планы аб аднаўленні Польшчы з уключэннем беларускіх зямель, яны імкнуліся даказаць, што нібыта няма ні Беларусі, ні беларускага народа, ні беларускай мовы, ні, тым больш, беларускай літаратуры. Напрыклад, польскі пісьменнік З. Пяткевіч у артыкуле пра купалаўскую "Адвечную песню" сцвярджаў: "Беларускі народ ніколі не меў і не мае сваёй літаратуры. Стварыла яе польская інтэлігенцыя. Створана яна штучным чынам, у значнай меры не адлюстроўвае ні душы, ні яго звычаяў, традыцый, вераванняў, ні нават складу яго мовы" [7, с. 2].

Аднак, нягледзячы на русіфікатарскую палітыку царскіх улад на Беларусі, экспансіяніcцкую дзейнасць на беларускіх землях розных польскіх памешчыцка-клерыкальных арганізацый, беларуская інтэлігенцыя працягвала барацьбу за нацыянальна-культурнае адраджэнне, якая ва ўмовах адсутнасці ў беларусаў сваёй дзяржаўнасці, самастойных формаў палітычнага і эканамічнага жыцця з'яўлялася найбольш важным аб'ядноўваючым фактарам, садзейнічала захаванню этнічнай самабытнасці беларускага народа, вяла да абуджэння яго палітычнай самасвядомасці.

Значную ролю ў развіцці беларускга нацыянальнага руху ў разглядваемы перыяд адыграла газета "Наша ніва", якая

выдавалася штотыднёва на беларускай мове ў Вільні з лістапада 1906 па жнівень 1915 г. Першачарговую і галоўную сваю задачу ў тых умовах “Наша ніва” бачыла у барацьбе за ўсебаковае нацыянальна-культурнае адраджэнне беларускага народа, за прызнанне самога факта яго існавання, за яго раўнапраўнасць з іншымі народамі. Зыходзячы з таго, што асновай усёй нацыянальнай культуры з’яўляецца мова народа, нашаніўскі публіцыст С. Палуян пісаў: “Нам у першую чаргу трэба адрадзіць сваю мову… Толькі адрадзіўшы мову, мы зможам паставіць на цвёрды грунт наш рух” [8, с. 228].

Штогод роля “Нашай нівы” расла і газета паступова “стала галоўнай трыбунай, ідэолагам і арганізатарам беларускага нацыянальнага культурнага руху, усімі сваімі праявамі накіраванага супраць вялікадзяржаўнай палітыкі царызму, рэакцыйнай дзейнасці рускіх чарнасоценна-акцябрысцкіх і польскіх памешчыцка-клерыкальных партый і арганізацый, а таксама царквы і касцёла, якія імкнуліся асіміляваць беларускі народ, далучыўшы праваслаўную частку беларусаў да рускіх, а каталіцкую – да палякоў” [3, с. 17].

Паступова расла і папулярнасць “Нашай нівы”, мацнелі яе сувязі з народам, аб чым сведчаць тыя факты, што тыднёвік меў вялікую колькасць карэспандэнтаў – сялян у самых далёкіх кутках Беларусі. Згодна з заявай рэдакцыі газеты, толькі за першыя тры гады свайго існавання яна змясціла 960 артыкулаў з 489 беларускіх вёсак, надрукавала 246 вершаў 61 паэта, 91 апавяданне 36 розных аўтараў [9, с. 17]. Трэба заўважыць, што агульны грамадска-палітычны і культурны ўздым у пачатку XX ст. абумовіў хуткі рост і развіццё беларускай літаратуры. “Паявіліся паэты, песняры свайго, забытага Богам і людзьмі краю, і долі народнай. Прарокі яны ці не прарокі – аб гэтым скажэ будучыня, але што яны косць з косці свайго народу – аб гэтым і рэчы быць ня можэ” [10, с. 1], - адзначалася ў адным з рэдакцыйных артыкулаў “Нашай нівы”.

Літаратура таго часу была прасякнута пачуццём гонару за свой народ і яго барацьбу за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, ідэяй сцвярджэння чалавечай годнасці мужыка-беларуса. Вялікі ўклад у развіццё беларускай літаратуры ўнеслі Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, К. Каганец, Ц. Гартны, М. Гарэцкі і інш. У іх творах адчуваецца любоў да радзімы, жаданне бачыць свой народ свабодным і шчаслівым.

Летапісам жыцця, працы і барацьбы беларускага народа, квітнеючым садам, у якім сабраны самыя дарагія каштоўнасці мастацкага слова, называюць творчасць Янкі Купалы. У 1905 г. у газеце "Северо-Западный край" быў надрукаваны першы верш паэта "Мужык". У 1908 г. у Пецярбургу выходзіць з друку першы паэтычны зборнік Я. Купалы "Жалейка", вершы якога ствараліся на самым грэбні рэвалюцыйных падзей 1905-1907 гг. У вершы "Там" (са зборніка "Жалейка") Я. Купала заклікае беларускі народ "прачнуцца" і змагацца за сваё вызваленне, а ў вершы "Ворагам Беларушчыны" паэт ведзе гаворку аб гістарычным праве беларусаў на сваю незалежнасць, на свабоднае развіццё беларускай мовы. У 1910 г. таксама ў Пецярбургу быў выдадзены другі зборнік паэта – "Гусляр", а ў 1913 г. трэці - "Шляхам жыцця". Акрамя гэтых твораў, Я. Купала ў даваенныя гады напісаў паэму "Курган" (1910), камедыю "Паўлінка" (1912), драму "Раскіданае гняздо" (1913) і інш.

Глыбінныя зрухі ў беларускай літаратуры ў пачатку XX ст. звязаны з імем Я. Коласа. Літаратурную дзейнасць ён пачаў у 1906 г., калі напісаў свой першы верш "Наш родны край". У ім, як і ў пазнейшых творах "Вёска", "Наша сяло", "Ворагам" паэт заклікаў бедны народ не гнуцца перад багатымі, не спадзявацца на іх дапамогу, а самому быць кавалём уласнага шчасця. Паэзія Я. Коласа была поэзіяй тугі і смутку. Невыпадкова свой першы зборнік вершаў паэт назваў "Песні жальбы" (1910). Самабытны талент Я. Коласа знайшоў сваё бліскучае праяўленне і ў прозе. У ранніх апавяданнях пісьменнік адлюстроўвае розныя бытавыя з'явы і падзеі ў беларускай вёсцы, абуджэнне свядомасці працоўнага сялянства, рост яго стыхійнага пратэсту, ставіць вострыя палітычныя і сацыяльныя пытанні (апавяданні "Бунт", "Нёманаў дар", "Малады дубок"). Вяршынай паэтычнага майстэрства песняра з'яўляецца паэма "Новая зямля", над якой паэт пачаў працаваць у 1910 г., а закончыў – у 1923 г. У сваёй аснове паэма аўтабіяграфічная і невыпадкова яе называюць энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства ў дарэвалюцыйны час [11, с. 154].

Значны ўклад у развіццё літаратуры пачатку XX ст. ўнёс малады паэт М. Багдановіч. Як беларускі паэт, перакладчык, крытык і гісторык літаратуры ён зрабіў шмат і назаўсёды застанецца ў нашай культурнай спадчынне, нягледзячы на тое, што пры жыцці паэта выйшоў толькі адзін зборнік вершаў – "Вянок" (1913). Паэт спрыяў

замацаванню ў грамадскай думцы галоўных паняццяу, стасавальных да нацыянальнага развіцця: “Беларусь”, “беларускі народ”, “беларуская нацыя”, “Бацькаўшчына”, “беларуская мова”, “беларуская культура”, “беларуская інтэлігенцыя” [8, с. 227].

Дзякуючы намаганням М. Багдановіча (паэт таксама працаваў у галіне мастацкага перакладу – М. Шчаўлінскі) беларускі чытач мог пазнаёміцца з творамі старажытных рымскіх аўтараў Авідзія і Гарацыя, нямецкіх – Ф. Шылера і Г.Гейне, французскага – П. Верлена, рускіх – А. Пушкіна і А.Майкава і інш. [12, с. 200].

Адной са значных постацей на ніве беларускай літаратуры пачатку XX ст. з’яўляецца М. Гарэцкі. Ужо ў ранніх творах “Наш тэатр” (1913), “Развагі і думкі” (1914) ён зрабіў важкі ўклад у развіццё беларускай і грамадскай думкі: вылучыў праблемы духоўнага сталення нацыі, актывізацыі глыбіннага гісторыка-культурнага патэнцiала беларусаў, росту іх нацыянальнай самасвядомасці, узнаўлення гістарычнай памяці, пераадолення комплексу нацыянальнай прыніжанасці. М. Гарэцкі таксама абгрунтаваў грамадскае прызначэнне беларускай літаратуры, культуры, інтэлігенцыі, сфармуляваў задачу “культурнаадраджэнскіх сіл” [8, с. 225]. Многія творы М. Гарэцкага выдадзены на рускай, украінскай, літоўскай, латышскай, польскай і нямецкай мовах. Сапраўднымі сцяганосцамі беларускай літаратуры гэтага часу, акрамя вышэй указаных, з’яўляліся А. Пашкевіч (Цётка), К. Буйло, Я. Журба, А. Гарун, А. Гурло і іншыя.

Прыкметныя зрухі ў разглядваемы перыяд адбыліся і ў развіцці беларускага кнігадрукавання. У 1905 г. царскія ўлады пасля працяглага часу скасавалі забарону на беларускамоўныя публікацыі. 5 мая 1906 г. было ўтворана выдавецкае таварыства “Загляне сонца і ў наша ваконца” [13, с. 131]. Ініцыятарам заснавання суполкі быў Б. Эпімах-Шыпіла. У склад суполкі таксама ўвайшлі: І. Вінцук, У. Калашэўскі, У. Сталыгва, Ю. Іваноўскі і іншыя. Паводле ўмовы, якая была зацверджана 13 мая 1906 г., таварыства ўстанаўлялася для таго каб ”друкаваць і шырыць памеж людзёў ксёнжкі беларускія і ўсё, што датыча Беларусі” [14, л. 1]. Нягледзячы на цэнзурныя перашкоды і цяжкае становішча, суполка за няпоўныя восем год існавання выпусціла цэлую бібліятэчку беларускіх кніг – каля 40 назваў агульным тыражом звыш 100 тысяч экзэмпляраў.

Актыўна ў той жа час працавала выдавецтва “Нашай нівы” (1907-1913) [18, с. 211]. Пачынаючы з 1910 г., “Наша ніва” выдавала вельмі папулярны “Беларускі каляндар”, тыраж якога дасягаў 20 000 экземпляраў. У календары быў раздзел “З роднай нівы”, дзе друкаваліся мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў; складальнікі таксама шырока выкарыстоўвалі народныя прыкметы, беларускія жарты, прыпеўкі. Двойчы на мясцовых сельскагаспадарчых выстаўках “Беларускі каляндар” атрымаў срэбны медаль, высока ацэньвалі яго рускі, украінскі і польскі друк. Напрыклад, прафесар А. Пагодзін пісаў: “Нашым выдаўцам каляндароў для народа варта было б звярнуць увагу на штогоднія каляндары, якія выпускае “Наша ніва”. Гэтыя каляндары праводзяць сапраўдную культурную работу” [13, с. 144]. 15 снежня 1908 г. у Вільні пачало сваю дзейнасць беларускае выдавецкае таварыства “Наша хата”. У склад новай віленскай суполкі ўвайшлі В. Бонч-Асмалоўскі, А. Уласаў, Б. Даніловіч, І. Луцкевіч, І. Манькоўскі і К. Цэтэрман. Знаходзячыся ў Вільні, “Наша хата” выдала 6 кніг агульным тыражом 15 тысяч экземпляраў.

Значную ролю ў развіцці беларускага кнігадрукавання адыграла заснаванае ў Вільні 1 ліпеня 1913 г. “Беларускае выдавецкае таварыства”. Яго заснавальнікамі былі Б. Даніловіч, І. Луцкевіч і К. Шпакоўскі. Ва ўмове было адзначана, што новае таварыства “мае мэтаю выданне і распаўсюджванне кніг, брашур, плакатаў і ўсялякіх выданняў (перыядычных і іншых) на беларускай мове, а таксама прац, якія маюць адносіны да Беларусі, на іншых мовах” [15, л. 49-50]. Толькі за 1914 г. таварыства выпусціла ў свет 13 кніг тыражом 42 тысячы экземпляраў. Такой вялікай колькасці беларускіх кніг, як па назвах, так і па тыражы тады не выдавала за год ні адно выдавецтва [13, с. 147]. Акрамя гэтых выдавецтваў, у 1908-1914 гг. дзейнічалі: “Грамада”, “Беларус”, “А. Грыневіч”, “Палачанін” і інш. Усяго за адзначаны перыяд беларускія выдавецтва выдалі 77 кніжак агульным тыражом 226 000 асобнікаў [16, с. 432].

Такім чынам, развіццё культуры Беларусі ў пачатку XX ст. дасягнула значных поспехаў. Нягледзячы на розныя перашкоды як з боку афіцыйных царскіх улад, так і з боку польска-клерыкальных колаў, беларуская дэмакратычная інтэлігенцыя працягвала барацьбу за нацыыянальна-культурнае адраджэнне, якая ва ўмовах адсутнасці ў беларусаў сваёй дзяржаўнасці, самастойных формаў палітычнага і эканамічнага жыцця з’яўлялася найбольш важным аб’ядноўваючым

фактарам, садзейнічала захаванню этнічнай самабытнасці беларускага народа. Асабліва значную ролю ў справе нацыянальнага адраджэння адыграла літаратура. Значна актывізавалася ў той час кнігадрукаванне.

**Выкарыстаныя крыніцы і літаратура**


1. Цуба, М.В. Беларускі нацыянальны рух у перыяд паміж дзвюма дэмакратычнымі рэвалюцыямі (1907 – люты 1917 гг) / М.В. Цуба. – Брэст: “Выд-ва С. Лаўрова”, 2003. – 196 с.
2. НАРБ. - Фонд 295. – Воп. 1. - Спр. – 7509.
3. Цьвікевіч, А. “Западно-руссизм”. Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў Х1Х і пачатку ХХ в. / А. Цьвікевіч. – Мінск: “Навука і тэхніка”. 1993. – 352 с.
4. Сташкевіч, М. Перадумовы і працэс стварэння палітычных партый на Беларусі (канец ХІХ ст. – люты 1917 г. / М. Сташкевіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1999. - № 3. – С. 18-23.
5. НАРБ. – Фонд 2649. – Воп. 1. - Спр. 51.
6. Літвінёнак, Р. С. Польскія партыі сацыялістычнай арыентацыі ў Беларусі і Літве (90-я гады ХІХ – пачатак ХХст.) / Р.С. Літвінёнак // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – 1998. - №4. – С. 54-61.
7. Prawda. Warszawa. – 1910. - № 39 – S.2.
8. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі / С.А. Парашкоў. – Мінск: “Беларуская навука”, 2003. – 444 с.
9. Турук, Ф. Белорусское движение : Очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Турук. – Москва: Типография “Под/отдела Инвалидов”, 1921. – 143 с.
10. Чаму плачэ песьня наша? // Наша ніва. – 1913. – 26 ліпеня.
11. Старычонак, В.Дз. Беларуская літаратура / В.Дз. Старычонак. – Мінск: “Вышэйшая школа”, 2001. – 350 с.
12. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск: «Современная школа», 2008. – 512 с.
13. Александровіч, С.Х. Пуцявіны роднага слова / С.Х. Александровіч – Мінск: “Выд-ва БДУ”, 1971. – 248 с.
14. Беларускі дзяржаўны музей літаратуры і мастацтва (Далей - БДМЛМ). Фонд 3. - Воп. 1. - Спр. 93.
15. БДАМЛМ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 99.
16. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк, У.Ф. Ісаенка, Г.В. Штыхаў і інш. – Мінск: “Беларусь”, 1994. – Т. 1. – 527 с.

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ ЎНУТРЫСЯМЕЙНАЯ АБРАДАВАЯ САЦЫЯЛІЗАЦЫЯ ДЗЯЦЕЙ У БЕЛАРУСКІХ СЯЛЯН У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ ХІХ – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ ХХ СТ.

Якубінская А. Дз.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Сацыялізацыя дзяцей у беларускіх сялян адбывалася ў межах сям'і праз ўдзел дзяцей у сямейнай абраднасці. Традыцыйная сямейная абраднасць беларусаў складалася з радзінных, пераходных, вясельных і пахавальных абрадаў.

На першым годзе жыцця дзіцяці спосабы і сродкі забеспячэння здароўя дзяцей шчыльна перапляталася з радзіннымі абрадамі, сярод якіх важнейшая роля ў сацыялізацыі дзіцяці надавалася абрадам пасляродавага цыкла. Радзінныя абрады ўяўлялі сабой комплекс адпаведных рытуальных дзеянняў, якім спадарожнічалі фальклорныя формы. Наогул, рытуал выконваў функцыю сацыялізацыі індывіда, якая мела дысцыплінуючы, падрыхтоўчы характар [4, с. 31]. Рытуалізацыя неабходных пасляродавых гігіенічных дзеянняў садзейнічала таму, што дзіця з моманту нараджэння пачынала ўспрымаць этнаспецыфіку традыцыйнай культуры [10, с. 52]. Таму мэтазгодна разглядаць абрады пасляродавага цыкла як першы этап сацыялізацыі. Немаўля павінна было прайсці шэраг рытуалаў, асноўная мэта якіх - "ператварыць" яго ў чалавека [4, с. 41]. Сістэма абрадаў пасляродавага цыкла з удзелам дзяцей складалася з такіх абрадаў, як "радзіны", "адведзіны", "хрэсьбіны", "мураванкі", "пастрыжыны". Усе іх дзеянні былі накіраваны не толькі на прыстасаванне дзіцяці да здаровага ладу жыцця і стварэнне неабходных умоў для гэтага, але і на ўключэнне дзіцяці ў культурнае асяроддзе сям'і і сялянскай грамады.

Увогуле, абрады пасляродавага цыклу можна назваць шляхам дзіцяці да "ачалавечвання". У другой палове ХІХ – першай палове ХХ стагоддзяў у сялянскім асяроддзі перавага аддавалася нараджэнню сыноў. Гэта было звязана з сацыяльна-эканамічнымі прычынамі. Так, атрыманне сынам ў спадчыну бацькоўскай зямлі і гаспадаркі садзейнічала росту дабрабыту ўсёй сям'і. І наадварот, дачка звычайна пакідала бацькоўскую сям'ю і пераходзіла жыць да мужа, пры гэтым забіраючы з сабой пэўную долю. Аб гэтым

сведчыць і той факт, што, напрыклад, у Магілёўскай губерні дзіця мужчынскага полу да хрышчэння называлі "багданькай" [1, с. 111]. Напэўна, назва ўтварылася ад выразу: "Бог даў" і падкрэслівала, паводле веры сялян, надзвычайную прыхільнасць Бога да бацькоў, у якіх нараджаўся сын. У Віцебскай губерні дзяўчынку называлі "чаропкай" [2, с. 5]. На Віцебшчыне зафіксавана адпаведная прымаўка: "мужчынка родзіцца на камешку, а дзяўчынка на чаропцы" [14, с. 2].

Першым этапам на шляху да "ачалавечвання" можна лічыць абрад радзін, які пачынаўся з абразання пупавіны. Пупавіну хлопчыка абразалі на дубовай калодзе, каб ён быў моцным, на тапарышчы, каб добра сек дровы, на кнізе, каб быў граматным, а пупавіну дзяўчынкі – на альховай калодзе, праніку, верацяне, каб яна была "ахвоча", як адзначае М.Я. Нікіфароўскі, да жаночых відаў работы [13, с. 13]. Сямейная традыцыя звязвала пупавіну і з інтэлектам дзіцяці: у пяці-шасцігадовым узросце ў некаторых мясцовасцях Беларусі дзецям прапаноўвалі развязаць пупочны вузел ва ўзросце шасці – васьмі год, што сімвалізавала развязванне розуму [12, с. 46]. Рытуал абразання пупавіны акрэсліваў сацыяльную накіраванасць асобы дзіцяці, а таксама маркіраваў пераход да новага перыяду дзяцінства і адзначаў з'яўленне розуму ў "блазнаў" [17, с. 74].

Наступным важным этапам лічылася ачышчальная гігіенічная працэдура – абмыванне дзіцяці. Як усялякае першае дзеянне, першае купанне, на думку беларусаў, аказвала вялікі ўплыў на лёс і долю дзіцяці. Т.І. Кухаронак адзначае агульнабеларускі характар звычая класці ў ваду хлеб або зерне, якія з'яўляліся сімваламі сям'і і дабрабыту [11, с. 34]. Ваду пасля першага купання вылівалі ў хляве, каб вяліся свінні. Ёсць сведчанні, што ў некаторых мясцовасцях ваду вылівалі на вугал хаты, пад печ ці на ганак. Магчыма, выліванне вады пад печ сведчыць аб сімвалічным развітанні дзіцяці з "тым светам" [17, с. 75]. Раўнянне і праўленне цела мела шырокую распаўсюджанасць ва ўсходнеславянскіх народаў і адбывалася наступным чынам: размыўшы немаўля цёплай вадой, бабка клала яго на спінку і сцягвала ўперад накрыж пальчыкі ног да лакцей, потым паварочвала і сцягвала таксама пальчыкі рук з ножкамі, потым клала яго на далонь сярэдзінай цела, каб галава, ручкі і ножкі звісалі і трасла некалькі разоў [15, с. 142]. Галаву павітуха сціскавала

ў двух супрацьлеглых накірунках: з боку макушкі і падбародка і з боку ілба і патыліцы, абціскала нос дзіцяці, каб ён быў прыгожай формы [15, с. 141]. У другой палове XIX – пачатку XX стст. у Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай губернях было распаўсюджана праўленне формы чэрапа немаўляці (ідэальнай лічылася круглая форма) пры дапамозе галаўных павязак, якія накладвала павітуха: хусткай звязваўся альбо лоб з патыліцай, альбо цемя з падбародкам на 2-3 дні да хрэсьбінаў [15, с. 156]. Працэс апранання дзіцяці завяршаў комплекс абраду радзін. Бабка-павітуха загортвала дзіця ў старую матчыну або бацькаву вопратку. Старыя рэчы бацькоў нясуць ідэю пераемнасці і перадачы соцыякультурнага вопыту з пакалення ў пакаленне [12, с. 51]. Выбар бацькоўскай або матчынай кашулі для першага спавівання вызначаў матрыманіяльную арыентацыю дзіцяці [8, с. 119]. Тут магчымы тры варыянты: бацькоўская вопратка выбіраецца незалежна ад полу; для хлопчыкаў выкарыстоўваецца бацькава, а для дзяўчынак матчына кашуля; для дзяцей выкарыстоўваецца вопратка супрацьлеглага полу [8, с. 119-120]. Ва ўсіх трох выпадках прасочваецца імкненне паўплываць на будучы лёс дзіцяці з аднаго боку, а з другога, забяспечыць правільнае наследаванне сацыяльных роляў: для хлопчыка – мужчынскай, для дзяўчынкі – жаночай [17, с. 76].

Існаванне ў беларусаў абраду “адведзін” (“водведак”, “адведак”) – наведванне замужнімі жанчынамі парадзіхі – з’яўлялася своеасаблівым прызнаннем сялянскай грамадой і яе жаночай супольнасцю факту наяўнасці дзіцяці і неабходнасці яго далейшай інтэграцыі ў сялянскае грамадства [12, с. 61].

Наступным важным адаптацыйным крокам было наданне дзіцяці знакавага чалавечага атрыбута - імя, іншымі словамі абазначэнне яго як чалавека. Разам з імем чалавек атрымоўваў набор станоўчых якасцей і сацыяльна-культурны вопыт, накоплены папярэднімі носьбітамі гэтага імя [12, с. 97]. У другой палове XIX – першай палове XX стст. наданне імя адбывалася пад час хрышчэння дзіцяці. Канчатковае далучэнне дзіцяці да свету людзей адбывалася падчас хрэсьбіннага абраду. Хросная маці дарыла дзіцяці важныя атрыбуты свету людзей – крыж, мятлік (рубашачку), пояс. Атрыманне крыжа, апрананне ў “мятлік”, спавіванне, абвязванне “спавівачом” (поясам) крыж-накрыж было не толькі прыкметай канчатковага “ачалавечвання”, яно завяршала працэс уключэння

дзіцяці з уласнымі правамі і абавязкамі ў сацыяльныя адносіны сялянскай грамады, вызначала яго этнічную і соцыяканфесійную прыналежнасць [17, с. 76]. "Мураванкі" ("жмурынкі") – сямейнае свята з нагоды купання немаўляці на трэці дзень пасля хрэсьбінаў і мірапамазання. Акрамя гігіенічнага ачышчэння, працэдура несла вялікі сакральны сэнс, які праяўляўся ў поўных глыбокай пашаны адносінах да таінства мірапамазання і святога міра, які бабка-павітуха змывала з дзіцяці. Абрад замацоўваў прызнанне за нованароджаным права адносіцца да яго як да сапраўднага чалавека, больш таго, абрад як бы сімвалізаваў пачатак хрысціянскай сацыялізацыі [17, с. 76].

Што тычыцца першых "пастрыжын", то трэба адзначыць, што беларусы валасы стрыглі першы раз ва ўзросце каля аднаго году. Абрад пастрыжын "меў на мэце забяспечыць дзіцяці ў будучым яго жыцці багацце, працоўныя навыкі, павагу іншых людзей, любоў да роднага дома" [11, с. 91]. Магчыма, пад уплывам хрысціянства адбылася пэўная трансфармацыя абраду пастрыжын. Бо ў Карэліцкім раёне Гродзенскай вобласці былі зафіксаваны наступныя дадзеныя: валасы пажадана было састрыгаць на царкоўнае свята Грамніцы, запальваць пры гэтым свечку і казаць малітву [2, с. 25]. Састрыжаныя валасы ці спальваліся, ці тапіліся ў вадзе, ці закопваліся ў зямлю, каб, з аднаго боку, чараўнікі не маглі зрабіць дзіцяці шкоду, а, з другога боку, гэта сімвалізавала нараджэнне новага чалавека [9, с. 91]. Гэты абрад указвае на рэшткі старажытных ініцыяцый.

Паколькі сацыялізацыя дзяцей у беларускіх сялян адбывалася ў сям'і, то сямейныя абрады, у межах якіх захаваліся рэшткі пераходных абрадаў, вызначалі працэс сацыялізацыі. Пераходныя абрады (ініцыяцыі) – гэта абрады, якія падкрэсліваюць важнасць моманту змянення статусу асобы і зацвярджаюць яе новае месца ў грамадстве [6, с. 254]. У традыцыйным грамадстве беларусаў змяненне статусу асобы таксама вызначалася такімі ініцыяцыямі на пэўных этапах жыццёвага цыклу. Сацыяльны статус дзяцей фіксаваўся пры дапамозе традыцыйных культурных сродкаў на розных узроўнях.

Важны этап працэсу сацыялізацыі – гэта пераходны перыяд, у які ўступалі дзеці ва ўзросце 6-8 год. У гэтым узросце адбывалася вылучэнне акрэсленых радзіннымі абрадамі палавых роляў

хлопчыкаў і дзяўчынак. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што ў дачыненні да дзяцей ва ўзросце ад двух – трох да шасці – васьмі год назва “блазнота” ўжывалася без вызначэння полу дзіцяці і мела збіральны характар. Вылучэнне другога перыяду дзяцінства звязана з некаторым адасабленнем хлопчыкаў ад дзяўчынак ва ўзросце шасці – васьмі год і з’яўленнем новых назваў мужчынскага і жаночага роду адпаведна [17, с. 77]. Хлопчыка шасці – дзесяці гадоў называлі “блазн”, а дзяўчынку таго ж узросту “блазноўка” або “блазнотка” [5, с. 118]. Такім чынам, палавая дыферэнцыяцыя хлопыкаў і дзяўчынак у першую чаргу фіксавалася ў іх назвах, значыць на тэрміналагічным ўзроўні. У XIX – першай палове XX ст. штаны і спадніцу дзеці ўпершыню апраналі ва ўзросце 5-6 гадоў, што было значнай падзеяй у іх жыцці і таксама адзначала пераход да новай полаўзроставай ступені. Так, М.Я. Нікіфароўскі апісвае абрад апранання першых уласных штаноў хлопчыкам і першай уласнай спадніцы дзяўчынкай [13, с. 47]. Спачатку хлопчыку падсцілаліся старыя бацькавы штаны, а дзяўчынцы старая матчына спадніца і прапаноўвалася іх апрануць. Бацькі пільна сачылі за тым, якую ўпартасць праяўляюць падчас гэтага “складанага” працэсу іх дзеці, каб вызначыць працягласць іх веку. Пасля гэтага дзеці апраналіся ва ўласныя рэчы і, калі вопратка знашвалася, яе спальвалі. Такім чынам, абрад апранання першых уласных штаноў хлопчыкам і першай уласнай спадніцы дзяўчынкай сімвалізаваў замацаванне іх палавых роляў, адбывалася фіксацыя новага сацыяльнага статусу на побытавым ўзроўні.

А.К. Байбурын адзначае, што палавая ідэнтыфікацыя дзіцяці ў шасці – васьмігадовым узросце і змена “малочных” зубоў на карэнныя лічацца ў традыцыйных сялянскіх грамадствах усходніх славян прыкметамі “канчатковага ачалавечвання”, “з’яўлення розуму” і пачаткам далучэння да свету дарослых [3, с. 264]. Цікава, што ў беларусаў нават да цяперашняга часу, захавалася звычка малочныя зубы дзяцей закідваць на печ, звяртаючыся пры гэтым з адмысловым прыгаворам да мышы. Магчыма, такі звычай з’яўляецца рэшткамі старажытнага пераходнага абраду, які адзначаў змену сацыяльнага статусу дзіцяці. З аднаго боку, дзіця сімвалічна “развітвалася” са сваім месцам у жыллёвай прасторы сялянскай хаты – печчу, палком, а з другога – аддавала прадстаўніку “таго свету” хтанічнай жывёле прыкметы свайго

былога становішча – “малочныя зубы” [17, с. 78]. У гэтай сувязі трэба ўзгадаць адзначаны вышэй абрад развязвання пупавіны, які сімвалізаваў “развязванне розуму”. Такім чынам, пры дапамозе абрадавых дзеянняў адбывалася фіксацыя новай полаўзроставай ступені на сацыяльным узроўні.

Далей важным этапам працэсу сацыялізацыі з’яўляўся пераходны да падлеткавага перыяд - узрост дзесяць – дванаццаць гадоў. Рэшткі старажытных ініцыяцый захаваліся ў дачыненні да змены статусу дзяўчынак гэтага ўзросту. Прыкладна ва ўзросце дзесяці – дванаццаці год дзяўчаткі пачыналі насіць у якасці галаўнога ўбору вянок [13, с. 120]. Зафіксавана, што ў гэтым узросце на Віцебшчыне дзяўчынкі праколвалі вушы. Працэдура праколвання вушэй у дзяўчынак адбывалася толькі пры пэўных умовах і абставінах: падчас першых трох дзён тыдня напярэдадні Вялікадня, але не пазней палудня Вялікага чацвера [13, с. 132]. Праколваць вушы без сведкаў павінна была ўдовая родная бабка дзяўчынкі, або іншая жанчына яе гадоў і сацыяльнага статусу. Ранку да яе зажыўлення трэба было прамываць малаком роднай маці ці малаком іншай жанчыны-карміліцы. Завушніцы звычайна мелі форму кола. Кола ў беларусаў сімвалізуе жыццё і жывот цяжарнай жанчыны. Такім чынам, адбывалася фіксацыя пераходу да другой узроставай падгрупы ва ўзросце 10 год на побытавым узроўні. Апрананне вянка, працэс праколвання вушэй і ўвядзення завушніцаў з’яўляўся своеасаблівай адзнакай гатоўнасці дзяўчынкі да дарослага жыцця, да ролі жанчыны-маці. Той факт, што працэдуру праводзіла жанчына сталага веку і пэўнага сацыяльнага статусу, а ранкі прамываліся мацярынскім малаком, магчыма, магло сведчыць аб сімвалічным далучэнні дзяўчынкі да жаночай часткі сялянскага грамадства [17, с. 79].

Лічыцца, што кульмінацыяй абрадаў пераходу, што суправаджалі змену сацыяльнага статусу юнакоў, з’яўлялася традыцыйная вясельная абраднасць. Аднак і роля дзяцей у вясельнай абраднасці беларусаў мела істотнае значэнне, бо ўдзел дзяцей ў вяселлі заўжды быў пажаданы. У. М. Дабравольскі апісвае вясельны абрад “Касу расплятаці” наступным чынам: хлопчык ці дзяўчынка, звычайна родныя брат ці сястра нявесты, павінны былі расплесці яе касу, за што атрымлівалі ў якасці ўзнагароды ад “дружкі” тры капейкі [7, с. 215]. І.В. Казакова

прыводзіць дадзеныя аб абразанні сярпом касы ў нявесты яе малодшым братам [9, с. 91].

Увогуле, удзел дзяцей у вясельных абрадах лічыўся не толькі пажаданым, але і часта неабходным. Гэта было звязана з верай сялян у звышнатуральную "ўласцівасць" дзяцей station ўплываць на святы, звязаныя з пачаткам ці нараджэннем новай сям'і. На думку даследчыцы В.Н. Харузінай, гэта з'яўляецца праявай "сімпатычнай" магіі, калі падобнае выклікае падобнае [16, с. 47]. Што тычыцца саміх дзяцей, то ў вясельным абрадзе яны выступаюць у якасці аб'екта трансмісіі традыцыйных каштоўнасцей сялянскай грамады, асэнсоўваючы значнасць сваёй сацыяльнай ролі, а таксама ўсведамляючы такі важны пастулат, як залежнасць сямейнага шчасця ад наяўнасці дзяцей.

Традыцыйныя духоўныя і маральныя каштоўнасці сялянскай грамады вельмі цікавым спосабам праявіліся ў дачыненні дзяцей да пахавальных звычаяў і абрадаў, якія таксама ў пэўнай ступені маркіравалі змену сацыяльнага статусу чалавека. У канцы XIX ст. У.М. Дабравольскім у некаторых вёсках Смаленшчыны, дзе ў той час пражывалі этнічныя беларусы, была зафіксавана гульня, якую даследчык звязваў з пахавальнымі звычаямі [7, с. 307]. Падчас вясенняй паводкі дзеці кідаюць у ваду невялікія трэсачкі, каб тыя плылі і падскоквалі, прагаворваючы: "Пракаўзну бацьку! Пракаўзну матку! Пракаўзну бабу!" Існуе таксама паданне, што ў вялізным кургане ля вёскі Бароўскае Смаленскай губерні пахаваны змей-багатыр, якога доўга не хавалі пасля смерці [7, с. 312]. Пахавалі пачвару маленькія дзеці, якія прывезлі на ягоную магілу зямлю на курах і пеўніках. Прыведзеныя факты, магчыма, указваюць на сінкрэтызм свядомасці беларусаў, які праявіўся ў іх поглядзе на сацыяльную ролю дзяцей, якім прыпісвалася надзвычайная ўласцівасць мець сувязь з "тым" светам.

Такім чынам, сацыяльны сэнс абрадаў пасляродавага цыклу – інтэграцыя дзіцяці ў культурнае асяроддзе людзей, прызнанне яго сям'ёй, трансмісія традыцыйных культурных і хрысціянскіх каштоўнасцей (імкненне надаць целу гарманічную пабудову, прызвычайванне да здаровага ладу жыцця, арыентацыя на любоў да працы), наданне яму чалавечых атрыбутаў – вопраткі, імя. Удзел дзяцей у традыцыйнай вясельнай і пахавальнай абраднасці беларусаў сведчыць аб той надзвычайнай ролі, якая адводзілася ім у

сялянскай грамадзе: з аднаго боку, гэта вера ў звышнатуральную ўласцівасць дзяцей станоўча ўплываць на падзеі, звязаныя са сваткаваннем пачатку, а з другога боку, "нетрывалае становішча" дзяцей на зямлі.

**Выкарыстаныя крыніцы і літаратура**

1. Аникиевич, К.Т. Сенненский уезд Могилёвской губернии / К.Т. Аникиевич / Могилёв. губ. стат. ком. – Могилёв: губ. тип, 1907. – 150 с.

2. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАНБ. – Фонд 6. – Воп. 14. – С. 137.

3. Байбурин, А.К. Обрядовые формы половой идентификации детей / А.К. Байбурин // Этнические стереотипы мужского и женского поведения: сб. ст. / отв. ред. А.К. Байбурин [и др.]. – СПб.: Наука, 1991. – 318 с. – С. 257–265.

4. Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре: структурно-семантический анализ восточно-славянских обрядов / А.К. Байбурин. – СПб.: Наука, 1993. – 237 с.

5. Беларусы: у 8 т. – Мінск : Беларус. навука, 1995 – 2008. / Т. 5 / В.К. Бандарчык [і інш.]; рэдкал.: В.К. Бандарчык. – 2001. – 375 с.

6. Говард, М. Сучасная культурная антрапалогія / М. Говард; пад рэд. П. Церашковіча. – Мінск: Тэхналогія, 1995. – 478 с.

7. Добровольский, В.Н. Смоленский этнографический сборник / В.Н. Добровольский // Записки Императорского Русского Географического Общества по Отделению Этнографии.– 1893. – Т. 23. – Вып. 1. – Ч. 2. – 443 с.

8. Кабакова, Г.И. Отец и повитуха в родильной обрядности Полесья / Г.И. Кабакова // Родины, дети, повитухи в традициях народной культуры / Рос. гос. гуманитар. ун-т, Ин-т высш. гуманитар. исслед.; отв. ред. С.Ю. Неклюдов. – М., 2001. – 318 с. – С. 107–129.

9. Казакова, І.В. Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І.В. Казакова. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 151 с.

10. Калачова, І.І. Народныя традыцыі і звычаі выхавання: Этнапедагагічная спадчына народаў Беларусі / І.І. Калачова. – Мінск: НІА, 1999. – 179 с.

11. Кухаронак, Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX – XX ст. / Т.І. Кухаронак. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 124 с.

12. Маховская, И.С. Белорусская традиционная родинная обрядность в восточноевропейском контексте (кон. XIX – нач. XXв.): дис. … канд. ист. наук: 07.00.07. – Мінск, 1999. – 116 л.

13. Никифоровский, Н.Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская тип., 1895. – 154 с.

14. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные предания о лицах и местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская тип., 1897. – 171 с.

15. Покровский, Е.А. Физическое воспитание детей у разных народов преимущественно России / Е.А. Покровский // Известия императорского общества любителей естествознания, антропологии и этнографии. – 1884. – Т. 45. – Вып. 2. – 232 с.

16. Харузина, В.Н. Об участии детей в религиозно-обрядовой жизни / В.Н. Харузина // Этнографическое обозрение. – 1911. – № 1–2. – С. 1–78.

17. Якубінская, А.Дз. Традыцыйная сацыялізацыя дзяцей беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX ст. / А. Дз. Якубінская. – Мінск: РІВШ, 2010. – 118 с.

## СОДЕРЖАНИЕ

*Багдановіч А.* Цэнзура як сродак ажыцяўлення палітыкі расійскага самадзяржаўя…………………..……………………………..3
*Багалейша С.В.* Расійска-літоўскі мірны дагавор 12 ліпеня 1920 г. і адносіны да яго беларускіх палітычных партый і арганізацый…..15
*Бобков В.А.* О геополитических возможностях Беларуси………26
*Божанов В.А.* Государственность Беларуси в 1990-1994 гг........31
*Давидович А.В., Киселёва С.А.* Пролеткульт и Октябрьская революция 1917 г..………………………………….52
*Довнар Л.А.* Прыватныя прамысловыя прадпрыемствы на беларускіх землях у 1921-1923-х гадах……………………….....58
*Карбалевіч Н.М.* Формы і механізмы грамадскай рэгуляцыі маёмасных адносінаў у традыцыйнай беларускай вёсцы ў другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя…..……………...65
*Кедрык Т.В.* Прадметнае поле і метадалогія вуснай гісторыі………………………………………….75
*Лепеш О.В.* Содержание и итоги инвентарной реформы на территории Беларуси в 1840-1850-х гг………………………...85
*Лойко А.И.* Форматы культуры XX века, созданные конвергенцией науки, техники, искусства…………………………….95
*Млечко Е.Н.* Союз германских девушек: шаблонизация личности………………………………………………107
*Мытько В.Г.* Проблемы национально-государственного строительства в Беларуси после Октябрьской революции……..…114
*Семёнова Л.Н.* Об окончании капиталистической системы…..118
*Смехович Н.В.* Белорусская государственность: концепция и формы (опыт теоретико-методологического осмысления проблемы)………………………………………...…...128
*Хромченко Д.Н.* Тенденции, основные направления оборонно-массовой работы в Беларуси в 1920-1940-е гг………...150
*Шчаўлінскі М.Б.* Развіццё беларускай літаратуры і кнігадрукавання ў пачатку XX ст. (1900-1914 гг.)………………...159
*Якубінская А. Дз.* Традыцыйная ўнутрысямейная абрадавая сацыялізацыя дзяцей у беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX стст…………………..167

Научное издание

# СБОРНИК НАУЧНЫХ ТРУДОВ СОТРУДНИКОВ КАФЕДРЫ «ИСТОРИЯ, МИРОВАЯ И ОТЕЧЕСТВЕННАЯ КУЛЬТУРА» БНТУ

Подписано в печать 13.04.2018. Формат 60×84 $^{1}/_{16}$. Бумага офсетная. Ризография.
Усл. печ. л. 10,23. Уч.-изд. л. 8,00. Тираж 60. Заказ 240.

Издатель и полиграфическое исполнение: Белорусский национальный технический университет.
Свидетельство о государственной регистрации издателя, изготовителя, распространителя печатных изданий № 1/173 от 12.02.2014. Пр. Независимости, 65. 220013, г. Минск.